№3 (124) 8 ЛЮТАГА 1999 Г.

НН

НАША НІВА

Газэта заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

HTTP://MEMBERS.XOOM.COM/NASA_NIVA

Тэма нумару

ШТО АБ'ЯДНАЕ НАС?..

Што аб'ядноўвае і што магло б аб'яднаць беларусаў як нацыю? Напрыканцы 1980-х, у прадчуваньні вялікіх пераменаў, гэтае пытаньне ў Беларусі ўпершыню было пастаўленае шырока. «Калі імпэрыя зьнікне, як дым, Дзе будзеш ты і з кім?.. — сьпяваў рок-гурт «Уліс». — Што будзе заўтра тут, карчма ці турма?..» Пасьля тэма нацыянальнага аб'яднаньня неяк аціхла, бо асноўныя аб'яднаўчыя матывы — незалежнасьць, сымболіка, мова — даліся быццам самі сабою, без напружаньня. Загаварылі пра расчараваньне ў гэткіх «незаслужаных» нацыянальных ідэалах. Нарэшце, уся ўвага сканцэнтравалася на харызматычнай постаці першага прэзыдэнта. Аб'яднаўчымі матывамі сталі электаральная любоў, перамяшаная з боязю, і інтэлігенцкая нянавісьць. І вось сёньня прадчуваньне пераменаў зноў залунала ў паветры. Што аб'ядноўвае і што можа аб'яднаць нас як нацыю? Пра гэта гавораць на Кангрэсе Дэмакратычных Сілаў, з гэтым зьвязваюць спадзевы на 99-ы год, гэтай тэме прысьвечаны і сёньняшні нумар «НН».

Існуе вялікае мноства мэтадаў вызначэньня таго, што нас аб'ядноўвае. Ёсьць аб'ектыўныя паказчыкі — супольнасьць тэрыторыі, расы і неўсьвядомленага гістарычнага лёсу. Але сёньня нас цікавяць якраз суб'ектыўныя, усьвядомленыя матывы.

Незалежнасьць краіны, пра якую гавораць найчасьцей, сапраўды злучае цяперашнюю апазыцыю — беларусаў і рускамоўных, правых і левых. Але сам сабою такі аб'яднаўчы матыў пасыўны, бо незалежнасьць — гэта сродак. На пэўным этапе яна робіцца мэтай, але як толькі мы пачынаем зазіраць далей — «за незалежнасьць» — там, у суплёце традыцыйных, сьвядомасных, этычных і эстэтычных уяўленьняў лучнасьць часта зьнікае. Урэшце мы робімся ахвярамі яшчэ аднаго «жарту гісторыі». За што, як кажуць, бароліся, на тое й напароліся...

Што ж аб'яднае нас?

Усё чалавецтва любіць глядзець на агонь, на бег вады ў рацэ і аблокаў у небе. Такія зьявы заварожваюць усіх. Пасьля прыхільнасьці разгаліноўваюцца, разыходзяцца ў розныя геаграфічныя куткі.

Напрыклад, пачуты далёка ўначы брэх сабак, разьліты ў сьцюдзёным паветры дым з комінаў хат, рахманая густая гамана ў насычаным пахамі страваў і пітва паветры... Ужо згаданы дым будзе пахнуць у розных краінах па-рознаму. Тым болей па-рознаму гучыць і ўспрымаецца бяседная гамана... Свае асабістыя матывы нацыянальнага аб'яднаньня мы шукаем менавіта ў гэтым кірунку — там, дзе спэцыфічна выяўляецца наша нацыянальная прырода.

І тут пазнаньне сябе й свае нацыі найлепей даецца ў параўнаньні. Напрыклад, паспалітых амэрыканцаў яднае супольнае сядзеньне ў кавярні-клюбе, дзе яны пад піва й гаману сочаць у тэлевізары за матчам бэйсбольнай каманды свайго штату... Хто б ты ня быў, але калі ты амэрыканец, ты абавязкова зразумееш і падзеліш пачуцьці гэтых людзей. А вось беларусаў ня лучыць супольнае знаходжаньне ў прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня. Колішняя традыцыя карчмы страчаная незваротна і калі вернецца, дык будзе ўжо зусім новай. Зь іншага боку, беларусаў яднае заўзятарства на стадыёне. Шкада, што апошнім часам міліцыя адбірае ў заўзятараў нацыянальныя сьцягі, бо тут — не палітыка, а штосьці нашмат большае — крэўнасьць...

Працяг на старонцы 8

Рэванш фашыстаў на плошчы Перамогі

Увечары 5 лютага каардынатар праваабарончага руху Хартыя-97 Андрэй Саньнікаў і прэс-сакратар Хартыі Алег Бябенін былі жорстка зьбітыя на плошчы Перамогі ў Менску сябрамі арганізацыі Расейскае Нацыянальнае Адзінства (РНЕ). Саньнікаву паламалі нос і рэбры. Паводле Саньнікава, яны разам зь сябрам аргкамітэту Хартыі Зьмітрам Бандарэнкам вярталіся дахаты з штаб-кватэры сваёй ініцыятывы. У раёне плошчы Перамогі яны зрабілі заўвагу двум маладзёнам, якія раздавалі ўлёткі РНЕ. «Было відаць, што тыя шукаюць нагоду для бойкі», — сказаў Саньнікаў. У адказ на заўвагу ён атрымаў удар у твар, і яго абступілі і пачалі зьбіваць каля 20 маладзёнаў з павязкамі РНЕ. Саньнікаў страціў прытомнасьць. Міліцыя мэтро адмовілася затрымліваць хуліганаў, а патрульная машына міліцыі таксама хуценька зьехала, мабыць, баючыся зьвязвацца. На мінулым тыдні менская моладзь разагнала фашыстаў, якія звычайна зьбіраюцца на плошчы Якуба Коласа. Цяпер яны ўзялі рэванш. Улады ніякіх захадаў супраць фашысцкай арганізацыі дагэтуль не прадпрымалі.

Таццяна Калінoўская

МІХАІЛ ЧЫГІР:

«МОЙ ІДЭАЛ — ФІНЛЯНДЫЯ І ШВЭЙЦАРЫЯ...»

Міхаіл Чыгір — былы прэм'ер-міністар, вяртаецца. Вяртаецца гучна і дэманстратыўна, прапанаваўшы сябе на месца першай асобы ў краіне. Адным крокам Міхаіл Чыгір стаў наперадзе ўсёй беларускай апазыцыі. Ацэнкі гэтага ягонага ўчынку палярныя. У сваім студзеньскім інтэрвію «Белорусской газете» Міхаіл Чыгір сказаў: «Пра якую стабільнасьць разважае Лукашэнка, калі ў маёй вёсцы, у маім родным Капыльскім раёне, у сялянаў парваліся апошнія боты, а на што купіць новыя, яны ня ведаюць...». Нас, у сваю чаргу, зацікавіла, каму кандыдат у прэзыдэнты Беларусі аддае перавагу ў беларускай культуры.

Міхаіл Чыгір: Вядома, нашым клясыкам — Багдановічу, Купалу, Броўку. А перад усім — Якубу Коласу.

«НН»: А каго вы шануеце з сучасных беларускіх літаратараў?

М.Чыгір: Васіля Быкава. Я чытаў ягоныя ранейшыя творы. Вельмі шаную яго як чалавека і паважаю як грамадзяніна. На жаль, ня выпала мне зь ім пазнаёміцца асабіста. Затое знаёмы зь Нілам Гілевічам. Дарэчы, вось зараз чытаю ягоны зборнік вершаў. Вядома, — зь Няклявым, аўтарам шматлікіх песень, якія мне прыемна слухаць.

«НН»: За часамі Лукашэнкі беларуская мова падлягае сьведамай дыскрэдытацыі і дыскрымінацыі. Колькасьць беларускіх школаў, выданьне беларускіх кніг сьцяліся да памераў меншых, чым нават за савецкім часам. Што прапанавалі б вы?

М.Чыгір: Я думаю, што ня можа быць беларускай дзяржавы безь беларускай мовы! Ужо шмат было зроблена дзеля адраджэньня мовы: пашыралася выкладаньне ў школах, перакладаліся дакумэнты. Той Закон аб мове, які быў да Лукашэнкі, быў нармальны. На яго падставе і трэба было рухацца далей. Шмат добрага было зроблена... Але сёньня мы ўсё згубілі. Трэба будзе вяртацца на тыя ранейшыя пазыцыі, вяртаць на сваё месца нашу мову. Для мяне гэта прынцыпова.

Працяг на старонцы 4

Славамір Адамовіч

ПІСЬМЁНЫ З КАМЭРЫ 59

Відаць, я так ніколі і не даведаюся ні пра ейныя сапраўдныя імя і прозьвішча, ні пра тое, паводле якога артыкулу яна была асуджана. Праўда, па дарогах турмы хадзілі чуткі, што свае тры гады Іркапаліцаіха дастала за забойства мужа. Казалі таксама, што «мокрую» справу за яе зрабілі ейныя жахалі-палюбоўнікі, а сама яна праходзіла толькі як заказчыца і арганізатар злачынства. Пасьля таго, як карпусную сматрашчую Галку адправілі ў калёнію, Іркапаліцаіха заступіла на ейнае месца.

Я нават ня ўпэўнены, што менавіта Ірчын голас чуваць было з суседняй камэры, калі прыгожымі пагоднымі днямі мы прынікалі да ваконных кратаў, выклікаючы з жаночых камэраў на палюбоўныя перамовы «сваіх» жанчын.

Маё турэмнае каханьне ў Віцебскім цэнтрале так і не пасьпела разьвіцца: пасьля першай адсідкі ў карцэры мяне з хаты-малалеткі 60 перакінулі ў агульную «дарослую» камэру паўночнага корпусу. Усё, што засталося мне на памяць ад ніколі ня бачанай мною Іркі-Валянціны — гэта сямнаццаць маляваў, сьпісаных чытэльным настаўніцкім почыркам.

Вячаславу

Прывітаньне, Слава! Атрымала ад Вас маляўку і, калі трохі ачомалася ад сну, села пісаць адказ. Ну,

Працяг на старонцы 7

30 студзеня ў Баранавічах адчынілася выстава «Крыжовы Шлях», прысьвечаная камуністычным рэпрэсіям. Сярод фотаздымкаў беларускай эліты, закатаванай камуністычнай сыстэмай — велізарная карта ГУЛАГаў СССР. Выстава працягнецца два тыдні.

Працяг на старонцы 6

ЭЎРОПА БЫЛА ТАК БЛІЗКА

Пры пабудове сацыялістычнага грамадзтва за кошт велізарных і гераічных намаганьняў некалькіх пакаленьняў народаў былой Расейскай імпэрыі стварылася новая ідэнтычнасьць – тоеснасьць савецкага чалавека. Савецкі чалавек – інтэрнацыяналіст, ён інфантыльны, безадказны, прывык, што ўсё ягонае жыцьцё залежыць ад улады і нічога – ад яго асабіста. Сярод савецкіх шмат люмпэнаў: люмпэн-рабочыя, люмпэн-сяляне, люмпэн-інтэлігенты. П'янства як стыль жыцьця паступова выцясьняла інстынкт выжываньня. Сёньня савецкі чалавек адчувае сваю неканкурэнтаздольнасьць і таму баіцца рынкавых зносін. Ён спадзяецца на Бога, цара, генсакратара, начальніка, старшыню калгасу... Большасьць ня можа спадзявацца на сябе, адсюль – я хворы, слабы, інвалід, вэтэран, удзельнік вайны, воін-інтэрнацыяналіст, заслужаны дзеяч і г. д. Дзяржава павінна дапамагчы, заступіцца, прызначыць, і чалавек, атрымаўшы мізэрную пэнсію, дапамогу, пасьведчаньне, грамату, мэдаль, кватэрку, «Запарожац», супакойваецца – ён у параўнаньні зь іншымі дамогся мікраскапічнага ўмацаваньня свайго жыцьцёвага становішча. Чаму вялікая колькасьць людзей не прывыкла спадзявацца на сябе? Таму што іх адвучвалі ад веры ў сябе. Таму што ў дзяржаве існавала і зараз існуе ўсходняя сыстэма каардынатаў, дзе чалавек – істота – зьяўляецца мэханізмам, ад якога нічога не залежыць. Ён выканаўца. За яго вырашае вышэйстаячы халуй фэадала. Ён, халуй фэадала, і забясьпечвае жыцьцяздольнасьць мэханізму. Гэтая сыстэма каардынатаў – прадукт Расейскай фэадальнай імпэрыі. Беларусаў і сёньня прымушаюць далей існаваць ва ўсходняй сыстэме каардынатаў.

Расейскія адносіны, расейская тэхналёгія, школа, войска, вера, літаратура, расейская мова... Усё гэта сыстэма, якая гадуе чалавека агрэсіўнага, няздольнага да спакойнага жыцьця. Яскравы прыклад – расейскі мат, якім так ганарацца ягоныя носьбіты. Мат – гэта характарыстыка суадносінаў паміж людзьмі, іх узровень. Генэрал Лебедзь так у сваёй кніжцы і напісаў: «Армія трымаецца на маце». (Каўказцы, дарэчы, успрымаюць мат як абразу, якая патрабуе помсты.) Расейская літаратура – гэта літаратура аб пакутлівым жыцьці, дзе няма месца шчасьцю. І ўсё, што ёсьць таксама ў Эўропе і ў Амэрыцы, даведзенае да крайнасьці: дзедаўшчына ў войску, мэліярацыя ў вёсцы, Чарнобыль у атамнай энэргетыцы...

Савецкі чалавек прывучаны да гераізму. Гераізм на вайне, гераізм у працы, гераізм у каханьні, гераізм у жыцьці – а шчасьця няма. Чаму? Расейская сыстэма каардынатаў заўсёды мае патрэбу ў героях, гераічных учынках, гераічным жыцьці, бо заўсёды вядзе да шматлікіх памылак, яна прадукуе памылкі і промахі, яны запраграмаваныя ў ёй. Жыцьцё агрэсіўных істотаў, узрошчаных расейскай сыстэмай – гэта як язда на ровары. Прыпыніўся, стаў памяркоўным, лагодным – значыць, страціў ініцыятыву. А безь ініцыятывы яны страчваюць уладу, магчымасьць увесь час уплываць на сьвядомасьць людзей. Таму агрэсія ніколі не прыпыніцца. Свабода ў цывілізаваным грамадзтве – гэта адказнасьць перад дзяржавай, перад нацыяй, сям'ёй, грамадзтвам. А калі дзяржавы ўжо няма, нацыі не існуе, грамадзтва разбурана, сямейныя повязі кволыя?

У мяне такое ўражаньне, што мы, магчыма, дажываем апошні, зусім невялікі гістарычны адрэзак перад новай тыранічнай расейскай дыктатурай. Чалавечае жыцьцё, на гэты раз ужо наша з вамі, будзе ізноў ахвяраванае дзеля вялікай і неабсяжнай імпэрыі. Дзе ж той момант, той пераломны час, калі наша грамадзтва зрабіла крок па дарозе, якая сёньня вядзе нас, згодных і нязгодных, у страшэнную пустэльню дыктатуры?

Беларускай расейскамоўнай кіруючай эліце, якая так трымаецца за расейскую культуры, незразумела, што тым самым яна трымаецца за іхную сыстэму каардынатаў, дзе чалавек – нішто, дзяржава – усё, што тым самым яна адмовілася ад цывілізацыі Эўрапейскага Дому, ды й ад асабістай улады таксама. Шкада. Эўропа была так блізка.

Кастусь Травень

ЧАЛАВЕК ГОДУ

Газэта «Віцебскі кур'ер» назвала людзьмі году двух чалавек: навапалачаніна Аляксея Філіпчанку і жыхара нямецкага гораду Фрыдрыхсгафэн Карла Фрэнкеля. Аляксей Філіпчанка, былы супрацоўнік пракуратуры, які быў вымушаны звольніцца, пачаў дапамагаць простым грамадзянам абараняць свае правы праз суд. Усе законныя спробы дапамагчы адной кліентцы аказаліся марныя, і ў знак пратэсту супраць вынесенага прысуду 8 ліпеня побач з будынкам гарсуда Філіпчанка абліў сябе бэнзінам і падпаліў. Праз 23 дні ён памёр у шпіталі. Пахаваньне атрымалася сьціплае й малалюднае. Зь Менску прыехаў толькі дэпутат Валеры Шчукін (пад час жалобнай працэсіі ён нес крыж). Супрацоўнік КГБ асабліва старанна здымаў на відэакамэру, як засыпалі труну пяском.

Карл Фрэнкель – вядомы бізнэсовец з Фрыдрыхсгафэна, нямецкага гораду-пабраціма Полацка. Ён вельмі паважнага веку, удзельнік другой сусьветнай вайны. Зь сярэдзіны 90-х, калі паміж гарадамі ўсталяваліся шчыльныя сувязі, спадар Фрэнкель пачаў штогод на Каляды перасылаць кожнаму жыхару Полацку падарункі. Акрамя таго Карл Фрэнкель дапамагаў дзецям, старым, вэтэранам вайны, бедным сем'ям і яшчэ шмат каму ў горадзе, у тым ліку й мясцовай каталіцкай парафіі, якой падараваў звон для новага касьцёла. Цяпер зычны звон, які адмыслова замаўлялі для полацкага касьцёла сьв. Андрэя Баболі, штодзень цешыць сэрцы полацкіх вернікаў. Сёлета, як і ў мінулыя гады, нямецкі бізнэсовец традыцыйна паслаў падарункі ў горад на Дзьвіне. Аднак да Калядаў іх раздаць не атрымалася. Некалькі тыдняў гарадзкія ўлады праводзілі мытнае афармленьне грузу. Толькі з асабістага дазволу прэзыдэнта дабрачынны груз вызвалілі ад мытных падаткаў.

Наваполацкая гарадзкая газэта «Хімік» назвала чалавекам году арганістку Сафійскага сабора Ксенію Пагарэлую. Пры канцы мінулага году яна адзначала ў Полацку дзесяцігодзьдзе сваёй творчай дзейнасьці. Юбілей прыпаў на дні III міжнароднага фэстывалю арганнай музыкі «Званы Сафіі». У сьценах славутага храма адбылася прэм'ера 4-й сымфоніі Алега Янчанкі «Слова пра паход Ігаравы». Ксенія Пагарэлая на фэстывалі таксама ўпершыню выканала – сымфанічную паэму менскага кампазытара Ганны Кароткінай «Эклезіяст». Упершыню полацкія «Званы Сафіі» наведаў такі зорны склад эўрапейскіх арганістаў.

Таварыства вольных літаратараў выбрала свайго героя году, адзначыўшы яго літаратурнай прэміяй «Гліняны Вялес». Ім стаў вядомы беларускі пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Сваёй узнагародай тэвээлаўцы віталі кнігу «Божая кароўка зь Пятай авэню», якая выйшла на пачатку мінулага году ў выдавецтве «Наша Ніва». Гэта, бадай, самы вядомы палачанін з сучасьнікаў – нягледзячы на тое, што з пачатку 90-х ён жыве ў Менску. Ягоная кніга «Таямніцы полацкай гісторыі» зрабіла рэвалюцыю ў сьветаглядзе месьцічаў старажытнага гораду.

Алесь Аркуш, Полацак

ПРЫГОДЫ МАЛАДОГА ФРОНТУ 2 ЛЮТАГА

Маладафронтаўцы працягваюць падтрымліваць акцыю «Нашай Нівы».

2 лютага менская школьніца **Ульляна Вішнеўская** трапіла ў кашмарную сытуацыю: у Дзень без чужога слова быць выкліканым да дошкі на занятках расейскай мовы! Калі Ульляна пачала адказваць па-беларуску, русіцу ледзь не схапіла кандрашка. Ульляну Вішнсўскую выставілі за дзьверы.

Малады рок-музыка **Хведар Жывалеўскі** стараўся ў наш Дзень размаўляць ня толькі адно па-беларуску, але й гаварыць як мага больш. За гэта на прыпынках, у аўтобусах і тралейбусах Хведар штораз атрымліваў па пятнаццаць-дваццаць параў недаўменных вачэй і некалькі цёплых, задаволеных усьмешак. Круглых вачэй усёткі было значна больш — таму Хведар будзе працягваць сьвяткаваньне 2-га дня штомесяц да поўнае перамогі.

Мара Куніна, што вядзе Клюб гісторыі славянскіх народаў, якую два тыдні таму міліцыянт на станцыі мэтро «Плошча Перамогі» з словамі «Ты еще поговори у меня по-белорусски!» ударыў па твары, — дык вось, гэтая самая Мара 2 лютага зайшла ў краму «Прырода», каб набыць пацучка. Расейскамоўная прадаўшчыца адмовілася яе разумець. «Мне пацучка!» — настойвала Мара. Тады прадаўшчыца выклікала міліцыю.

Паразумецца з гэтым міліцыянтам аказалася значна лягчэй: у адрозьненьне ад мэтроўскага, ён не забыўся роднае мовы й ня выклікаў варанок, а проста патлумачыў жанчыне за прылаўкам, чаго хоча Мара.

Але пацучок усё ж Мары не спадабаўся. Можа, у наступны раз — напрыклад, 2 сакавіка, будзе лепшы?

На пікеце, у якім маладафронтаўцы стаялі каля Камароўкі 2 лютага з плякатам «Дзень без чужога слова», на 17-гадовага **Зьмітра Касьпяровіча** насядала пара пэнсіянэрак з торбамі: «И не стыдно вам вот с этим стоять!..» «Невозможно смотреть! — зьвярталіся бабулькі да міліцэйскага патруля. — Уберите это отсюда!» «Вось станьце побач зь імі, — адказаў міліцыянт, — і самі напішыце на плякаціку, што ў вас баліць.» Ужо які раз на Дні без чужога слова нашымі паплечнікамі аказваюцца простыя беларускія хлопцы ў плямістай форме. Што ж, беларуская мова ў камуфляжы — гэта зусім не экзотыка. Камуфляж — гэткая ж звычайная абгортка для яе, як і пацёрты пінжак патомнага пісьменьніка, вышыванка местачковай фальклярысткі ці рваныя джынсы менскага нефармала 90-х.

Знакаміты «кубачак гарбаты» хутка стане такой жа шпілёвай праверкай на вашывасьць, як і памятная «рыдлёўка» канца 80-х. Стандарт-легендай адраджэнцкага фальклёру, ва ўсялякім разе. Ужо й зараз ці ня ў кожнага з нас ёсьць што ўспомніць наконт гэтае самае «гарбаты». 2 лютага **Раман Ясеў** зайшоў у буфэт свайго каледжу, каб купіць булачку з гарбатай.

— Булачку і што?!

— І гарбату.

Раман атрымаў і булачку, і гарбату, а пасьля яго ўся група, што стаяла ў чарзе, адзін за адным, пачала зь вясёлай аднадушнасьцю патрабаваць «гарбату». Пад канец перамены прадаўшчыца, мабыць, была ўжо стопрацэнтова ўпэўненая, што «нашы ў горадзе» і Пазьняк вярнуўся.

Ехаў я з Гомеля ў тыповым вагоне «Беларускае чыгункі», і ўвечары ветліва папрасіў гарбаты. Ну, думаю, ужо ж пісьменьнік і бард Зьміцер Бартосік павінны быў у сваім элегантным стылі перавыхаваць гомельскіх праваднічак, ці, прынамсі, прывучыць іх не шарахацца ад роднага слова. Але паўтарыўшы, чаго я хачу, у круглых, бы студні, бяздонна спуджаных вачох белабрысае кабеціны я ня ўбачыў ня тое што намёку на якогась там Бартосіка, але й найменшага пробліску. Дзень прынцыповы, падбадзёрыў я сябе і вырашыў стаяць насьмерць.

— КАВО?

— Напой такі ёсьць: цэйлёнскі, індыйскі...

— Эта чяй, — хуценька папярэдзіла мая суседка па купэ.

— Чай ёсьць, а прычом тут «гарбата»? — зубаста адрэзала праваднічка.

— Так па-беларуску, — уставіў я.

— Не знаю, не знаю, — разьвярнулася да мяне ўсім корпусам суседка, — мы такого не учили. И чяй всегда был «чяй», и откуда «гарбату» придумали?..

— Адкуль і «Гербалайф» — з лаціны! — кароткімі чэргамі адстрэльваўся я.

— Мы так не говорили! — настойвала дама.

— НЕТУ ГОРБАТЫ, — раптам сваім бяздонным позіркам спыніла мяне праваднічка.

— Не прынясеце гарбаты — сарву стоп-кран, — я злосна перасеў на «аварыйную» бакавушку й намёртва схапіўся за чырвоны рычаг.

Усё вылося так хутка, нечакана й наперабой, што два суседнія купэ разам выбухнулі здаровым раскацістым рогатам. Гістэрычна залівалася нават суседка, якаталі дзеці на верхніх палiцах, а паўвагона высунулі галовы паглядзець, што робіцца. О, гэта была цэлая акцыя!

Скончылася тым, што гарбаты праваднічка мне ўсё-такі прынесла. Пры тым павучальна цокнула перада мной мэталёвым кубкам, бліснула вачыма:

— Это — чай.

— Гэта гарбата, — буркнуў я ёй у сьпіну.

Напэўна, ты зрабіў няправільна, думаў я, прысёрбваючы жэжанькас. Нуль эфэкту, дасадліва папракаў я сябе, уладкоўваючыся на сваёй палiцы — і дзеля чаго толькі расьпінаўся? Толькі дзеля прынцыпу?

Я ўсё варочаўся ў паўдрымотным непакоі пад неразборлівы шэпт спадарожнікаў. «Быць арыстакратычнымі й стрыманымі яны шчэ навучацца. Галоўнае, што прынцыпы ў іх ёсьць, стрыжань». У суседнім купэ сьцішана размаўлялі пра беларускую мову й беларускую моладзь.

Усё-такі нездарма, падумаў я і ўтульна падаткнуў коўдру.

Павал Севярынец

Польскі інстытут у Менску

запрашае на выставу фатаграфіі **«Віленская элегія».**

Работы **Яна Булгака** віленскага пэрыяду
з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Галерэя візуальных мастацтваў «Нова». Адрас: вул. Веры Харужай, 16.

РАЗМАЎЛЯЮ ПА-БЕЛАРУСКУ:

КРОНІКА ЎДАЛАГА ЭКСПЭРЫМЭНТУ

«Сёньня кладземся спаць. Заўтра размаўляем толькі па-беларуску і ўсюды па-беларуску», – здавалася б, што прасьцей? Было б проста, каб я ня быў у сваім коле «нармальным пацаном». І вось усе — знаёмыя, сябры — раптам (раптам!) пачуюць мяне на «незалежнай» мове. Усе ведаюць маё стаўленьне да культуры, Радзімы й палітыкі, мае перакананьні і нармальна іх прымаюць. Але як яны паглядзяць на мяне, калі я пачну паводзіць сябе шчыра адпаведна маім (ды й іхным) тэорыям? Калі я пачну замацоўваць тэорыю практыкай — гаварыць па-беларуску?

Карацей, заўтра, не (на гадзіньніку дзьве хвіліны на першую), ужо сёньня размаўляем па-беларуску.

Трэба падрыхтаваць пару варыянтаў адказу на пытаньні кшталту «А чаму гэта ты раптам па-беларуску?» Вар'яцкая сытуацыя: чалавек павінен тлумачыць, чаму ён размаўляе на роднай мове. Чаму чалавек нагамі ходзіць? Ну, проста падабаецца мне!

Суседа па інтэрнаце, на жаль, няма. Дзень пачынаецца ў грамадзкім транспарце. Маўчу, пакуль аўтобус, моцна рохкнуўшы, не спыняецца сярод дарогі. Кіроўца бегае сюды-туды, потым адчыняе дзьверы. Далей ня едзем. Бабулька побач пытаецца: «А што, далей ня йдзе?» «Не, далей ня едзем», – кажу я, ціснучыся да выхаду.

У наступным аўтобусе сутыкаюся з аднакурсьніцай. Па-беларуску размаўляем ні аб чым. Людзі вакол ці ня чуюць, ці робяць выгляд, што ня чуюць, а я, машынальна падтрымліваючы размову, думаю.

Раней у нашай факультэцкай групе было чатыры дзяўчыны, якія размаўлялі па-нашаму. Адна размаўляе дагэтуль, на яе не паўплываў нават расейскамоўны муж, але яна ўжо на завочцы. Дзьве зараз зьвяртаюцца да ўсіх па-расейску. Адна, як і я, дзьвюхмоўная. Гэтая таксама калісьці была беларускамоўнай, а зараз я, здаецца, проста прымушаю яе «размаўляць на нармальнай мове». Можа, гэта абыякавы стан грамадзтва мярцьвіць нават без агрэсіі? Ты проста соўкаешся ў ім, як у вязкім, ліпучым, сьлізкім, сьмярдзючым ружовым кісялі. І паўсюль, як у сьцяну, тыкаешся ў маўчаньне і ў чужую мову. Не параўноўваю гэта зь існаваньнем у замежжы бязь веданьня мовы краіны-гаспадыні – ніколі ня быў.

Размаўляю на факультэце зь беларускамоўнай завочніцай і іду да «шырокіх колаў грамадзкасьці».

Празь дзьве гадзіны думка: яны што, успрымаюць мову як мой чарговы прыкол? Дурань, я сам прывучыў, што я прыкаліст і ўвесь час выкідваю нейкія фартэлі. Цяпер праблема, як давесьці ім, што мова — гэта сур'ёзна? Нават ніхто не пытаецца: «А што гэта ты раптам па-беларуску?» А я б ім так адказаў!

«Переведи, пожалуйста, с родного языка на нормальный», – гэта шчырая расейскамоўная суседка, якая мяне іншым часам проста не разумее. А па мовах у яе ў залікоўцы ня тройкі, як у мяне. І я ёй буду перакладаць? Не, родная, ты ўжо дарослая, прызвычайвайся да полікультурнасьці, гэтая звычка табе спатрэбіцца.

Канец другой пары. Адчуваецца нейкая вузіня асяродку зносінаў. Раней я гэтага не заўважаў, але амаль усе факультэцкія размовы зводзяцца да жартаў і прапановаў пайсьці на піва замест заняткаў. Сур'ёзна і грунтоўна тут не размаўляюць. Варта было зьмяніць мову, каб заўважыць хоць гэта.

Перапынак. Падыходзіць беларускамоўная раней дзяўчына, зьвяртаецца да мяне па-расейску. Адказваю па-беларуску. Нават зьбянтэжыў. Размова так жа йдзе далей, але, здаецца, дзеўка пачуваецца ніякавата. Можа, таму, што яна ўжо амаль ніколі не размаўляе па-беларуску?

Каля тэлефону на родным журфаку: «Як прыгожа ты размаўляеш па-беларуску!» Сам знаю, што прыгожа.

Мэтро. Еду на 10-я угодкі БНФ. Аднакурсьніца (што гэта сёньня адныя дзяўчыны трапляюцца?), якую я неяк суцяшаў, калі яна перапіла. З гэтага часу яна лічыць мяне «парадачным», а я ж насамрэч значна горшы. Адчуваю сябе няёмка: яна звыкла чуць мяне па-расейску, бачна, што ёй прыходзіцца перакладаць у галаве. Здаецца, яна робіць гэта добра.

Фронтаўскі сэйшн. Нічога цікавага, там усе так размаўляюць.

Тэлефаную бацькам у Гомель па-расейску. Экспэрымэнтаваць зь імі не магу. Наступным разам папярэджу і тады перайду.

«Батон и половину хлеба» – у краме. З жахам лаўлю сябе: што я кажу... Ня трэба выняткаў, інакш пачнеш думаць па-расейску, і ўвесь твой беларускамоўны дзень пойдзе на фіг. Нават калі потым схопішся па-беларуску, гэта ўжо не апраўданьне, слова не верабей. Трэба зноў пачынаць усё спачатку.

Еду ў інтэрнат. Заўтра павінен прыехаць сябар-сусед. «Сёньня кладземся спаць. Заўтра зноў размаўляем па-беларуску».

Мэтро, тралейбусы, камэрцыйныя шапікі, крамы, пошта... «Грамадзтва» да нязвыклай мовы ставіцца больш чым талерантна. Прынамсі, менчукі. Я думаў, што найбольшыя складанасьці ўзьнікнуць зь незнаёмымі людзьмі, было цікава, як яны ўспрымуць ветлівае, але правакацыйнае «калі ласка!». Людзі на вуліцы разумеюць і не зьдзіўляюцца, пытаньні ўзьнікаюць толькі з бліжэйшым колам, сябрамі, сваякамі.

Чаму б нам усім не прачнуцца і не пачаць размаўляць па-беларуску? Задаваць беларускія пытаньні, чуць беларускія адказы. Нам ніхто не перашкаджае, пасьля беларускамоўнага дня гэта разумееш. Трэба працаваць перш-наперш над сабою, а працаваць над сабою людзі вельмі ня любяць. Асабліва гэтага ня любяць мужчыны, бо жанчыны хоць фарбавацца прызвычаіліся.

«Заўтра зноў размаўляем па-беларуску». Пераходзіць на беларускую мову зараз і раптам, «у размове зь людзьмі» – вось чаго рабіць ня варта: занадта складана адразу кантраляваць сябе, ня зьмешваць расейскую й беларускую мовы, бо шматлікія памылкі прымушаюць камплексаваць. Значна лягчэй пачынаць беларускую мову зранку, «з панядзелка», вызначыўшы канкрэтны тэрмін. Гэта ўсё роўна, што кінуць паліць – тое ж захапленьне кожным новым пражытым днём. Разумееш, якая файная ідэя – Дзень без чужога слова.

А ўсё ж беларуская мова пашыраецца, і працэс гэты коціцца сьнежным комам. Прынамсі, у 1995-м годзе я ня чуў столькі беларускага слова на дварэ, колькі зараз (ці гэта кола сяброў зьмянілася?). А.Г. сваёй эканамічнай палітыкай зрабіў беларускую мову нават папулярнай. Любы яе носьбіт зараз успрымаецца не як «нацыяналіст», а як чалавек, які супрацьстаіць той палітыцы, якая прывяла да сумнае рэальнасьці.

Атачэньне цяпер ставіцца да беларускамоўнага прыязна, за выняткам тых выпадкаў, калі трэба нешта зразумець ці ў нешта ўдумацца, або калі ён выстаўляецца, паводзіць сябе «бескультурна». Вось тады некаторыя згадваюць пра тое, што «ў нас у рэспубліцы дзьвюхмоўе». Так, так, менавіта «дзьвюх», – пярэчу ім. Такія нудзілы бясшкодныя, як бясшкодныя і адносна агрэсіўныя прыхільнікі Ляксандра Рыгоравіча, збольшага пэнсіянэры. У горшым выпадку аблаюць нацыяналістам. Небясьпечныя іншыя — тыя, хто ведае, зь якога боку ў бутэрбродзе масла, але каму проста ня хочацца вучыцца беларускай, хаця ангельскую яны вывучаюць з задавальненьнем. Менавіта яны пачынаюць спрэчкі вакол самой патрэбнасьці мовы: «Кіньце! Што вы носіцеся з сваёю мовай! Народ вас не разумее, і ўсё адно размаўляў, размаўляе і будзе размаўляць тут па-расейску, бо расейская мова тут была спрадвеку і навек будзе! Ня псуйце людзям слых, не напружвайце ім мазгі, размаўляйце, як усе!» Можна разгубіцца, як губляешся заўсёды, калі апэлююць да «народу». Я знайшоў для сябе неагрэсіўны адказ: «Хлопча (дзяўчынка – у залежнасьці), а не здаецца табе, што год гэтак сто зь нечым таму тое самае казалі й Кастусю Каліноўскаму?» Каліноўскага паважаюць усе: спрэчак больш не ўзьнікае. Кастусь – аўтарытэт для ўсіх, незалежна ад «беларускамоўнасьці», прычым «тое самае» яму казалі стопрацэнтова.

«Народ» усё выдатна разумее. Словы «як прыгожа размаўляеш па-беларуску» чуеш неаднаразова. Напярод падрыхтуйцеся да камплімэнтаў. Да таго ж увогуле, народ – гэта я.

Бачыш на сабе адно: чым больш размаўляеш па-беларуску, тым большым нацыяналістам стаеш. Зараз у школах і ВНУ беларуская мова выкладаецца, як замежная. Раз ужо мы ня здолелі ў 1992—1994 распрацаваць і прыняць «нармальнае навучаньне», трэба змагацца за свае праграмы TOEFL. А «беларуская як родная» ж дасягаецца толькі ў працэсе размовы.

Пасьля сваёй моўнай практыкі я прачытаў агітацыйны артыкул Севярынца ў газэце «Імя». Мой асабісты досьвед: чым больш размаўляеш па-беларуску, тым больш беларуская мова падабаецца. Назад, у нямое балота, ня хочацца. Фразу «Па-размаўляйце – вам спадабаецца!» можна вылучыць як рэклямны дэвіз. Дарэчы, ня бачыў ніводнага беларускамоўнага чалавека, які б быў неадукаваны. Беларускамоўнасьць сама па сабе ўжо выступае, як паказчык інтэлекту.

Чаму чалавек пачынае размаўляць па-беларуску менавіта цяпер? Прычына ў кожнага свая. Нехта падкрэсьлівае сваю апазыцыйнасьць сёньняшняй уладзе. Нехта не жадае быць падобным на агідныя твары ТБ. Ці проста «падабаецца мова мне!» Мне дык аднойчы закарцела пабачыць сон на беларускай мове. Сон па-беларуску – гэта ж сон!

Сяргей Пульша



БЭЭНЭФАЎСКАЯ МОВА

Калі на вуліцы ляжыць гурбамі сьнег і дзьме халодны вецер, найлепей схавацца ад кепскага надвор'я на паштамце. Безумоўна, можна забегчы ў краму, але найбольш прыстойным месцам у горадзе пакуль яшчэ застаецца паштамт. Там можна пахадзіць ля шкляных вітрынаў, паразглядаць каляровыя паштоўкі й маркі. На паштоўках рэдка калі сустрэнеш надпіс «З Калядамі!» ці «З новым годам!» па-беларуску, хіба зрэдку дзе збоку выстаўленая дапатопная паштоўка за тысячу «рублёў», мо' яшчэ савецкага часу, непрыглядная й запыленая.

На пошту даводзіцца завітваць і дзеля больш празаічнае справы – нешта адаслаць ці набыць. Тады закручваецца сапраўдны паштовы трылер. Прычынаю непаразуменьняў паміж мною й паштаркамі становіцца... так – мова. Адной не спадабалася, што беларускую назву места Горадня я прадубляваў яшчэ па-польску: Grodno, для тых, каму «непанятна». Паштарка раззлавалася й стала вучыць мяне роднае мовы, грунтуючы свае філялягічныя развагі на тым, што некалі скончыла беларускую школу. Нейкая ў яе гаворка была падазроная, таму я не паверыў, што «па нармальнай беларускай мове всегда была Гродна, у сваей Варшаве будзеце па-польскі пісаць, а тут...» Каляжанка ейная аднойчы ажно падскочыла на крэсьле, спрабуючы абараніць (на найчысьцейшай расейскай) беларускі савецкі назоў Горадні. Спачатку яна абвінаваціла мяне ў тым, што быццам уводжу ў зман аб'яднаньне «Белпошта», доблесныя працаўнікі якога не абавязаныя разгадваць «старославянские названия» ды «не понимают на этом вашем языке». Маўляў, «это как расшифровать – Городся, Гародня, где это, в какой области?» і гэтак далей. Дагэтуль яна чамусьці добра разумела і Горадню, і Берасьце – нічога ня сталася, не памерла, а тут гвалт узьняла. «Это не беларуская мова!» «А якая ж?» — пытаюся. «Бээнэфовская!» Беларуская мова – «это какой-то старорежимный язык... и вообще, вам что, тяжело нормально написать?» — скажа яна мне пазьней.

У Менску паштаркі ня гэткія агрэсіўныя, як часам сустракаюцца ў Гомелі, затое больш непісьменныя, перапісваюць па-расейску з маіх беларускамоўных блянкаў проста з моста ў давальным склоне: «Карниенку... Мялешку... Дашынай». Але што да Гомеля. Я адмыслова абышоў усе, якія былі па дарозе, паштовыя аддзяленьні, і толькі ў адным месцы сустрэў паштарку, якая зразумела, што такое «паштоўкі». Астатнія альбо «белорусского языка не изучали», альбо не разумелі наагул, пра што ў іх пытаюцца. Гандлярка шапіку «Белсаюздруку» на старым гомельскім вакзале спрабавала ледзь ня гвалтам змусіць мяне «говорить нормально – по-русски». Яе «судьба закинула из России, и язык этот непонятен». Цікава, што яна дамагалася, каб менавіта я зь ёй загаварыў па-расейску, а на пераклады тых, хто стаяў у чарзе побач з мною, не зважала. «От-кр-ытк-и». На тое яна ледзь не загаласіла: «А-а! Так умеете по-русски! Надо было здесь притворяться!?»

Такім чынам, беларускамоўныя грамадзяне БНР, не турбуйце сваёю гаворкаю «судьбой занесённых из России» і як мага менш ужывайце «бээнэфовский старославянско-старорежимный язык» як на пісьме, гэтак і ў маўленьні. Калі ж ужо вельмі карціць, калі ласка, штодругі дзень месяца (пажадана шэптам).

Віктар Мухін

Міхаіл Чыгір:

«МОЙ ІДЭАЛ...»

Працяг з старонкі 1.

«НН»: Сёньня ў Беларусі ня толькі мова, але й помнікі архітэктуры і культуры знаходзяцца ў катастрафічным стане. Патрэбнас апэратыўнае ўмяшаньне, каб захаваць для нашчадкаў хоць нешта...

М.Чыгір: Нашыя помнікі... Шмат было зьнішчана ў войнах і ў паваенны савецкі пэрыяд. Нейкім наскокам гэткія рэчы ня вырашаюцца. Паглядзіце, колькі спатрэбілася часу, каб прывесьці ў больш-менш належны стан замкі ў Міры і Нясьвіжы, якія для мяне ёсьць увасабленьнем культуры Беларусі. Не ахоўваць помнікі нельга! Трэба знаходзіць сродкі абавязкова. Тут для нас павінна быць узорам Літва. Але я не хачу даваць канкрэтныя рэкамэндацыі там, дзе я не спэцыяліст. Я ведаю пэўна, што без эфэктыўнай эканомікі нам не адбудаваць гістарычных помнікаў. Таму першае, што трэба неадкладна рабіць — гэта паляпшаць стан эканомікі.

«НН»: Вы прывялі станоўчы прыклад Літвы ў справе аховы помнікаў. А досьвед якіх краінаў варта пераймаць у эканоміцы?

М.Чыгір: Нам вельмі блізкая Літва. У галіне палітыкі і эканомікі нам блізкі і прыклад Польшчы. Аднак я паўсюль кажу, што ў будучыні я асабіста хацеў бы, каб Беларусь сталася гэткай, як Фінляндыя. Хоць у іх неспрыяльны клімат, але дзяржаўны бюджэт Фінляндыі сёньня большы, чым у Расеі. Праўда, там да гэтага йшлі доўга і цяжка. Нам, бадай, бліжэйшы прыклад, дзе за вельмі кароткі тэрмін дасягнулі выдатных посьпехаў — гэта Чэхія. Ужо і там бюджэт большы, чым у Расеі! Ну, а зусім побач — тая ж Літва. Яны дасягнулі зайздросных посьпехаў, найперш у сельскай гаспадарцы. Эканоміка Літвы стабільная, ёсьць устойлівы хуткі рост. Інвэстыцыяў у Літву ўкладаецца ў дзясяткі разоў болей, чым у сёньняшнюю Беларусь. Практыка давяла, што яны абралі адзіна слушны шлях, па якім трэба будзе йсьці і нам.

«НН»: Якія былі б вашыя першачарговыя захады як прэзыдэнта?

М.Чыгір: У першую чаргу — зьняцьце эканамічнай і палітычнай блякады з боку Захаду. Затым усталяваньне самых шчыльных кантактаў з МВФ, Сусьветным Банкам, Эўрапейскім Банкам Рэканструкцыі і Развіцця. Патрэцяе, адбудова нацыянальнай фінансавай сыстэмы.

«НН»: У агульных рысах гэта падобна да праграмы «ценявога ўраду» БНФ...

М.Чыгір: Можа быць. Раней я іх ня надта разумеў. Я ўважліва вывучаў іх дакумэнты, аднак ня мог пагадзіцца зь некаторымі іх прапановамі, напрыклад, пабудовай другога нафтавага калектару, каб ня быць прывязанымі да аднае Расеі. Гэта, вядома, рэч нядрэнная, але размова пра мільярды даляраў. Іх няма ў Беларусі, няма й ахвочых інвэставаць у гэты праект. Ну дык пра што гутарка? Трэба ж хоць у нечым паляпшаць эканоміку сёньня ж. Была яшчэ прапанова павысіць плату за транзыт газу і нафты. Але ж тая плата, якую мы бралі і бярэм з Расеі сёньня — гэта сусьветныя кошты. Можа, недзе ёсьць трохі большыя стаўкі, але вялікага разрыву няма. І бяз БНФ тут усё ясна. Хоць былі і слушныя прапазыцыі. Напрыклад, павысіць зборы за аўтамабільны транзыт. Я лічыў і лічу гэта разумным. Як і некаторыя іншыя іх прапановы.

«НН»: Якой бачыцца вам роля ўраду БНР ў беларускай палітыцы?

М.Чыгір: Пакуль ніякай. Яны восемдзесят гадоў сядзяць за мяжою і могуць прасядзець яшчэ столькі ж. Трэба працаваць на Бацькаўшчыне. Ведасце, грамадзянства БНР, іх пашпарты — гэта нейкі нерэальны, паралельны сьвет. Гэта гульні. Вы скажаце, што і маё самавылучэньне ў прэзыдэнты таксама? Пабачым. Я буду гуляць на сваёй тэрыторыі. І ўсё вырашыцца ў самой Беларусі. Калі самі беларусы выберуць сабе будучыню, то тут ня дасьць рады ні Расея, ні Амэрыка, ні хто іншы. А кіраўніцтва БНР можа далучацца. Я яшчэ ня чуў ад іх канкрэтных прапановаў, напрыклад, эканамічнай праграмы.

«НН»: Лідэр БНФ сьцьвярджае, што за Вамі стаяць расейскія службы, а з другога боку кажуць, што Масква Вас не падтрымлівае.

М.Чыгір: Хай гавораць, што хочуць. Нядаўна я прачытаў у адной зь беларускіх газэтаў, што я — агент ЦРУ. Што да пазыцыі Масквы, то я вам скажу — адны лідэры не падтрымліваюць, другія — гатовыя падтрымаць. У мяне насамрэч там добрыя сувязі, як, між іншым, і на Захадзе.

«НН»: Якія ў Вас замежнапалітычныя сымпатыі?

М.Чыгір: У замежнай палітыцы не патрэбныя ніякія сымпатыі ці антыпатыі. Патрэбны прагматычны падыход. Паколькі мы ня можам выбіраць сабе суседзяў, то з Расеяй давядзецца мець шчыльныя эканамічныя кантакты. Але што да блёкаў, групаў і гэтак далей, гэта нас не ўратуе. У любым выпадку мы апынемся на сумежжы, на лініі супрацьстаяньня. Для мяне ідэал — Швайцарыя, якая нават сёньня не зьбіраецца разьвітацца з нэўтралітэтам. Трэба разьлічваць не на Расею ці Эўропу, а толькі на саміх сябе.

«НН»: А якая пры Вашым магчымым прэзідэнцтве будзе дзяржаўная сымболіка?

М.Чыгір: Яна ж ня будзе «маёй». Я асабіста быў рашучым праціўнікам сумнавядомага рэфэрэндуму. Цяпер жа папярэднюю Канстытуцыю аўтаматычна не вярнуць. Дарэчы, менавіта з-за яе палажэньняў мы маем тое, што маем. Усё павінен вырашаць Вярхоўны Савет. Пытаньні пра сьцяг і пра герб таксама. Абавязак прэзыдэнта — выконваць закон. Калі вернецца папярэдняя сымболіка — я ня супраць. Аднак спачатку няхай сам народ абярэ сабе законны парлямэнт.

Гутарыў Сяргей Харэўскі

Аляксандар

БЕЛАРУСЫ

Сярод некалькіх дзясяткаў замежных гасьцей у Кангрэсе дэмакратычных сілаў Беларусі бралі ўдзел пяцёра прадстаўнікоў суседняй Украіны, у тым ліку й парлямэнтары Вярхоўнай Рады. Выказаўшы падтрымку беларускай дэмакратыі, украінцы, відавочна, баранілі й гонар сваёй дзяржавы. Як вядома, Кангрэс дэмсілаў амаль што цалкам супаў па часе з трохдзённым афіцыйным візытам у Менск дэлегацыі Вярхоўнай Рады на чале зь яе старшынём А.Ткачэнкам. Пад час Кангрэсу нам даў інтэрвію віцэ-старшыня фракцыі Народна-дэмакратычнай партыі (НДП) у Вярхоўнай Радзе Украіны Аляксандар Емец.

НДП — адна з найбольш уплывовых палітычных партыяў Украіны. Фактычна, партыя ўлады. У НДП уваходзіць шэраг высокастаўленых асобаў, у тым ліку прэм'ер-міністар Валеры Пуставойтэнка, да яе блізкі й прэзыдэнт Кучма. На леташніх парлямэнцкіх выбарах НДП апынулася на 4-м месцы па колькасьці галасоў пасьля кампартыі, Народнага Руху і блёку сацыялістаў і сялянаў (да якога належыць Ткачэнка).

— Пане Емец, як бы вы пракамэнтавалі прыезд і выступ у Нацыянальным Сходзе старшыні Вярхоўнай Рады Аляксандра Ткачэнкі? Наколькі вялікая частка ўкраінскага парлямэнту падтрымлівае погляды свайго сьпікера ў дачыненьні да Беларусі й гатовая прызнаваць нелегітымны нацыянальны сход?

—Вы ведаеце, усё гэта досыць супярэчліва. У Ткачэнкі гэткія ж супярэчлівыя погляды, як і ў вашага прэзыдэнта. Нават цяжка ацаніць гэтыя погляды ідэалягічна. Будучы чалавекам, які шмат займаўся бізнэсам, ён разам з тым можа падтрымліваць камуністычныя альбо блізкія да камуністычных ідэі. Таму цяжка зразумець яго пазыцыю. Як бачна зь ягоных паводзінаў як сьпікера, ён у згодзе то з камуністамі, то з намі...

КАСАВАРЫ ГАТОВЫЯ ДА ЗДАБЫЦЬЦЯ

Балканская паўвыспа — край, дзе Захад сутыкаецца з Усходам і дзе вострыя цені мінарэтаў засьцяць крыжы хрысьціянскіх бажніцаў. Там, на Балканах, здавёнчасу сышліся бітыя шляхі з Эўропы ў Азію, геапалітычныя інтарэсы вялікіх дзяржаваў, спляліся ў адзін клубок міжканфэсійныя і міждзяржаўныя спрэчкі, старыя крыўды. На Балканах няма міру, і канфлікт у Косаве ёсьць толькі чарговым зьвяном бясконцага ланцуга ўзрушэньняў апошняга стагодзьдзя.

Расейскія, а сьледам за імі і беларускія афіцыйныя СМІ, апавядаючы пра Косава, не стамляюцца сьцьвярджаць: альбанцы зьявіліся тут толькі пасьля другой сусьветнай вайны. Маршал Ціта нібыта спрыяў ад'езду праваслаўных сэрбаў і засяленьню прывезенымі з Альбаніі мусульманамі.

Працяглы час пра Альбанію і яе насельнікаў мала што было вядома. Краіна горных арлоў была ізаляваная ад вонкавага сьвету, і таму яе называлі няйначай «чорнай дзіркай» у цэнтры Эўропы. Між тым шчыптары (так сябе называюць альбанцы) — адзін з самых старажытных эўрапейскіх народаў. Яны вядуць свой радавод ад ілірыйскіх плямёнаў і зьяўляюцца аўтахтонным насельніцтвам Альбаніі й заходняй часткі Косава. Паводле гісторыкаў, ілірыйцы (племянны хаўрус дарданаў) апанаваў тэрыторыю Косава дзесьці на мяжы XIX—XVIII ст. да н.э., тым часам як сэрбы прыйшлі ў тыя мясьціны не раней за VII ст. пасьля Хрыста.

У мінулым продкі сучасных альбанцаў і сэрбаў жылі разам, а калі весьці гаворку аб іхнай канфэсійнай прыналежнасьці, дык у раньнім сярэднявеччы і першыя, і другія былі хрысьціянамі. Так што косаўскія храмы XII ст. зусім ня сьведчаць аб пракаветна-сэрбскім характары Косаўскага краю.

На пачатку XV ст. тэрыторыя Косава падпала пад уладу туркаў, але й пасьля гэтага касавары — косаўскія альбанцы — доўгі час заставаліся хрысьціянамі. Масавае навярненьне ў іслам распачалося толькі ў XVII ст.

Югаслаўскія гісторыкі ў сваіх працах ствараюць яшчэ адзін міт — пра хаўрус турэцкіх заваёўнікаў і альбанцаў. Насамрэч шчыптары неаднаразова ўздымаліся супраць асманскага валадарства, і цэнтар гэтай барацьбы, прынамсі ў другой палове XIX ст., знаходзіўся ў Косаве. Менавіта тут у 1878 годзе была ўтвораная так званая Прызрэнская ліга, якая паставіла за мэту вызваленьне Альбаніі з-пад асманскага ярма і якая была разгромленая туркамі.

Толькі ў 1912 годзе Альбанія здабыла незалежнасьць, але межы новай дзяржавы з ласкі Лёнданскай канфэрэнцыі паслоў правялі без уліку этнаграфіі, і вызваленая ад туркаў тэрыторыя Косава была далучаная да Сэрбіі. Сталася так таму, што за сьпінаю сэрбаў стаяла царская Расея.

У складзе каралеўскай, а затым Цітавай Югаславіі касавары напоўніцу зьведалі, што такое сэрбскі шавінізм. А непасрэдна далучэньне Косаўскага краю да Сэрбіі прайшло пад знакам гвалтоўнай дэпартацыі з родных мясьцінаў у Турцыю блізу 400 тысяч мусульманаў. І хаця дэпартаваных і называлі «туркамі», гэта былі збольшага косаўскія альбанцы. У наступныя гады сэрбскі, а затым югаслаўскі ўрад былі апанаваныя ідэяй высяленьня ў Турцыю рэшты касавараў, а вядомы югаслаўскі гісторык Васа Чубрылавіч нават напісаў на гэты конт адпаведны мэмарандум, у якім «тэарэтычна» абгрунтаваў ідэю масавых дэпартацый.

Сеча альбанцаў з туркамі, XVI стагодзьдзе.

Этнічныя чысткі ды гвалтоўная славянізацыя краю далі плён: увесну 1941 году касавары, хаця й без асаблівай радасьці, але даволі прыязна сустрэлі новых акупантаў — італьянскіх фашыстаў. Ну, а калі Мусаліні, гуляючы на нацыянальных пачуцьцях шчыптараў, далучыў значную частку Косава і Заходнюю Македонію да акупаванай італьянцамі Альбаніі, маладыя касавары гамузам сталі ў шыхты арганізаваных фашыстамі нацыянальных вайсковых фармаваньняў. Але значная частка альбанцаў выступіла супраць акупантаў, і ўжо ў 1941 годзе ў гарах былі створаныя партызанскія атрады. Змагаліся партызаны зь цьвёрдай пэўнасьцю, што пасьля перамогі альбанцы Косава і Альбаніі будуць жыць у адной дзяржаве. Пра гэта сьведчыць канфэрэнцыя антыфашыстоўскіх сіл Косаўскага краю, якая сабралася ў апошні дзень 1943 году і прыняла рэзалюцыю аб далучэньні Косава да Альбаніі.

Адразу ж па вайне цітаўцы жорстка расправіліся ня толькі з калябарантамі, але і з тымі альбанцамі-антыфашыстамі, якія выступалі за стварэньне Вялікай Альбаніі. Аж да пачатку пяцідзясятых гадоў баракі Голага Востраву — канцлягеру, у якім Ціта гнаіў ворагаў «народнай улады» — папаўняліся альбанцамі.

Камуністычны дыктатар кінуў касаварам недагры-

ЛЮСТРА ДЗЁН

Емец:

МАЮЦЬ ПРАВА НА СУПРАЦІЎ

Што датычыць інтэграцыйных заяваў Ткачэнкі, то тут зь ім салідарныя толькі камуністы, а ўжо нават прадстаўнікі сацыялістычнай і прагрэсіўнай сацыялістычнай партыяў ставяцца больш асьцярожна. З правага ж боку, натуральна, падтрымкі ён ня мае.

— Уявім сабе, што спадар Ткачэнка ініцыюе, скажам, вылучэньне кандыдатаў у расейска-беларускі сход ад Украіны. Ці яго нехта падтрымае?

— Не, натуральна! У нас, дзякуй Богу, дастаткова незалежніцкіх сілаў — мы пакуль што не дапускаем нават уступленьня Ўкраіны ў парлямэнцкую асамблею СНГ. Тое, пра што вы сказалі, будзе патрабаваць зьменаў у Канстытуцыі. Але мы наўмысна заклалі такую працэдуру ўнясеньня зьменаў у Канстытуцыю, што яны проста немагчымыя. Гэта першае. Другое: каб правесьці зьмены ў разьдзелы Канстытуцыі, якія вызначаюць асноўныя прынцыпы існаваньня незалежнай дзяржавы, трэба атрымаць падтрымку Вярхоўнай Рады, прэзыдэнта, рэфэрэндуму і г. д. А гэта нерэальна. Кожны ж, хто паспрабуе зрабіць гэта іншым чынам, будзе проста злачынцам.

— Прамаўляючы на Кангрэсе дэмакратычных сілаў Беларусі, вы сказалі пару словаў аб прэзыдэнцкіх выбарах ва Ўкраіне, адзначыўшы, што яны будуць вельмі складанымі. Колькі ўкраінскіх палітыкаў на сёньня ўжо выказалі намер балятавацца на прэзыдэнцкі пост?

— Ужо дакладна заявілі, што зьбіраюцца балятавацца, экс-прэм'ер Яўген Марчук, экс-сыпікер парлямэнту Аляксандар Мароз. Яшчэ не зусім цьвёрда, але зрабіў папярэднюю заяву аб сваім удзеле ў будучых выбарах цяперашні прэзыдэнт Леанід Кучма. Кампартыя заявіла, што будзе падтрымліваць на выбарах Пятра Сыманэнку. Але ў мяне такое ўражаньне, што, разумеючы мізэрнасьць сваіх шанцаў, Сыманэнка пастараецца не балятавацца. Менавіта з гэтай прычыны камуністы ўвесь час вымагаюць ліквідацыі пасады прэзыдэнта. Наталья Вітрэнка ад Прагрэсіўнай сацыялістычнай партыі таксама ўжо фактычна заявіла, што будзе балятавацца. Днямі адбыўся зьезд партыі «Грамада», дзе вылучылі кандыдатуру Паўла Лазарэнкі. Маюцца заявы пра двух патэнцыйных кандыдатаў Руху: Вячаслава Чарнавіла і экс-кіраўніка МЗС Генадзя Удавэнкі.

— А ці ня можа пры гэткім раскладзе паўтарыцца тая самая сытуацыя, што ў 1994-м годзе ў Беларусі? Вельмі шмат кандыдатаў, зь іх некалькі прадстаўляюць розныя дэмакратычныя сілы... Электарат проста заблытаецца, і вынікам можа стаць абраньне чалавека кшталту Лукашэнкі.

— Такое цалкам магчыма. І ў нас гэткім чалавекам можа быць той жа Ткачэнка, які невыпадкова тут, у Менску, так па-сяброўску абдымаецца з вашай уладаю. Ён дужа блізкі да Лукашэнкі тыпам паводзінаў. Горка казаць, але такі тып паводзінаў падабаецца й нашым выбарцам. Калі ўва Ўкраіне рабілі сацыялягічнае апытаньне, у нас някепска адгукаліся пра вашага прэзыдэнта. На жаль, ва ўмовах расчараваньня грамадзтва такія дэмагагічна-папулісцкія палітычныя тыпажы, палітыкі бульдозэрнага тыпу, маюць папулярнасьць. Асабліва на тле пэўнай млявасьці сёньняшняй выканаўчай улады.

— Я вельмі ўважліва праслухала выступ вашага сыпікера ў нацыянальным сходзе. Запомнілася фраза наконт таго, што «мы перадамо нашым дзецям і ўнукам тое, што прымножым ратнай працай». Спадар Ткачэнка напраўду такі ваяўнічы, што заклікае нас з вамі да ваенных подзьвігаў — улічваючы яго катэгарычнае непрыманьне НАТО?..

— Думаю, ён меў на ўвазе нешта іншае. У яго такое бывае. Ўсё ж наш сыпікер — такі аграрнік вядомы... Для яго словы «ратны подзьвіг» і «працоўны подзьвіг» — сынонімы. Таму я думаю, што ў гэтым выпадку меўся на ўвазе менавіта працоўны подзьвіг.

— Сёньня нямала беларусаў ня вераць у магчымасьць дэмакратычных зьменаў мірным шляхам. На Кангрэсе з вуснаў старшыні Вярхоўнага Савету прафэсара Шарэцкага прагучала, што Беларусь можа ператварыцца ў другую Чачэнію, адстойваючы незалежнасьць. Вам не здаецца, што перад падобнай жа пэрспэктывай — свой Лукашэнка і сваё супрацьстаяньне — апынецца неўзабаве і Ўкраіна?

— У свой час мы хацелі запісаць у Канстытуцыі: «Калі нехта паспрабуе неправамерным чынам захапіць, манапалізаваць уладу ў дзяржаве, скасаваць дэмакратыю, то народ мае права на паўстаньне, на супраціў». Гэта, праўда, не прайшло, хоць такое права ў народаў ёсьць — у тых выпадках, калі больш няма дэмакратычных сродкаў змагацца з гэткай уладай. Я зараз не бяруся адназначна ацэньваць, які менавіта ў гэтым сэнсе цяпер момант у Беларусі. Каб даваць такія ацэнкі, трэба тут пажыць. Праехаўшы паўдня Беларусяй і маючы інфармацыю толькі звонку, я не рызыкнуў бы гэтага рабіць. Вызначацца — самім беларусам. Калі беларусы лічаць, што няма легальных сродкаў барацьбы за змену ўлады, дык павінны самі вызначыць, што прадпрымаць далей. Такое права народ мае, і яно неад'емнае. Што да ўкраінскай сытуацыі, то Ўкраіна вельмі разнародная. У нас ня можа зьявіцца, напрыклад, усеўкраінскі жырыноўскі. Іх будзе сама меней два: адзін — усходні, другі — заходні. Калі раптам узьнікне «ўсходні» жырыноўскі, то супраць яго будзе змагацца захад; калі зьявіцца «заходні», яго ніколі ня прыме ўсход. Украіну ня раз дзерлі на шматкі, яна перабывала пад уладай розных дзяржаваў. Мы сёньня маем некалькі Ўкраінаў, кожная зь якіх ёсьць свайго роду супрацьвагою манапалізацыі ўлады.

Гутарыла Таццяна Сьнітко

КОКА І HARЕЛКА

U Kalumbii, tam, dzie byŭ ziemlatrus, zvarjacieły natoŭp prosta pierad telekamerami rabuje składy Čyrvonaha Kryžu. Zaŭsiody brydka hladzieć na ludziej, jakija kirujucca instynktami biedniaka, navat kali hetyja atavičnyja instynkty abudzilisia z-za trahiedyi.

Kalumbii znoŭ hańba na ceły śviet (kali heta tolki nie čarhovaja medyjamachinacyja, a dziejańni ludziej nie byli spravakavanyja i nie było inšych akaličnaściaŭ, jakija nam časta pakidajuć pa-za kadram). U vačoch «pravilnaha» śvietu sučasnaja Kalumbija taki sama vyradak Łacinskaj Ameryki, jak... jak sionńniašniaja Biełaruś — vyradak Eŭropy.

Nivodnaja kara ehipeckaja nie abminuła hetuju krainu, jak i nas. Nastupstvy sacyjalna-ekanamičnych chvarobaŭ robiać nastupstvy pryrodnych (sel u Armera ŭ 1985 hodzie, za 5 miesiacaŭ da Čarnobylu, pachavaŭ 23 000 čałaviek) i technahiennych kataklizmaŭ katastrafičnymi.

Pry ŭładzie ŭ Kalumbii napaŭadukavanaja aliharchija, što tarmozić raźviccio demakratyčnaj adkaznaści dy spryjaje karupcyi. Papiaredni prezydent musiŭ uciačy z krainy, abvinavačany ŭ krucielstvie j suviaziach z narkamafijaj, kandydataŭ u prezydenty zabivali masava, u harach uładarać pseŭdapartyzanskija hrupoŭki, što ŭžo daŭno służać nasamreč tym samym, kamu j dziaržaŭnyja čyny: mafii. Uva ŭsioj krainie, aproč stalicy, kryminalnaje biazładździe: u adnym Medeljinie ŭ hod adbyvajecca 3000 zabojstvaŭ. Futbalista, jaki na čempijanacie śvietu pa futbole ŭ ZŠA zabiŭ hoł u svaje varoty, zabili. U Francyi kalumbijcy ŭžo hulali tak aściarožna, byccam nie svaimi nahami. Kali ŭ 80-ch Viarchoŭny Sud mieŭsia abmiarkoŭvać pytańnie pra dazvoł na vydaču narkadziałkoŭ u ZŠA, jahony budynak zachapili partyzany ź niejkaj «revalucyjnaj» hrupoŭki. Narkamafija pieraviała pytańnie nacyjanalnaj hodnaści j niezależnaści ŭ płoskaść vydačy/niavydačy złačyncaŭ. Dziaržava nia mieła srodkaŭ abaranić niešmatlikich zmaharoŭ suprać kryminalnaha śvietu na baćkaŭščynie i paśla pary hadoŭ dziejnaści vypraŭlała za żaleznuju zasłonu pasłami ŭ krainy sacyjalistyčnaha lahieru. Ale ŭ 1987 hodzie i ŭ Budapeščie kula mafii znajšła byłoha ministra justycyji Parejo Gonzalez-a. Strach. Etyčnyja mutacyi. Planamiernaja padmiena paniaćciaŭ. Ułada kupki narkamiljaderaŭ, jakija pytajucca: čaho Kalumbija nia moža zarablać na narkotykach, kali Ameryka zarablaje na zbroi?

Čamu Kalumbija, kraina z pryŭkrasnaj nazvaj, pamiatkaj pra pieršaprachodcu, jaki, moža, najlepš uvasablaje sutnaść čałavieka zachodniaj cyvilizacyi, tak sama adroźnivajecca ad, skažam, Venesueli, jak Biełaruś ad Litvy? I ŭ Kalumbii, i ŭ Venesueli mora, patencyjał mineralnych resursaŭ, adnolkavaja daŭžynia histaryčnaj tradycyji. U Venesueli (jak u Biełarusi pra Bykava) tolki marać pra toje, kab Miguel Otero Silva staŭ nobeleŭskim laŭreatam i pryznanym duchoŭnym aŭtarytetam. U Kalumbii jość Garcia Marquez, ale jon uciok u Meksyku ŭ toj ža dzień, kali čarhovaja revalucyjnaja hrupoŭka ŭziała zakładnikaŭ, patrabujučy, kab prezydentam staŭ Garcia Marquez. Takija voś «Columbia Pictures».

Koka dobra rodzić u kalumbijskaj selvie. Jaje sami žujuć i ŭ Ameryku šluć. Koka vykručvaje j biez taho kalanijalnuju strukturu kalumbijskaj ekanomiki dy ekspartu i paskudzić narodnuju śviadomaść, nie daje zhasnuć biadniackim instynktam.

A ŭ Biełarusi — harełka. Chto znaje, moža, prezydenty Venesueli hetak ža patranavali tavarystvy baraćby z narkatyčnaj zależnaściu, jak Antanas Šmiatona i Alhirdas Brazaŭskas — tavarystvy za narodnuju ćviarozaść?

Andrej Dyńko

НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

зены яблык — надаў краю аўтанамічны статус у складзе Сэрбіі. Аднак тая аўтаномія мела фармальны характар; альбанцы па-ранейшаму заставаліся палітычна бяспраўнай нацыяй, а Аўтанамічная вобласьць Косава й Мэтохія — так па вайне называлася косаўская зямля — па-ранейшаму заставалася самай занядбанай, глухой і эканамічна адсталай югаслаўскай правінцыяй. Усе значныя пасады ў Косаве займалі сэрбы, касавараў неахвотна прымалі ў Саюз камуністаў, а ўсе альбанскія грамадзкія суполкі знаходзіліся пад пільным наглядам югаслаўскіх спэцслужбаў. Штогод, ратуючыся ад беспрацоўя, тысячы маладых касавараў выяжджалі на заробкі ў краіны Захаду. Прычым улады ня толькі ня ставілі таму перашкодаў, але і ўсяляк спрыялі працоўнай эміграцыі. У выніку на Захадзе апынулася 140 тысячаў альбанцаў. Двух- і трохпавярховыя дамы касавараў, якія паказвае беларускае тэлебачаньне, пабудаваныя не за югаслаўскія крэдыты, а за даляры і маркі, дасланыя з-за мяжы.

У сярэдзіне 60-х гадоў, падчас адлігі ў Югаславіі, альбанцы пачалі патрабаваць ад уладаў рэальнай аўтаноміі. Пачатак масавых выступленьняў прыпаў на 1968 год, калі дзясяткі тысячаў шчыптараў маніфэставалі на вуліцах косаўскіх гарадоў. Ад тае пары выступы косаўскіх альбанцаў не сунімаліся, і састарэлы маршал Ціта апынуўся перад дылемай: альбо ўжыць сілу, альбо ўтварыць у славянскай краіне неславянскую рэспубліку, якая аднойчы можа паспрабаваць выйсьці з складу фэдэрацыі. Урэшце быў падпісаны праект Канстытуцыі Сацыялістычнага Аўтанамічнага краю Косава, паводле якога край хаця й заставаўся ў складзе Сэрбіі, але атрымліваў практычна такія ж правы, як і югаслаўскія рэспублікі.

Сьмерць Ціты сталася пачаткам новага этапу альбанска-сэрбскага супрацьстаяньня. У сакавіку 1981 году ў адной з прышцінскіх сталовак пабіліся два студэнты, сэрб і альбанец. Бойка справакавала міжэтнічныя сутычкі, у выніку якіх некалькі альбанцаў былі застрэленыя сэрбскай паліцыяй і яшчэ сотні параненыя. Аналягічныя падзеі паўтарыліся ў 1987 годзе. На шматлюдных мітынгах альбанцы рашуча запатрабавалі рэспубліканскага статусу для Косава, але на той час уладу ў Бялградзе ўжо пераняў Слабадан Мілошавіч, і Косаву давялося разьвітацца нават із статусам аўтаноміі. У сакавіку 1989 году сэрбская Скупшчына скасавала канстытуцыю Косава і абвясьціла край неад'емнай часткай Сэрбіі. У адказ 27 і 28 сакавіка ў Прышціне, Мітровіцы, Дэчане ды іншых косаўскіх гарадах прайшлі дэманстрацыі пратэсту, расстраляныя паліцыяй (22 забітыя). Сакавік 1989 году стаў павротным пунктам разьвіцьця канфлікту.

Бялград працягваў пацыфікацыю: альбанцаў выкінулі зь мясцовых адміністрацыяў, альбанскі ўнівэрсытэт зачынілі, гарады й мястэчкі апанавалі атрады спэцсілаў паліцыі. У Косаве — краі, на 90 адсоткаў населеным альбанцамі — разгарнулі своеасаблівую «культурную рэвалюцыю», укараняючы ў аднаэтнічым рэгіёне дзьвюхмоўе ў яго югаслаўскім варыянце. У выніку альбанцы вымушаныя былі стварыць уласную сыстэму школьнай адукацыі, і заняткі ў новым вучэбным годзе пачаліся на прыватных кватэрах, у пунях, а то й проста пад адкрытым небам.

Арганізацыяй школаў справа ня скончылася. У сьнежні ўсё таго ж 1989 году ў Прышціне была ўтвораная першая альбанская партыя — Дэмакратычная ліга Косава, — а на наступны год разагнаны Мілошавічам косаўскі парлямэнт сабраўся ў мястэчку Качанік і прыняў Дэкларацыю аб незалежнасьці Рэспублікі Косава. Неўзабаве незалежнасьць была пацьверджаная рэфэрэндумам, а ў 1992 годзе адбыліся новыя парлямэнцкія і прэзыдэнцкія выбары, на якіх перамог лідэр Дэмакратычнай лігі доктар Ібрагім Ругова. І ўсё гэта праводзілася падпольна, з масавым удзелам насельніцтва.

Ніводная краіна сьвету не прызнала новай рэспублікі, але прэзыдэнт Ругова распачаў актыўную дзейнасьць на міжнароднай арэне. Бялградзкія ўлады ня надта перашкаджалі такой дзейнасьці і мелі рацыю. Прэзыдэнт самаабвешчанай рэспублікі — перакананы прыхільнік Гандзі: для яго непрымальныя сілавыя мэтады ў палітыцы. Тады, на пачатку дзесяцігодзьдзя, Мілошавіч баяўся, што на зьмену Ругову прыйдуць лідэры радыкальнага кшталту. Дык жа не памыліўся: імі сталі палявыя камандзіры ўтворанай у сярэдзіне 90-х гадоў Арміі вызваленьня Косава (АВК).

Напачатку гэтая вайсковая арганізацыя абмяжоўвала сваю дзейнасьць дробнымі тэрактамі, але пазалетась, здабыўшы зброю, стала рыхтавацца да шырокіх вайсковых апэрацыяў. Летась увесну сэрбскія войскі атачылі вайсковую базу АВК у горнай мясцовасьці Дрэніца, а затым, пасьля штурму, забілі 80 альбанцаў, сярод якіх былі й мірныя жыхары. Пасьля дрэніцкай масакры ў Косаве распачалася сапраўдная вайна, пад час якой сотні людзей — у асноўным альбанцы — былі забітыя, тысячы — параненыя, дзясяткі тысячаў дамоў былі спаленыя сэрбамі, і ня меней як 300 тысячаў касавараў сталі ўцекачамі.

Характарызуючы сёньняшнюю сытуацыю ў Косаве, можна сказаць толькі адно: сваёю выдатнай арганізаванасьцю, высокай грамадзкай сьвядомасьцю і самаадданай барацьбой за незалежнасьць касавары даказалі ўсяму сьвету, што яны ўжо здольныя стварыць паўнавартасны самастойны дзяржаўны мэханізм.

Вінцэсь Мудроў

Ігар Кузьняцоў:

600 000 ахвяраў – прыблізная лічба

Працяг з старонкі 1.

На адкрыцьці прысутнічаў беларускі гісторык Ігар Кузьняцоў. Ён адказаў на некалькі нашых пытанняў.

– На які час прыпадае пік рэпрэсіяў у Заходняй Беларусі? Да пачатку вайны ці пасьля яе?

– Самая масавая хваля рэпрэсіяў – з канца верасьня 1939-га да чэрвеня 1941 г. Цягнікі з дэпартаванымі з Заходняй Беларусі адыходзілі на Архангельск, у Сібір, Казахстан. Другая хваля – 1944 год, вызваленьне Беларусі. У той час органы СМЕРШ, НКВД дабівалі тых, каго не дала арыштаваць вайна.

Напачатку вывезьлі толькі асаднікаў, лясьнічых, пасьля ўжо арыштоўвалі ўсіх. Падставаю для высылкі магло быць нават тое, што ты «жыў на тэрыторыі буржуазнай Польшчы».

Тых, хто выказваў незадавальненьне, нейкае спачуваньне дэпартаваным, таксама арыштоўвалі. Але такіх было няшмат. Усе ўжо ўяўлялі, з кім маюць справу. Таму непасрэдных заклікаў супраць савецкай улады не праяўлялася. Справы фабрыкаваліся органамі НКВД на падставе даносаў і сыстэмы сакрэтных інфарматараў, якая ўсталявалася пасьля прыходу савецкіх войскаў. Было 4 хвалі даваеннай дэпартацыі:

– верасень 1939-га – лістапад 1939-га (самая масавая),
– пачатак 1940-га,
– канец 1940-га,
– вясна 1941-га.

Існуюць розныя ацэнкі лічбы дэпартаваных. Нябожчык прафэсар Хацкевіч сьцьвярджаў, што ня больш за 200 тысяч чалавек. Іншыя дасьледчыкі лічаць – значна больш. Я, напрыклад, раблю высновы з дапамогай такога аналізу – толькі на тэрыторыі сучаснай Томскай вобласьці Расеі ў пэрыяд з 1939-га па 1941 г. апынулася каля 25 000 нашых землякоў.



Але высылалі таксама ў Кемераўскую, Новасібірскую, Архангельскую вобласьці, Казахстан, на Далёкі Ўсход, Калыму. Выходзіць, ня менш за 300 000 «заходнікаў».

Зараз спрабуюць маніпуляваць лічбамі: бяруць афіцыйную справаздачнасьць, колькі было выслана па Баранавіцкай вобласьці, Вялейскай і г.д. Атрымоўваецца агулам 60–80 тысячаў. Але патрэбна ўлічваць, што адных высылалі сьпісамі, іншых па лініі органаў НКВД без афармленьня дакумэнтаў. Таму ў гэтую афіцыйную статыстыку ня ўсе патрапілі. Далей. У 1941 годзе пачалася вайна. У Беларусі расоўваньне немцаў было настолькі імклівым, што архівы НКВД не пасьпявалі вывозіць і зьнішчалі. Былі таксама пастановы мясцовых саветаў, якія прымалі рашэньні на сходах. Пастанавілі: гэткія сем'і выслаць – і высылалі. У гэтым цяжкасьць дасьледаваньня праблемы. Але можна пэўна сьцьвярджаць, што хваля дэпартацыі вырвала сотні тысячаў чалавек.

Размова ідзе пра масавае высяленьне. Гэта не адзінкавыя факты, што во нехта памыліўся, і чалавека выслалі. Знаходзяцца аднак артадоксы, якія сьцьвярджаюць, што рэпрэсіяў наагул не было, а рэабілітацыя незаконная. Мы прыйшлі з вызваленчай місіяй, кажуць яны, вызвалілі «заходнікаў» ад палякаў. Вызваліць-то вызвалілі. Але ў якім страху людзі сталі жыць пасьля гэтага вызваленьня!

– Ці ёсьць нейкія зьвесткі пра колькасьць беларусаў, якія служылі ў польскім войску ў 1939 годзе і трапілі ў савецкі палон? Колькі зь іх не вярнулася дахаты?

– Некаторых, хто служыў у польскім войску ці ў ваенізаваных структурах і быў інтэрнаваны, першапачаткова адразу адпускалі. Толькі недзе ў лістападзе 1939-га Берыя даў загад, каб вызвалялі толькі тых, каму больш за 55 гадоў, ці тых, хто ня мае дачыненьня да войска. Яшчэ праз пэўны час выйшаў жудасны загад наагул нікога не вызваляць з 24 000 афіцэраў. Але афіцэры – паняцьце адноснае. Былыя інжынэры, настаўнікі-запасьнікі, якія надзелі афіцэрскую форму на пачатку вайны – таксама афіцэры. У чым была іх віна?

З гэтых 24 000 на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў палон было захоплена 65–70% – каля 15 тысячаў. Сярод іх этнічных беларусаў – да 30–40%.

– Пасьля вайны рэпрэсіі супраць падпольных антыбальшавіцкіх арганізацыяў, нацыянальнай партызанкі мелі масавы характар?

– Антысавецкі супраціў пасьля вайны меў хутчэй ачаговы характар. Не было такога паўстанцкага руху, як у 1920-м на Случчыне. Дзейнасьць МГБ была скіравана на лякалізацыю гэтых ачагоў. Антысавецкія атрады былі нешматлікімі й па складзе: дзясятак, максымум сотня чалавек.

У пасьляваенны пэрыяд рэпрэсіі праводзіліся больш асьцярожна й былі не такімі масавымі, як даваенныя. Ужо ня тыя ўмовы былі, ужо вайна прайшла... У людзей заставалася зброя, і ўлады баяліся справакаваць яшчэ больш моцны супраціў. Рэпрэсіі былі скіраваныя збольшага супраць моладзі, тады як перад вайной – супраць сярэдняга й старэйшага пакаленьня. Пасьля вайны ў моладзі абуджалася імкненьне й жаданьне супрацьдзейнічаць уладзе, сыстэме, якая не адпавядала іх памкненьням. Вось чаму выніклі незалежніцкія арганізацыі моладзі. Моладзь не адчувала страху, які быў у старэйшых. Моладзь лічыла, што змагаецца за слушную справу й нават не ўсьведамляла, што ёй пагражае, грэбавала канспірацыяй, таму большасьць суполак улады выявілі й разгромілі.

Часта самі бацькі стараліся не пускаць сваіх сыноў і дачок удзельнічаць у якой-кольвек барацьбе. Як толькі яны пра гэта даведваліся, дык адразу прымалі нейкія захады, каб ізаляваць, ня даць удзельнічаць, каб дзеці ня трапілі нават пад падазрэньне МГБ. Маштабнага супраціву таму й не было, што людзі былі ўжо навучаныя горкім досьведам і стараліся зьберагчы сваіх дзяцей.

– Ці праўда, што баранавіцкая турма «Крывое кола» была адной з самых жудасных у Беларусі?

– Ня ведаю, ці можна так казаць – гэткіх турмаў было шмат. З адных крыніц – слуцкая турма была самага жорсткага абыходжаньня; іншыя кажуць – менская ўнутраная турма НКВД. У Баранавічах, асабліва ў пасьляваенны пэрыяд, знаходзілася вялікая групоўка войскаў НКВД, якія цяпер называюцца ўнутранымі войскамі. Прысутнасьць вялікай колькасьці войскаў, а таксама ўправы НКВД заўсёды заахвочвала да жорсткасьці. Сыстэма была пабудаваная, каб ламаць людзей, прыніжаць іх, прымушаць здацца.

– Ці зьвязаная прысутнасьць у Баранавічах вялікай групоўкі войскаў НКВД з тым, што ў горадзе пад час нямецкай акупацыі актыўна дзейнічалі нацыянальныя ўстановы і жыло шмат нацыянальна сьведамых людзей?

– Найперш, вядома, таму, што Баранавічы былі чыгуначным вузлом, цэнтрам транспартных камунікацыяў. Але тутака таксама быў вышэйшы адсотак інтэлігенцыі, зьвесткі сюды даходзілі хутчэй, як з Польшчы, так і зь Менску, тутака была тая рошчына, якая патрабавала пільнай увагі з боку органаў. Супраціў у Баранавічах быў больш бачным, чым дзейнасьць аналягічных групаў у Менску. На фоне вялікага гораду гэта ня так заўважна.

– Колькі ўсяго ў Беларусі рэпрэсавана людзей і колькі ахвяраў камуністычнага рэжыму яшчэ жывыя?

– Паводле зьвестак Беларускай асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў усяго жыве яшчэ каля 15 тысячаў чалавек. Паводле афіцыйнай статыстыкі, рэпрэсавана каля 600 тысяч, але гэтая лічба прыблізная, паводле зьвестак 1993 году. Прайшло пяць гадоў, і на аснове апошняй інфармацыі гэтая лічба павялічваецца да 700 тысячаў. А калі падлічыць сасланых пад час калектывізацыі ў Расею й пасьля ўжо там рэпрэсаваных, дык лічба павялічыцца пагатоў.

600 тысячаў – гэта лічба інфармацыйна-выліковага цэнтру МУС. Але як быць з тымі, хто ня трапіў ні ў якія сьпісы? Колькі было зьнішчана дакумэнтаў у 1941 годзе?! Прадстаўнікі органаў любяць сьцьвярджаць: «У нас не адна справа ня зьнікла!» Я разумею, калі гэта сьцьвярджаюць недзе ў Сібіры, куды не дайшла вайна. Апроч таго, вядома, што існавалі сакрэтныя загады на зьнішчэньне асобных справаў, якія маглі скампрамэтаваць кіраўніцтва (напрыклад, у 1953 годзе).

Рэабілітавана ж ня больш за 60–65% ад афіцыйнай лічбы рэпрэсаваных па палітычных матывах.

Гутарыў Руслан Равяка, Баранавічы

НАШЫ ЎЗНАГАРОДЫ

Карпіевіч Дз. Сыстэма ўзнагарод Рэчы Паспалітай. – Менск, 1998. – 69 с. – Наклад 100 ас. ISBN 985-435–088-6

Брашуру маладога гісторыка Дзьмітрыя Карпіевіча варта вылучыць з шэрагу іншых перш за ўсё гаспадарскім падыходам да гістарычнай спадчыны часоў Рэчы Паспалітай, а менавіта да ордэнаў. Раней як было? Беларусы ўважалі за свой ордэн «Віртуці мілітары» (бо на ім «Пагоня»), а ўсе астатнія аддавалі ў гістарычную скарбонку палякаў. Цяпер не аддамо. Дарма што першы рэальны ордэн Рэчы Паспалітай зваўся ордэнам Белага Арла (дзяржаўны герб Польшчы), а другі – ордэнам Сьв. Станіслава (каталіцкі апякун Польшчы). Вядома, нам было б прыемней, каб поруч зь імі існавалі ордэны «Пагоні» і Сьв. Казіміра (каталіцкага апекуна Літвы). Але не атрымалася, хоць у 1770-х існаваў праект стварэньня ордэна Казіміра Паляка, патрона Польшчы (пэўна, меўся на ўвазе Сьв. Казімір), якому адводзілася самая ніжняя прыступка ў гіерархіі ордэнаў. На ордэн Белага Арла маглі б прэтэндаваць і расейцы, бо, згодна з традыцыяй, на найвышэйшы расейскі ордэн Андрэя Найпершпакліканага мог прэтэндаваць толькі кавалер ордэну Белага Арла. Цяпер словы прагучалі – «гэта і нашае, беларускае».

У дэталях сыстэму ўзнагародаў ужо вывучалі палякі, і плён ад іх працы вялікі. Аўтар брашуры згадвае пад сотню крыніцаў, большасьць зь якіх польскія. Што можа даць да іх беларускі навуковец? Колькі сярод кавалераў ордэнаў было мясцовых ураджэнцаў, як яны ставіліся да ўзнагародаў, якое месца займалі ордэны ў іх сыстэме вартасьцяў. Другі накірунак вывучэньня ўзнагародаў – пошук адпаведнай беларускай тэрміналёгіі. Як працца Дз. Карпіевіча адна зь першых, то ў аўтара ўзьніклі цяжкасьці нават зь перакладам назваў ордэнаў і мэдалёў. У першай палове XVII ст. быў праект стварэньня ордэну Бязгрэшнага Зачацьця Дзевы Марыі. Каталік сказаў бы хутчэй – «ордэн Беззаганнага Пачацьця Панны Марыі». Яшчэ цяжэй даецца пераклад назваў мэдалёў з лаціны. На розных старонках кнігі сустракаем варыянты «Узнагароджваючы заахвочвае» і «Узнагароджвая заахвочвае» (мэдаль «Praemiando incitat»). Пэўна, міжвольны русізм, якіх у брашуры вельмі многа (звыклая ў апошні час эканомія на рэдактары). Вось ужо на адной старонцы сустракаем два варыянты перакладу назвы мэдаля «Equiti dextero» – «Дасканаламу ездаку» і «Дасканальнаму ездаку» (таму, хто езьдзіць да скону?). «Diligentiae» – гэта, канешне, «Руплівaму», «Merentibus» – «Заслужаным», «Bene merentibus» – «Добра заслужаным», «Solerti» – «Умеламу», але «Virtiti civili» – гэта не «За грамадзянскія заслугі», а «За цывільныя заслугі», «Virtuti militari» – як як усе ведаюць, «За ваенныя заслугі». Ёсьць і літаральныя пераклады назваў апошніх узнагародаў – «Цывільнай годнасьці» і «Вайсковай мужнасьці» (існуюць варыянты). Трэба больш увагі надаваць прозьвішчам, каб замест вядомага падарожніка па Азіі Карстэна Нібура ня выскачыў «дацкі паручнік Небурх». Моўная памылка ёсьць нават у анатацыі да выданьня («дасьледваньне» замест «дасьледаваньне»).

Увогуле, брашура пакідае ўражаньне, што напісаная яна аўтарам перш за ўсё для сябе, каб уразумець назапашаны матэрыял. Таму трэба чакаць новых выданьняў на гэтую тэму, дзе, будзем спадзявацца, аўтар разьбярэцца з лацінай, падасьць усе мэдалі Рэчы Паспалітай (бо пакуль прыведзена толькі іх частка) і, нарэшце, асьветліць сыстэму ўзнагародаў Рэчы Паспалітай цалкам, бо мэталічныя знакі – гэта далёка ня ўсе ўзнагароды (былі яшчэ каштоўныя падарункі, званьні, землі, нарэшце, грошы).

Валеры Пазьнякоў

Працяг з старонкі 1.

Славамір Адамовіч

ПІСЬМЁНЫ З КАМЭРЫ 59*

што я магу напісаць пра сябе? Мне 33 гады, сяджу тут ужо год, а далі тры. Была замужам, на дадзены момант — у разводзе. Маю дачку — 15 гадоў. Вось Вам, відаць, шанцавала на жанчын, а мне на мужчын ня вельмі. У гэтых сьценах, мне здаецца, таксама наўрад ці можа быць штосьці сур'ёзнае. А ўвогуле, чым чорт не жартуе, так? Буду спадзявацца, што ў бліжэйшы час Вы напішаце за хату 59 верш. Спадзяюся ў хуткім часе выйсьці на свабоду, бо пагаворваюць пра тое, што будзе вялікая амністыя. Вельмі хачу дамоў і да дачкі. Бабуля зь дзядулем — гэта ўсё ня тое. Ёй патрэбна маці, асабліва ў такім узросьце. Вось, здаецца, і ўсё. Пішыце, чакаю. З шчырай павагаю — Валя.

Славіку
Дарагі Славамір! Добрай ночы, дзякуй за верш, але я па-беларуску не разумею... І таму пастарайся, калі яшчэ ёсьць жаданьне, напісаць па-руску. За маё маўчаньне — прабач, таму што мне трэба было падумаць... А ты сам ні разу не напісаў, значыць, табе гэтая перапіска непатрэбная. З пав. Валя.

Х-60. Славаміру
Славік, за «дарагі» дзякуй гаварыць ня варта, так тут прынята. А вось што ты не настойлівы, дык гэта ня вельмі добра. Трэба быць настойлівым. Што датычыць «штучкі», то калі штосьці ня так з галавой, дык не павінна гэта адбівацца... Ты разумны мужчына і зусім не дурны. Гэта шчыра. А тое, што ты «якаеш», дык мне нават цікава, хочацца больш пра цябе ведаць. Да цябе маці прыходзіла, а да мяне ніхто... Ай, не хачу пра гэта. Ведаеш, а чаму ты напісаў, што «Іра». Ірэна — гэта да Польшчы бліжэй?.. У нас дзьве Ірыны, і адна таксама полька. Славік, чаму ты вырашыў, што цябе ня любяць? Цябе любяць, і сам яшчэ будзеш любіць. Пішы. З павагаю — Валянціна.

Х-60. Славіку...
Прывітаньне, Славік! Адразу хачу напісаць табе, што бел. мову я вельмі дрэнна ведаю. Але як табе лепш, так і рабі, бо калі што, я спытаю. А вось навошта табе маё прозьвішча? Думаю, што гэтага пакуль ня трэба. Адукацыя ў мяне вышэйшая, а артыкул — думаю, ён цябе зьдзівіць. Ня будзем пра маю дзялюгу пісаць. Бацькі жывуць у Віцебску, але я зь імі вельмі кепска жыву. Што тычыцца маёй нацыянальнасьці, дык у мяне ўсе палякі, а па месцы жыхарства, г.зн., дзе нарадзілася — беларуска. Але хрысьцілі мяне ў каталіцкай царкве. Што да майго здароўя, дык тут у мяне цікавасьць да каханьня залежыць ад мужчыны, а не ад мяне самой. Я вось што сабой уяўляю: рост сярэдні, волас русявы, вельмі сьветлы, вочы сінія, сярэдняга целаскладу. Кажуць, што з выгляду намнога маладзейшая за свае гады... Куру, бо цяпер амаль усе курацьць. Чыфірыць пачала тут, але толькі раніцай, і ня кожны дзень. А салодкае я вельмі люблю. Але й ня супраць церпкага. Славік, калі мне не пашанцуе з амністыяй, то ў нас будзе час на перапіску, але, думаю, не надоўга. Пішы. Вельмі чакаю ад цябе адказу. Калі ў цябе ёсьць папера, то загані мне, калі ласка. З шчырай павагаю — Валя.

Дарагому Славіку
Славік, вечар добры! Чаму ты лічыш, што пра каханьне трэба гаварыць аглядаючыся? Я лічу, што не. Пляваць я хацела на ўсіх, перш за ўсё трэба думаць пра свой дабрабыт, пра сябе... Ты вось задаў такое пытаньне мне, за свабоду... Усяго таго, што ты мне напісаў — гэтага я ня ведала. Я лічу, што ня ўсе хочуць утаптаць чыстае ў бруд. Напрыклад, я вельмі хачу любіць і каб мяне любілі, хачу чыстых і шчырых пачуццяў. І тое, што тут некаторыя падманваюць жанчын, дык гэта паскуды, ні на што ня здольныя. Славік, думаю, ты зможаш зразумець тое, што я табе напісала. А калі чагосьці не зразумееш, то пытайся. Дамовімся? Слухай, ты гуляць ходзіш? І ты бачыў каго-небудзь зь дзяўчат нашай хаты? А вось што я ізноў хацела напісаць — «Ірына», дык ты правільна заўважыў. Яна затуманіла мне Лёшкам усю галаву. Але чаму ты вырашыў, што я — Ірына? З шчырай пав. Валя.

P.S. Прабач, калі ёсьць капэрта, дык выручы мяне.

***

Славік, а чаму гэта ты вырашыў такім спосабам весьці перапіску? Але гэта тваё жаданьне, і мне няма розьніцы. Слухай, а вось вас адзін раз вялі з прагулкі, і ў кармушцы сядзела адна дзяўчына, цябе тады часам не было сярод хлопцаў? А сон твой... Мне здаецца, пехта да цябе прыйдзе, ну, увогуле, прыб'ецца, як кажуць у народзе. Мяне затуманіў ня Лёша, а Ірына, што чаму так доўга ён ёй ня піша. Увогуле ўсе дзяўчаты любяць з мной гаварыць, раіцца. І ты нават не дапускай такой думкі, што ў нас малявы чытаюць услых. Ці ты думаеш, што калі ў вас так, то і ў нас? Чаму ты не дапісваеш сваю думку? Я маю на ўвазе, што хочаш з мной трымаць кантакт ня толькі як мужчына з жанчынай?... З табой я ў многім згодная, толькі ты мяне няправільна, відаць, зразумеў, і ўсё тое... Пра сябе пісаць няма чаго, бо сяджу ў невядомасьці і нічога ня ведаю. Да мяне ня йдуць, ніхто ня піша, таму для мяне гэта вельмі балючая тэма... Нікому не патрэбная і ведаю, што вельмі ў многім вінаватая сама, а больш за ўсё перад дачкою. А газэты ў нас такой няма, толькі чытала, што ў канцы восені будзе вырашацца пытаньне пра амністыю.

Свае першыя дні на свабодзе я не магу ўявіць, праўда... А тэрмін у мяне ўжо ёсьць — тры гады. У грыбы вельмі люблю хадзіць і зьбіраць... А грудзі ў мяне сярэднія. Славік, мне так сорамна, але мне вельмі хочацца чаго-небудзь смачненькага. Ага, я вось усё спытаць хацела цябе: ты курыш? Калі так, то выручы да заўтра. Пішы. Чакаю. З шчырай пав. Валька.

Славіку
Прывітаньне, Слава! Я ўчора сябе дрэнна адчувала і таму заснула. Напілася таблетак, ты ўжо даруй мне. У мяне дзень нараджэньня 29 красавіка. Ведаеш, усе пагаворваюць пра амністыю, думаю, што яна будзе, і спадзяюся, што траплю пад яе, дакладней, мой артыкул. Вось ты напісаў, што марыў пра тое, каб у цябе была першай дачка, а я наадварот. А што мяне цікавіць, я ў прынцыпе і ня ведаю... А так усё нармальна. Бацькі нагадваюць пра сябе. Мужа ў мяне няма. Памёр ён. Мы былі разьведзеныя, але жылі разам. Ведаеш, што жанчыны ў многім мудрэйшыя і мацнейшыя за мужчын — гэта дакладна. Я ня маю на ўвазе фізычна. Пішы, пытайся, я табе заўсёды з прыемнасьцю адкажу. Я хацела ў цябе спытаць: як ты ставісься да такой перапіскі? Пішы ўсё-усё... На гэтым пакуль спыняюся. З шчырай павагаю да цябе Валянціна.

Х-60. Славіку
Добры дзень, Слава! Ну, вось ты мяне ўчора паклаў спаць, а я яшчэ доўга не магла заснуць. Рэч у тым, што ты мяне паставіў у такое няёмкае становішча. Я так думаю, што ў той вечар наша Ірына сьпяшалася, і таму я так падпісала. Ай, ня буду апраўдвацца, ня варта. Ты правільна думаеш, што я хачу знайсьці сабе сябра. Рэч у тым, што ніколі не прыходзілася мець сябра супрацьлеглага полу. Але ж сяброўства, бывае, з часам пераходзіць у каханьне. Як кажуць, сяброўства — гэта фундамэнт, які пераходзіць у штосьці большае. Ведаеш, я вось не магу падаць сваю думку, не атрымліваецца. Увогуле, ты мне пішы, калі ёсьць жаданьне. З шчырай пав. Валя.

Х-60. Славіку
Слава, прывітаньне! Ты мне даруй за маё доўгае маўчаньне. Я вельмі многа думала... Бо мая маляўка была ў хаце 64, што непажадана. Навошта ты яе туды даваў? Калі цябе што цікавіць, я сама табе адкажу. Тым больш, што я не адмаўляла, што гэта я табе пісала, але замест Валі. І чаму я табе цяпер павінна верыць, што ты ня будзеш даваць чытаць мае маляўкі на абшчак? Мы з табою дарослыя людзі, і давай да гэтага сур'ёзна ставіцца. Проста мне непрыемна, што ў вашай хаце ўсё так выходзіць. Да таго ж я ня ведаю, як пачаць і чым ты дыхаеш: я ў пытаньнях сэксу вельмі тэмпэрамэнтная і таму баюся, што ты мяне няправільна зразумееш. Многія задураны тым, што гэтага нельга, таго нельга... А я аддаюся ўся і таксама люблю даваць асалоду. Здабываць усе вяршыні нашай нястрымнай страсьці. Ну, ты цяпер збольшага ведаеш, чаму я маўчала. Палічыш патрэбным — адкажаш... Цалую. З шчырай павагаю да цябе Ірына.

Славаміру
Слава! Чаму ты маўчыш і ня пішаш? Цалую. З пав. Ірына.

Міламу Славіку!
Прывітаньне, Славік! Ты ўжо мне даруй, але я твой аркушык памяняла на цыгарэту зь фільтрам, бо ў мяне няма курыць. А напісаць мог бы і ты мне першы, бо ты джэнтльмэн. І ўвогуле, пішы, чакаю ад цябе маляўку. Цалую. Ірына.

Славіку
Добры дзень, Слава! Вось крыху вызвалілася ад паўсядзённых справачак і вырашыла накрэмзаць табе колькі радкоў. Пра таго хлопца, што ты ў мяне пытаўся, мне даведацца няма ў каго. Так што дапамагчы табе нічым не магу. Ну, а што да Валі, то я табе вось што скажу... Так, пісала я, але ад ейнага імя, таму што ў яе непрыгожы почырк. Вось такія справачкі, але як ты ня супраць весьці перапіску, дык я табе буду пісаць. Вышэй нос! Не сумуй! З шчырай пав. Іра.

Дарагому і міламу Славаміру...
Мілы! Я захварэла, штосьці кашаль і, відаць, тэмпэратура, бо мне то холадна, то горача. У грудзях усё сьціснула і хрыпіць. Я ведаю толькі адно, што пяшчотай і ласкаю можна было б вылечыць усе хваробы, але гэта каб мы былі не празь сьцены. Ведаеш, Славік, ты вельмі цікавы мужчына, і з табой цікава перапісвацца. А мне цяжка табе штонебудзь напісаць, бо ў многім... Я разумею ўсё, але вось напісаць так граматна і прыгожа, як ты, ня ўмею. А пра тое, пра што я хачу пачуць, ты павінен сам здагадацца. Увогуле, я аддаю ініцыятыву ў твае рукі, і павер, я напішу табе таксама... Толькі вось першая не магу. І яшчэ, ты мне ўчора напісаў, што хто я — акіян ці зямля? Магу адно сказаць: высновы рабіць табе. А ў маёй актыўнасьці будзь пэўны, бо я чалавек не пасыўны. Пішы. Вельмі чакаю. Дарэчы, як наконт маіх просьбаў? Цалую пяшчотна — Ірына.

Дарагому і міламу Славаміру
Прывітаньне, Славік! Вось толькі сёньня адважылася напісаць табе маляўку. Учора вельмі хутка заснула. Я ўжо пісала, што ў мяне тэмпэратура, таму, відаць, і сон змарыў, а яшчэ твая м/в. Слухай, Слава, вось ты каторы ўжо раз пішаш за «сьвяты». Не магу зразумець цябе. А вось наконт таго, што я куру, то каб я курыла дні, месяцы, то можна было б і кінуць, але я куру 18 гадоў. І яшчэ, Славік, я табе пісала, што так пісаць, як пішаш ты, я не магу. Але я табе ня тое хачу сказаць... Было б лепей, калі б ты пісаў прасьцей, бо мне прыходзіцца адказваць табе, і таму свайго красамоўства я ўстыдаюся. Зразумей мяне правільна! Цыгарэт зь фільтрам у нас учора не было. Таму з затрымкай! Што да перапіскі на грунце любові, дык табе ня варта хвалявацца і перажываць, бо тут кожны гэтым жыве. Так яно і павінна быць. І ты сам сабе закон! Вось такія піражкі! Ты ня думай, я зьбяруся з думкамі і напішу табе маляўку такую, як ты чакаеш ад мяне. Ну а ты мне напішы хоць бы за кунілінгуса. Добра? Цалую цябе. З пав. Ірына. Чакаю адказу.

Дарагому Славаміру
Слава, добры вечар! Дзякуй табе за «калёсы», яны вельмі дарэчы. У мяне хворыя пячонка і страўнік. Ведаеш, калі шчыра, то я таксама не журуся, сама па жыцьці вясёлая. Але сумую па дзецях. З тваіх маляваў я зразумела, што табе вельмі падабаюцца жанчыны, ты да іх нераўнадушны. Што да тваёй справы, то, можа, усё будзе нармальна. А сон табе прысьніўся ня вельмі добры, але сьпіцца, то й сьніцца.

Цікава, чым гэта я пачынаю табе падабацца? Пішы, я вельмі чакаю ад цябе адказу. З шчырай пав. — Ірына.

Славіку
Добры вечар, Славік! Ведаеш, тут нічога такога няма, што ты мне задаў такія пытаньні. Але ў мяне гэта ўсё прайшло. Я таксама бываю шчырай і не люблю нешта хаваць, толькі калі добра ведаю чалавека. Сплю я наверсе. Усё, што ты напісаў за Храм каханьня і абрады, мне вельмі цікава. А вось інтым па перапісцы... Баюся, у мяне гэта ня выйдзе. Я аддаю ініцыятыву ў твае рукі, а што там будзе — пабачым. Ты мне, між іншым, не адказаў на тыя пытаньні, што я задала. Відаць, ня лічыш патрэбным. Добранька, чакаю ад цябе адказу. З пав. Ірына.

Славіку...
Ну што, Слава? Думаю, што ты прыстойны мужчына, ня тое, што некаторыя. Я буду табе пісаць, але калі табе нешта не спадабаецца, дык ты мне напішы. Я пішу з усімі падрабязнасьцямі...

Мы ляжым з табой у ложачку тварам адзін да аднаго. Нашы вусны зьліваюцца ў доўгім пацалунку, ты гладзіш рукой мае ногі, сьцёгны... Праводзіш рукой уверх і пяшчотна гладзіш мае грудзі, лашчыш смочкі. Паступова нас ахоплівае жаданьне. Я закідваю адну ножку на цябе, абдымаю рукамі і мацней прыціскаю да сябе. Ты адчуваеш, як мае грудзі прыемна кранаюцца тваіх грудзей, гладзіш маю нагу, попку і мацней прыціскаеш да сябе. Я адчуваю ўсяго цябе. Мы пяшчотна цалуем адно аднаго і ўсё больш распаляемся страсьцю, жаданьнем. Па нашых целах прабягае хваля асалоды. Ты павольна спаўзаеш уніз, і я адчуваю, як твае вусны дакрануліся да маіх грудзей, мяне ахоплівае пяшчотнае трымценьне. Ты гладзіш рукой ножку, попку і пяшчотна цалуеш мае грудзі, бярэш смочак і пяшчотна лашчыш яго языкам, сьціскаеш яго вуснамі і падсмоктваеш. Мае рукі кудлацяць твае валасы. Ты падымаесься ўверх, цалуеш шыю. Нашы вусны зноў зьліваюцца ў доўгім і гарачым пацалунку. Я праводжу рукой уніз па тваім целе, туды... Ты рэагуеш на мой дотык, мацней прыціскаесься да мяне. Ён дакранаецца там, па маёй скуры бягуць дрыжыкі. Мне хочацца дапамагчы яму, мне хочацца, каб хутчэй. Але павольна, павольна, каб мне не было балюча!.. Я абхапіла цябе, твае рукі таксама апынуліся ў мяне пад сьпіной. Няхай яны спусьцяцца ніжэй... Мне так прыемна, хутчэй, хутчэй... На нашыя целы набягаюць хвалі трымценьня, нас запалоньвае асалода. Цалуй мяне ў вусны, песьці языкам вушка. Мы зьліваемся целамі, нас ахоплівае яшчэ большая асалода. Празь імгненьне нашыя целы мацней напружваюцца, ты сьціскаеш мяне. Сьціскай, сьціскай, сьціскай, сьціскай... сьціскай...

Ну, вось на што я пакуль здольная. Чакаю ад цябе адказу. Толькі ня думаю, што мы будзем з табою безь перапынку пісаць. На гэтым усё. Чакаю. Цалую. Ірына.

Жнівень-лістапад 1996 г.

* Гэты матэрыял будзе зьмешчаны ў турэмным дзёньніку «Справа № 182», які рыхтуецца да друку.

ЖАНЧЫНА І ПАЧАТАК ДНЯ

Новы год сустрэў зусім аднабока,
трэцяга студзеня езьдзіў у сваты
да самотнай родам з-пад Налібокаў,
а сёньня ўпарта сьніліся краты.

Устаў ня тое, каб вельмі позна,
хоць і стаміла начная зьмена.
Выходзіў з пахмельля мэдыкамэнтозна,
гатуючы каву, апёк калена.

На дварэ, што праўда, было не
найлепей:
халодны вецер злаваў прахожых.
І тут празь фіранку імжы-халепы
я ўбачыў формы жанчыны прыгожай.

Уся яна была ў маім стылі:
фігура поўная, ножкі таксама.
Рукі жаночыя раму мылі,
твар хаваўся пад валасамі.

То ножку ставіла на падваконьне,
а то і дзьве, напінаючы грудзі.
Уперад імкнулася, як Пагоня,
з галавою, убранай у бі-гудзі.

Я мусіў бегчы па нейкіх справах,
але забыўся, куды й навошта:
ці то на мітынг да быццам правых,
ці то на левы пікет ля пошты.

Дзень паўставаў. Падсыпала сьнегу.
Хмары гарусьціліся на хмары.
Я сеў за стол, разгарнуў Артэгу,
і ўспомніў свае дзіцячыя мары.

24 студзеня 1999 году

ШТО АБ'ЯДНАЕ БОЯЗЬ НЕЗВАРОТНАГА ВЫБАРУ

Працяг з старонкі 1.

Чарнобыльская бяда, якая закранула ўсю нацыю, урэшце засталася прадметам клопату некалькіх энтузіястаў, таго жайца Надсана, які не аднойчы прывозіў зь Лёндану ў пацярпелыя раёны лекі. Штосьці аб'яднаўчае было ў тых, першых Чарнобыльскіх шляхах, а пасьля... Усё ж тонкая гэта матэрыя – аб'яднаньне. Калі яго ня песьціць, не гадаваць з малога, не даглядаць, дык яно можа й не разьвіцца. Тое чарнобыльскае яднань не было вельмі разумовым. Гэта не пажар і не вайна, калі ўсе разам несьвядома ўцякаюць ад небясьпекі. Чарнобыльскую бяду нельга было пабачыць візуальна. Патрабавалася думка, якая б злучала ў адзін ланцужок выбух на АЭС і павелічэньне статыстыкі хваробаў. Думка патрабуецца і сёньня, каб гнеў за дэфіцыт тавараў абрушваць не на прадаўшчыцу ў краме, а на заганную эканамічную палітыку і яе першых праваднікоў. Такая думка сапраўды аб'ядноўвае нацыю. Але ж думка – эфэмэрная па сутнасьці сваёй. Як любілі казаць кіроўцы «Совтрансавто» на беларускіх дарогах, «спасіба ў стакан не нальеш».

Удзельнікі сёньняшняга нашаніўскага абмеркаваньня раскрылі цэлае поле магчымых аб'яднаўчых матываў: ад вайны і эканамічнай бяды – да хрысьціянскіх каштоўнасьцяў. Не магу не пагадзіцца зь імі, але сам для сябе шукаю чагосьці не агульнага, а канкрэтнага, намацальнага, блізкага і адначасова пазытыўнага, таго, што мусіла б культываваць беларуская інтэлігенцыя і адначасова таго, што жыве ў народзе само сабою, не названае ў якасьці аб'яднаўчага матыву.

Нядаўна прыяцель падзяліўся сваім наіўным зьдзіўленьнем. Сядзім, кажа зь сябрам-бізнэсоўцам у ягоным офісе, раптам сябра зірнуў на гадзіньнік, спахапіўся і кажа, пара. Куды – пытаецца мой прыяцель. На вёску, бульбу капаць, – адказвае бізнэсмэн. Якая вёска, якая бульба, у цябе заробак як бюджэт калгаса, купі сабе машыну бульбы й ня кратайся. Бізнэсмэн задумаўся на імгненьне, пасьля паглядзеў на прыяцеля й сказаў: нічога ты не разумееш.

Асабіста я перакананы, што беларусаў найлепей яднае вёска. Ня тыя вычварныя соткі, на якія цэлым нашэсьцем едуць у электрычках сотні тысяч гараджанаў – вынішчальнікаў прыроды, а традыцыйная вёска, зь якой так ці інакш пралягаюць карані кожнага з нас. Адмовіўшыся ад усяго вясковага дзеля таго, каб хутчэй стаць гараджанамі, беларусы амаль страцілі свой самы галоўны аб'яднаўчы матыў. Менавіта здрада вёсцы наймацней разьяднала беларусаў як нацыю. Пра гэта яшчэ раз нагадаў нядаўні выпадак у Маладэчне, горадзе ўчорашніх вяскоўцаў, дзе памерлая бабулька праляжала ў кватэры паўтара гады і ператварылася ў мумію...

Паказальна, што беларусы так і не стварылі сваю гарадзкую культуру.

І тут я зьвяртаюся да прыкладу іншых нацыяў. Скажам, да літоўцаў, у якіх гарадзкая культура – гэта прывезеная ў працэсе урбанізацыі культура вясковая. У клапатлівае нацыі гэтая культура выдатна спалучылася і з дыпляматычным пратаколам і з кампутарнымі навацыямі, а ўрэшце аб'ядноўвае ўсіх – ад малога да вялікага – перад абліччам небясьпекі.

Літоўцы – таксама, як і мы, напачатку стагодзьдзя былі цалкам вясковай нацыяй. Таму іхны прыклад абнадзейвае. Аб'яднацца для нас – значыць, павярнуцца да вёскі і палюбіць яе так, як любілі нашыя продкі.

Сяргей Паўлоўскі

Адам Мальдзіс, культуролаг:

На маю думку, беларусаў як нацыю могуць аб'яднаць агульначалавечыя й агульнанацыянальныя каштоўнасьці, якія знаходзяцца па-за партыйнымі і, можа быць, нават, па-за дзяржаўнымі межамі, але якія могуць успрымацца кожным, хто жыве на беларускай зямлі. Найперш гэта беларуская зямля. Мой сябра Ўладзімер Караткевіч калісьці казаў, што гэтая зямля нам Богам дадзеная, мы яе павінны берагчы ад усялякіх катаклізмаў накшталт чарнобыльскага. Значыць, кожны беларус, які жыве на гэтай зямлі, павінен дбаць пра яе. Другая каштоўнасьць, якая павінна аб'яднаць усіх беларусаў – гэта праца. Беларус ня мае права быць дрэнным гаспадаром на сваёй зямлі. Калі ён дрэнны гаспадар, значыць, ён не беларус, не грамадзянін Рэспублікі Беларусі. Ён перакаці-поле, чалавек, якіх мы добра ведаем і якія нікому й нідзе не прыносяць шчасьця. Трэцяе, вакол чаго мы можам аб'яднацца, – гэта наша спадчына: культурная, гістарычная, моўная. Тым жа Богам нам дадзена беларуская мова, і мы яе павінны шанаваць, зьберагаць і перадаць наступным пакаленьням. Гэта аксыёма, якая не падлягае сумненьню і вакол якой, мне здасцца, павінны аб'яднацца ўсе. Ну, і наступныя каштоўнасьці – хрысьціянскія. Не каталіцкія, не праваслаўныя, не ўніяцкія, не пратэстанцкія, а хрысьціянскія каштоўнасьці, бо мы ўсе хрысьціяне. Той раскол, які ў свой час быў зроблены ня з нашай волі, існуе дагэтуль. Мы ў паўсядзённым побыце дзелім людзей на ўсходнікаў і заходнікаў, на каталікоў і праваслаўных. У той час як мы павінны памятаць, што мы найперш хрысьціяне, а потым грамадзяне сваёй краіны. І апошняя каштоўнасьць – гэта сям'я. Я проста ў жаху ад таго, што ў нас творыцца цяпер. Дзікунства даходзіць да тых межаў, якія раней ніколі не пераступаліся. Кожны дзень я чытаю Беларусаў лучаць уласныя комплексы і расейскае тэлебачаньне.

Агульных комплексаў цэлая жменя. Пераважна гэта комплексы непаўнавартасьці – убогая дзяржаўнасьць, неразьвітасьць нацыянальнае культуры, абмежаванае поле мовы, малая колькасьць і занядбаны стан помнікаў, апакаліптычныя карцінкі экалягічнай катастрофы, якія маляваліся яшчэ да Чарнобыля, і гэтак далей. Ёсьць таксама агульныя комплексы завышанай самаацэнкі – самыя прыгожыя жанчыны, самыя лепшыя жаўнеры, самы працавіты народ, самыя чыстыя вуліцы і дысцыплінаваныя пешаходы...

Беларусаў разьядноўваюць высновы, якія яны робяць з уласных комплексаў. Адныя, напрыклад, гатовыя ўзяць кулямёт і... выправіць сытуацыю з помнікамі. Другія, грэбліва падціскаючы вусны, чакаюць, калі, нарэшце, скончацца гэтыя гульні ў тутэйшую «дзяржаўнасьць» і «самабытнасьць». А трэція, збольшага ўсім задаволеныя, чакаюць, пакуль улады падправяць, умацуюць і «здымуць пытаньні». Ёсьць, вядома і чацьвертыя, і пятыя. Ёсьць урэшце і беларусы бяз комплексаў, што вымушаныя лічыцца зь іх наяўнасьцю ў іншых беларусаў. І ўсе робяць высновы. Зрабіўшы высновы, кожны сваю, беларусы разам глядзяць расейскае тэлебачаньне і зь цікавасьцю сочаць за чужым жыцьцём.

Беды й навалы ня лучаць беларусаў з часоў падзелаў Рэчы Паспалітай. Не злучыў іх, насуперак прагнозам, і Чарнобыль. Наадварот, большасьць жыхароў «чыстых» раёнаў, нібы той маладзён у тралейбусе, які раптам ўтароплівaецца ў вакно, абы не саступіць месца кабеце, імкнуцца не зважаць на бяду пацярпелых.

Харызматыкі таксама ніколі не лучылі беларусаў. Чым большая была харызма ў царкоўнага ці палітычнага дзеяча, тым больш палярныя ацэнкі давалі ім людзі. Для адных Апанас Філіповіч – сьвяты, для другіх – здраднік. Адпаведна, амбівалентна ўспрымалі беларусы і Веньяміна Руцкага, і Язафата Кунцэвіча, і Касьцюшку, і Каліноўскага. Той, хто не дае іншым права на ўласную рацыю, урэшце застаецца сам-насам са сваёй харызмаю. Прыклад: два найбольш яркія й найбольш палярныя палітыкі сёньняшняе Беларусі.

Зь непрыманьня апантанай харызмы вынікае й беларускае непрыманьне апалягетыкі. У сёньняшняй Беларусі нярэдкі прыклад, калі людзі ходзяць адначасова і ў цэрквы, і на малельныя зборы пратэстантаў, як некалі ўняты хадзілі і ў касьцёл, і ў царкву. Беларусаў не яднае рэлігія, бо яны ня хочуць рабіць незваротнага выбару.

Што ж гэтак аб'ядноўвае беларусаў вакол расейскага (падкрэсьлю – не свайго) тэлебачаньня? Па-першае, яго можна глядзець паўсюль і задарма. Па-другое – там ніхто не патрабуе ад беларусаў саўдзелу, а значыць усё можна сузіраць пасыўна, разважаць без напругі. Пасьля, натуральна, лепшая якасьць перадачаў. Па-чацьвертае, ніхто не вярэдзіць там нашых комплексаў, хоць бы з-за палітычнае карэктнасьці. Папятае – апантаная апаляге-тыка розных харызматыкаў там рассыпаецца, прапануючы цэлую палітру думак. І нарэшце, самае прывабнае для беларуса – там у яго ёсьць права выбару на шасьці каналах. Хочаш чаго-небудзь шчымліва савецкага – бяры, чаго-небудзь гарачэйшага – калі ласка.

Беларусаў яднае расейскае тэлебачаньне.

Сяргей Харэўскі

Здымак Дзяніса Раманюка

РАЗЬЯДНАНЫЯ МОВАЙ

Апытаньне на вуліцах Менску

Неяк ехаў я ў тралейбусе па праспэкце Францішка Скарыны. У салёне людзей было што селядцоў. Проста перад выхадам цясьніліся два сталыя спадары, выгляд якіх тактоўна можна было б акрэсьліць як «пакамечаныя інтэлігенты». Адзін спытаўся ў другога на чыстай беларускай мове, маўляў, ці выходзіць спадар на наступным прыпынку. У адказ адбыўся зацяжны істэрычна-агрэсіўны пэрфоманс – што ён у мяне пытаецца?! Я не разумею! Я пацікавіўся, няўжо спадар не разумее беларускую мову? Салён прыціх. Аж раптам некалькі кабет пачалі прасіць мяне «не чапаць мужыка», намякаючы, што ён крыху не ў сабе. Тралейбус спыніўся, дзьверы расчыніліся, і... Беларускамоўны інтэлігент зьнік з «поля бою» ці не хутчэй за ўсіх. Людзі разыходзіліся моўчкі, схаваўшы вочы. Ані слова падтрымкі, ані абвінавачаньняў у нацыяналізме...

Ці можна назваць гэтую сытуацыю тыпова беларускай? Увогуле, што аб'ядноўвае беларусаў? Дакладней, што іх можа аб'яднаць? Гэтым разам я пытаўся ў менскіх мінакоў, ці ёсьць ідэя, якая б магла стварыць зь беларусаў адзіную нацыю?

Вось адказ былога адваката, які некалі ўдзельнічаў у нацыянальна-дэмакратычным руху. Гэты чалавек перакананы, што ідэя для аб'яднаньня ёсьць:

– Можа аб'яднаць ідэя незалежнасьці. Калі ўсе разам аб'яднаюцца і пойдуць біць Лукашэнку, можа, з гэтай нагоды і аб'яднаюцца разам. Нічога станоўчага я пакуль ня бачу. Ну, жаданьне жыць больш годна... Але людзі гатовыя жыць за дзесяць-пятнаццаць даляраў, і пакуль што іх гэта задавальняе...

Цікава, што тыя ж самыя думкі мне выказала несангажаваная ў нацыянальныя колы сталая кабета з вышэйшай гуманітарнай адукацыяй. Яна казала пра патрэбу агульнага ворага, і прыводзіла ў прыклад паваенную Заходнюю Эўропу.

Яшчэ адна канцэптуальная думка. На гэты раз – пятнаццацігадовага школьніка:

– Любоў да ўсіх людзей, каб усе людзі жылі ў міры...

Тры навучэнцы тэхнікуму шчыра зьдзівіліся майму пытаньню. Яны лічаць, што беларусы ўжо ёсьць адзінай нацыяй. Зрэшты, падумаўшы, адзін зь іх ізноў прамовіў слова «вайна». Маўляў, калі яна пачнецца, тады ўсе зразумеюць, хто ёсьць хто. Другі выказаў меркаваньне, што трэба зьмяніць прэзыдэнта. Але адразу ж абмовіўся: «у нас мазгоў ня хопіць». Трэці ўступіў у спрэчку:

– Калі прэзыдэнта зьменіш, усё адно нацыя не аб'яднаецца.

А вось студэнтка, якая стаяла побач, лічыць, што ў нас ёсьць усе шанцы стаць нацыяй. Бо мы аб'ектыўна адрозьніваемся ад суседніх народаў, прынамсі, мэнталітэтам. Яна лічыць, што

НАС?..

ў прэсе, што сын забівае маці, жонка забівае мужа і гэтак далей. Але гэта ўсё залежыць ад першых чатырох каштоўнасьцяў. Мы былі б наіўнымі, калі б думалі, што, даўшы людзям большы заробак, але ня даўшы выразных маральных, нацыянальных арыентыраў, мы нечага дасягнем. Калі мы ня будзем мець выразных арыентыраў, няхай яны называюцца грамадзкімі ідэаламі, дзяржаўнай ідэалёгіяй, наша насельніцтва, якое пакуль што зьяўляецца насельніцтвам, нікуды ня прыйдзе.

Надзея Дударава, адвакат і праваабаронца:

На маю думку, беларусаў сёньня можа аб'яднаць адна бяда. Радасьці няма, толькі жабрацтва, гора, голад, розныя зьдзекі. Не ўсьміхаецца беларус. А вось бяда ёсьць, нават у кожнай сям'і. Бяда расплюшчвае вочы і таму, думаю, яна будзе тым стымулам, які аб'яднае беларусаў у адну нацыю. Бяда аб'яднала беларусаў у другую сусьветную вайну і ў іншых падобных сытуацыях, калі было вельмі цяжка. Можа, такі лёс у беларусаў, я ня ведаю, але, на маю думку, гэта так. Цяжка пра гэта казаць, але калі прыходзіць бяда, прыходзіць і радасьць. І наша нацыя павінна прайсьці празь бяду, каб жыць у радасьці й шчасьці. Я перакананая, што радасьць абавязкова да нас прыйдзе, і на тварах беларусаў абавязкова будзе ўсьмешка, яны будуць усьміхацца так, як усьміхаюцца эўрапейцы.

айцец Аляксандар Надсан:

Калі я апошнім разам быў у Беларусі, на вуліцы да мяне падыйшоў нейкі яшчэ не стары чалавек і спытаўся, каб я паказаў дарогу, я яму сказаў па-беларуску (ён у мяне пытаўся па-расейску): прабачце, кажу, я не тутэйшы, я зь Лёндану прыехаў. Ён на мяне глянуў і кажа: да ты БНФ какой-то! Я адчуў, што быццам першы раз прыехаў у чужую краіну. Але ж я прыехаў на Бацькаўшчыну. Другое такое ўражаньне было, калі да нас у Англію на аздараўленьне й адпачынак прыехалі зь Беларусі хворыя дзеці. І вось адна сымпатычная дзяўчынка па-расейску гаворыць. Пытаемся: а ці можаш размаўляць па-беларуску? Яна сказала: магу. А чаму не гаворыш? Не люблю. Гэткае маладое пакаленьне расьце... Што можа аб'яднаць беларусаў цяпер? Я ня ведаю. Хіба ж вялікая эканамічная бяда толькі. Адзінае, што можа аб'яднаць. Не інтэлігенцыя. Рабочыя. Калі яны зразумеюць, што гэтак больш жыць нельга. Патрэба лепшага жыцьця можа аб'яднаць. І патрэба свабоды, якой цяпер няма. Але пакуль яны добра адчуваюць сябе ў тых абставінах, якія ёсьць... Што можа аб'яднаць Беларусь? Ня ведаю. Нацыянальная ідэя, напэўна, не яшчэ. Яшчэ далёка да гэтага. Можа, з зразуменьнем, што іхная бяда ад таго ідзе, што яны не адна нацыя. Але гэта адбудзецца за гады, не цяпер.

МЁРТВЫ ГОРАД

Паводле статыстыкі за мінулы год насельніцтва нашай краіны скарацілася прыкладна на 25 тысячаў чалавек. На беларускія маштабы гэта не такі ўжо й малы горад. Уявіце сабе, быў Шклоў — і няма. Ці, напрыклад, з мапы назаўжды зьнік Валожын...

Зьлымак Уладзімера Стралкоўскага

Натуральна, гораду, пра які йдзе гаворка, няма й ніколі не было. Але мне няцяжка намаляваць яго ў сваім уяўленьні. Там усё пабудавана з шэрай сылікатнай цэглы. Аднатыпныя дамы, больш падобныя на лягерныя казармы, пара крамаў ды цырульня. Там заўжды стаіць адно й тое ж надвор'е — студзеньская імжа пад бясколерным небам. Жылыя кварталы арганічна пераходзяць у могілкі — галоўную прыкметнасьць гарадка. Вялізныя плянтацыі стандартных новенькіх помнікаў з мармуровае крошкі. Але ні на водным надмагільлі няма ніводнага ймя. Невясёлы, адным словам, атрымліваецца гарадок.

Некаторых жыхароў гэтага гораду я ведаў асабіста. Людзей рознага веку, дабрабыту, сацыяльнага статусу. Гэта сябрук майго дзяцінства, забіты ў п'яной бойцы ўласным татам — рэдкага гратэску, дарэчы, камэдыянтам. Гэта муж дырэктаркі гомельскага Незалежнага тэатру, бяскрыўдны жыдоўскі чалавечак, да непазнавальнасьці замардаваны ва ўласнай машыне нелюдзямі, якіх ён, на сваю бяду, падабраў на начной вуліцы. Гэта й мой сусед на пляцоўцы, малады, талковы кампутаршчык, што надзвычай радасна памяняў Беларусь на Канаду. І яшчэ тысячы й тысячы невядомых мне старых, чый натуральны адыход быў сустрэты альбо з скрухаю — калі сьмерць забірала разам з сабою ніколі ня лішнюю пэнсію, альбо з палёгкаю — калі яна вызваляла квадратныя мэтры жыльля.

Сымбалічна, што гісторыя гэтага мёртвага гораду пачалася з чэрвеня 94-га. Менавіта тады, ад моманту першага вялікага выбару, які ўпершыню за колькі гадоў падараваў гэтай зямлі лёс, пачалося неадступнае скарачэньне яе насельнікаў.

А пройдзе яшчэ адзін год — як чакаецца, больш ураджайны на сьмерці нямоглых і ўцёкі жывых. А за ім яшчэ... І насельніцтва гэтага гораду будзе год за годам толькі павялічвацца. А празь пяць гадоў нас, жывых, ужо будзе менш за дзесяць мільёнаў. Так спакойна й мэтадычна, без вайны й генацыду, мудрая прырода будзе па чарзе адбіраць дзьве тысячы чалавек штомесяц. Тых, што аказаліся няздольнымі пакінуць пасьля сябе зьмену. Чые ймёны забудуцца з той самай хуткасьцю, зь якой яны самі забываліся на свае радаводы...

«Нацыя выраджаецца» — ва ўнісон гучаць усе камэнтары гэтай зьявы. (Некаторыя разумнікі нават падлічылі, праз колькі часу Беларусь павымірае цалкам.) Але мяне патас гэтае высновы не закранас. Таму што ніводзін чалавек ня ведае даты сваёй сьмерці. Нават прысуджаныя да расстрэлу. Але ў прысуджаных прага жыцьця нашмат мацнейшая. Ці ня гэтая дзіўная вайна павінна аб'яднаць нас, чыя мова, чые сымбалі ды ідэалы ўжо які год прысуджваюцца да вышэйшай меры. Каб зьдзяйсьняць прысуд ужо не было каму.

Зьміцер Бартосік

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX стагодзьдзя

Супольны праект "Нашай Нівы" і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

18.00 - 19.30	6000, 6170 7155, 7295,	49 41
22.00 - 23.00	6010, 6025, 6170, 7155	49 41
06.00 - 07.00	5995 7275, 7295 9750	49 41 31

Паштовы адрас: **220005, Менск-5, п/с 111**
Беларускую праграму можна слухаць у Інтэрнэце: **http:/ www. rferl.org/ bd/be/index.html**

Заставайцеся са Свабодай!

ЧАРГОВАЯ ХЛУСЬНЯ

мусіць мінуць час.

— Напэўна, тут нават не ідэя, тут патрэбная дзяржава, патрэбная ўлада.

Мілая дзяўчына прывяла ў прыклад Івана Жахлівага, Сталіна і Піначэта.

Напрыканцы я зьвярнуўся да дваццаціпяцігадовага хлопца. Ён сказаў, што беларусы аб'яднаюцца, і жыць будуць нармальна, і прэзыдэнта выберуць іншага:

— Не бабулькі яго будуць выбіраць, а тыя, хто хоча тут жыць нармальна.

Нармальна жыць, а што яшчэ трэба для шчасьця?!

Ідэя дабрабыту. За час апытаньня выразна яна прагучала толькі адзін раз. Але і ў іншых адказах час ад часу мільгаў цень гэтай думкі. Я згадваю, як у 1992–93 гадох у тралейбусным упраўленьні кіроўцам, якія аб'яўлялі прыпынкі па-беларуску, павышалі заробак на дзесяць працэнтаў. У тыя часы ў грамадзкім транспарце наша мова гучала часьцей.

Севярын Квяткоўскі

Пытаньне гэтае ня менш страшнае, чым адказ на яго. Гляньма ў гісторыю: праўдзівыя ідэі й памкненьні лепшай часткі цэлых пакаленьняў беларусаў сканчаліся правалам... Касьцюшка, Лялевель, Каліноўскі. Браты Луцкевічы, лідэры БНР і слуцкія ваяры. Далей: сябры падпольных рухаў рознага кшталту, якія йснавалі ў Беларусі пасьля вайны, беларуская эміграцыя і, урэшце, Беларускі Народны Фронт.

Што аб'ядноўвае пералічаныя ймёны й зьявы? — Чысьціня і Праўда... З другога боку, цэлыя сьціжмы здраднікаў, хлусаў, халуёў і падхалімаў, карацей — Бруд і Мана. І насуперак усялякім лёгікам адукаваных і разумных, насуперак чалавечай маралі, яны — гэтыя Бруд і Мана заўсёды перамагалі. У Беларусі мала шанцаў выйграць хаця б якую прыстойную будучыню для народу ў таго, хто думае пра народ.

Мы любім спасылацца на ўрокі гісторыі. Дык гляньма ж ёй у вочы і прачытаем: выйграе той, хто хлусіць, і чым хлусьня бруднейшая, тым болей у манюкі шанцаў на перамогу. Сёньняшняе становішча Беларусі — яскравы доказ... Насельніцтва аб'ядналася вакол прэзыдэнцкай маны. Яно не хацела ні культуры, ні мовы, ні маралі. Дакладней, яно ставілася да іх абыякава, бо хацела хлеба, дываноў, упэўненасьці ў заўтрашнім дні.

Аб'яднаць сёньняшніх беларусаў можа толькі чарговая мана. Іншая справа, куды яна павядзе гэтыя аб'яднаныя масы.

У дзяцінстве мы захапляліся казкамі. Дзяцінства прайшло, а мы ўсё спрабуем жыць паводле казачных законаў. Мы ўпэўненыя, што дабро перамагае зло і што сапраўды нехта заб'е Цмока, нехта павешае на неба месяц і сонца. Мы верым, што «з рога ўсяго многа» і што певень абавязкова адбярэ ў пана жаронцы. Нам падабаецца кавалак тканіны, на якой намаляваны непраўдзівы агонь, а над ім непраўдзівы чоп зь непраўдзівай ежай. Бо мы ведаем, што за гэтай маной ёсьць чароўныя дзьверы. Варта толькі знайсьці залаты ключык... Тата Карла разам з Бурацінам увайшоў у тыя дзьверы і, што зь ім сталася, мы ня ведаем. Затое ведаем, што тата Карусь ужо ніколі гэтага ключыка ня знойдзе. Але ён упарта верыць у ягонае йснаваньне, а таму спадзяецца.

І апошняе: сёньняшнія сьветлыя галовы Бацькаўшчыны ніколі не апусьцяцца да маны самі й ня прымуць яе ад іншых, а гэта значыць, што насельніцтва ізноў аб'яднаецца вакол чарговай хлусьні...

Сяржук Сокалаў-Воюш

ГРАМАФОН

старонка вершаванага радка

Аліцыя

***

Скрозь сон я адчуваю дотык лёгкіх рук.
Знаёмае да болю пачуццё сьціскае
грудзі.
Я ведаю: калі расплюшчыць вочы, зноў
ня будзе
Нікога побач. Любы неасьцярожны рух
Зьнішчае ўмомант нетрывалыя малюнкі
розуму,
Якія я пасьпею збудаваць у роздуме
Пра будучыню і мінулае сваёй краіны.
Мне прыйдзецца пакінуць ложак і
пабегчы
На вуліцу... Пад'езду цёмнага шурпатыя
цагліны
І брудны двор штораніцы вітаюць
напамінам:
Дзе я жыву. Калматы і стары сабака,
нібы
сьледчы,
Сумленна аглядае кожнага, хто выйдзе з
дому. Я
палю.
Маўклівы сьнег кладзецца коўдраю на
чорную
зямлю.

РАЗЬВІТАНЬНЕ

Як лёгка крок зрабіць у небыцьцё...
Даруй мне. Я памерці не хацела.
Але згубіўшы веру, страціла й жыцьцё.
Я безнадзейна на любоў хварэла.
Мае старыя рэчы складзены ў мяхі,
Лісты і карткі параскіданы наўкола.
Перада мной усе расчынены шляхі,
А маці плача, апусьціўшы голаў долу.
За небакрай сягнуўшы птушкай белай,
Я адлятаю моўчкі, нібы ў сон.
Я бачу срэбныя званы над вежаю
згарэлай,
Людзей, што крыюцца пад парасон.
Нічога не шкада, бо мэтай ёсьць
свабода!
Жывіце доўга, толькі безь мяне.
А я змагу наверсе папрасіць у Бога,
Каб даў спакой і шчасьце роднай
старане.

Андрэй Аляксандраў

***

Страх пра сябе нагадвае
Раптоўным зьнікненьнем сьвядомасьці.
Я некуды падаю, падаю,
Забыўшыся на розныя ўмоўнасьці,

Забыўшы размовы сытыя
І выракшыся рэчаіснасьці.
Я крочу шляхамі разьбітымі
Да годнае непахіснасьці.

Ў паветры бліскуча-матавым,
Якое казыча ветразі,
Плыву і павольна падаю
У мяккія лапы вечнасьці...

НОЧ У ПОЛАЦКУ

Брытвай холаду
Рэжа гарачыя вены каханьня
Прадчуваньне зімы.

Падарыла мне
Шэрасьць бязьмежнага злога маўчаньня
Напаўмёртвыя сны.

Горад стомлены
Сьпіць ціха, ўхутаўшыся ў неабсяжнасьць
Небасхілу і зор.

Хмары чорныя
Плачуць паўзмрокам, халодным і
страшным,
На Сафійскі сабор.

Ноч у Полацку...

Аляксандар Антончык

ДЫСЭРТАЦЫЯ

Вучоны баран дысэртацыю піша
На вопытах уласных амаль ужо год –
Як можна зайсьці на падворак уласны,
Прабіўшы ілбом створкі новых варот.

Ён стойкасьць слупоў улічыў пры
разьліках
І сілу удару, і рога загіб,
І пругкасьць, і моцу завесаў жалезных,
І дошак габлёваных нават прагіб.

«Калі я зайду гэтак у двор, – баран
марыць, –
Прыйдзе у захапленьне вясковы народ,
Ад зайздрасьці певень у еўнухі пойдзе,
І ссохне ля масла абжорлівы кот.

На свой ганарар, за мазгі атрыманы,
Куплю каня з брычкай, аўса для сяброў,
Авечцы ж сяброўцы кажух адмысловы
І пацеркі белыя з воўчых зубоў».

Казёл ў агародзе, капусту жуючы,
Адгадку шукаў на лытаньне дарма –
Чаму яго сябар ілба не шкадуе,
Вароты то ёсьць, але ж плоту няма.

Таццяна Барысава

***

Хачу растаць
у руках тваёй пяшчоты,
узрушана-салодка затрымцець
ад пацалункаў прагных,
ад употай
сказаных словаў,
што пачуты ледзь.
Ад подыху твайго
і ад каханьня,
сабраць увесь хмель
і не адчуць, калі
ціхое і абыдзеннае раньне
зіхоткліва зайграе
на зямлі.

***

О, сябра мой,
даруй мне гэты кветкі,
каб шчэ ня раз
ад куль абаранілі,
калі зь вясновым
абуджуся ветрам
да здабыцьця
Забранае Краіны.
Тры гвазьдзікі –
пунсовыя галовы,
бы камячкі
скрываўленыя плоці.
Даруй жа іх –
варожы чую подых!
Даруй жа іх –
курок ужо на ўзводзе!

***

Хаваюся ад успамінаў.
Яны – клінок ў маю сьпіну.
І нікне прага да жыцьця.
Жадаю толькі забыцьця.
Яшчэ – збавеньня ад пакуты,
бо сэрца да крыжа прыкута.
Усё набрынялае крывёй,
паціху выціскае боль.

СЫНУ

Ты яшчэ будзеш лашчыць
тонкае гольле дрэваў
і ўглядацца ў неба,
шукаючы сваю веру.
Ты яшчэ будзеш дыхаць
водарам крыгаходу,
памятаць доўга сьвежасьць,
што пацалункам лёду
ляжа табе на вусны
і апячэ балюча.
Ты яшчэ будзеш мужным,
велічным і неўміручым.
Зьведаеш Зло і Каханьне,
зьведаеш слова «Жанчына».
Хай жа тваё спазнаньне
доўжыцца без спачыну.

Аляксей Бацюкоў

НОЧ ШЫПШЫНЫ

Змоўклы твар памерлага
я накрыю хусткаю.
Я на ёй ружовыя
вышываю ўзоры.
Ніткаю тканіну
працінаю белую.
Вышываю ціха я
казку беларускую.
Вочы тонкім крыжыкам,
вусны доўгай дзідаю.
Панясу я хустачку
на гарун-гару.
Будзе дзіва дзіўнае
ў ноч шыпшыны й полымя –
як наліты бронзаю
ўстане беларус.

Людміла Гулюк

***

На мокрым асфальце шэрыя цені,
Як быццам у пустым і заблытаным сьне.
Яны паўстаюць, бы маркотныя сьцені,
Спыняючы крок чаканай вясьне.

Яны ўсе – фантомы, яны хутка
зьнікнуць,
Адразу, як толькі скончыцца слота,
І першыя промні сонца пранікнуць
У сьвет, дзе пануе ад цемры істота.

Іх брудныя боты хіба што пакінуць
Сьляды на гэтай гаротнай зямлі,
Якія ня хутка адсюль яшчэ зьнікнуць.
А ў блакітных нябёсах ўжо бачны агні...

***

Спыніся, імгненьне часу!
Адчуй недарэчнасьць быцьця,
І гэтую шэрую масу –
Вядзі да яе ж канца.

Іх крокі упэўнена рушаць,
Стаптаўшы сьвяты запавет,
І брудныя рукі душаць
Свабоднае думкі сусьвет.

Мінаюць гады і стагодзьдзі –
Іх лёсы сыдуць у нябыт,
І зьнічкай мільгне ў разводзьдзі
Іх прывідны злы дабрабыт.

***

Гаркаваты водар вяргіняў
І зімы надыходзячай подых –
Час згасаючых успамінаў
І надзеі ледзь чутны дотык.

Яны хутка завянуць і зьнікнуць,
Навяваючы толькі смутак,
І міжволі яны пакінуць
Чараду патаемных думак.

Час няўмольны бяжыць і зьнішчае
Прыгажосьць і агіднасьць разам,
Але нас гэта не закранае –
Дыялёг прыпыніўся з часам.

Дзед Карней

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУХНЯ

(з цыклю «Супольнасьць»)

Купава, Баршчэўскі, Вячорка
Ў «McDonalds» зайшлі надвячоркам.
Баршчэўскі, Вячорка, Купава
Спыталі біг-макаў і кавы.

І воу паглядзеў на Вячорку,
Нібы той аб'еўся махоркі,
А потым зірнуў на Купаву,
Спрабуючы «ўехаць» – у чым справа?

Што гэта, прабачце, за мова
І як зразумець іх замову?
Настойвалі дзядзькі ласкава:
«Мы просім канапак і кавы».

Баршчэўскі дадаў: «Is it clear?»
Вячорка ўсьміхаўся маўкліва.
Воу ціха падумаў: «Вар'яты!»
Й гарачай ім даў чакаляты.

На гэта зьдзівіўся Купава:
«Шаноўны, дык гэта ж какава!»
І грукнуў нагою Вячорка
(А быў ён падобны да чорта):

«McDonalds» – ня строма, ня крута,
Ня ешце, панове, атруту!
Хадземце, спадарства, ў «Бульбянікі»,
Кісель будзем есьці і дранікі!»

ШЛЯХАМ ШЫДЛОЎСКАГА

Хоць пра гэта газэты маўчаць
(Там пра іншае пішуць, смакуючы),
Я пра гэта хацеў бы пісаць,
Ды балёнчыка з фарбай бракуе.

Дык сьцізорык сьціскаю ў руцэ,
Фарбу з дрэва зьдзіраю уларта.
І мой надпіс «Жыве Беларусь!»
Ў школе зьведае кожная парта.

Станіслаў Карпаў

ПАХАВАНЬНЕ

І я свае хаўтуры ўбачыў,
І несьлі маю труну бязвокія,
Апошняя музыка стала плачам,
Ды дрэвы неба аралі высокае,
І несьлі маю труну нямыя.
І я быў нябожчык, пазбаўлены мовы,
Бо ў сваім мінулым жыцьці я
«Разговаривал» – брудныя словы...
Я збоку бачыў, як закідалі
Маё счарнелае цела касьцямі,
І разьвітальнае прамычалі
Нямыя.
Сьляпыя зазьзялі вачамі.
А ў цемры асфальта, у горадзе хворым,
Глухія спрачаліся самі з сабою
І паміралі, хаваючы сорам
Зямлёю.

Марыля Лагодзіч

***

У горадзе тваім дождж,
а на душы – сьнег.
Мы разышліся, што ж.
Хворыя цені – грэх.

Мы разышліся ў змрок
тонкіх пачуццяў жыцьця.
Побач апошні крок –
і краявід небыцьця.

Побач апошні вальс
вуснаў тых трапяткіх.
Наш бесклапотны час...
Наш сарамлівы ўздых...

Наш бесклапотны дзень
граў парафраз мрой...
Твой захварэў цень.
Цень разьлюбіў мой.

І падышоў скон,
і адступіў страх.
Хворыя цені – сон...
Бэзавых вуснаў пах...

Янка Лайкоў

***

Спіш, Айчына мая, схаваная
Пад навалай ільдоў. Слухаем,
Як балесна ты трызьніш ранамі,
Бо нясьцерпна табе і глуха нам,

Глыб халодны к грудзям цісьнецца,
Засьціць вочы мярзэка стылая...
Сінявокая ты наша Кніжніца,
Як цябе ацаліць, мілая?

Чым здалець аковы зімовыя,
Як аблегчыць пакуты цяжкія?
Словамі? Аднялі мову ў нас...
Ласкамі? Самі зубамі ляскаем,

Самі ходзім у прымах, гнаныя,
Пад дзьвюма дзюбамі пільнымі,
Кайданамі маны зраненыя,
Безь ніводнай віны павінныя...

Вера Ліпская

***

Аб сабе нагадае восень
Недакучліва, жоўтым лістком...
Пад узорыстым ручніком
На купе залатое калосьсе.

Адзьвінелі на вёсцы дажынкі,
Студзіць росы Арэхавы Спас,
Лета стомленае ад нас
Серабрыстай ляціць павуцінкай.

Пахнуць яблыкамі падворкі,
З бульбянішча цягне дымком,
Туманоў густых малако
П'юць начамі месяц і зоркі.

Зноў зьбіраюцца птушкі ў дарогу –
Вандраваць па чужых краях...
Верасовым раньнем і я
Ў сьвет шырокі ўзьлячу ад парога.

***

І зноў, нібы ў зачараваным коле,
Я крочу ад надзеі да адчаю...
Няўжо дае такую Неба долю?
Здаецца, безнадзейна зноў кахаю.
Кідае лёс, як па старым сцэнары,
Ў абдымкі адзіноты безь літосьці,
Гарыць дашчэнту ў барбарскім пажары
Палац, дзе ты
Мог быць жаданым госьцем...
Мне б за табой ляцець у змрок
растаньня,
Ды толькі болем надламаны крылы,
Мне б сонцам запаліць тваё сьвітаньне,
Але баюся, што ня стане сілы.
І толькі цень прыдуманага шчасьця...
Струна душы гатова абарвацца.
Мне б на шляху крыжовым не упасьці,
Баюся, больш ня здолею падняцца...

Алесь Папоў

***

Ён кахаў
Мадэрну сьпевы
Ён блукаў
У цямрэчы моўчкі
Спадзеючыся на бясьпеку
Ты жадаеш
Ведаць назвы
Тых каго сустрэў раптоўна
Ён чакае водар куляў
Ды нязвыклага натхненьня
Ты яго
Шукаеш вельмі
Ён табе
Навошта трэба.

Адам Рахманы

***

Ў натоўпе плынным,
які нас забыўся,
твой твар шукаю.

***

Сьпеў дзіўны флейты
ў падземным пераходзе.
Твая усьмешка...

***

Хутчэй прэч з дому,
у вечар шпацырую...
Я зноў сапраўдны.

***

Так, я тут быў:
наўкола прыкмячаю
старыя думкі.

THE BEAUTY AND THE BEAST

Да М.

На высьпе маёй ты зусім выпадкова,
Шукальніца сэнсу, пачуццяў красы.
Ды гэта ня спыніць жыцьця майго кола –
За сьпінай адчую самоты часы.

Бясконцыя дні у чаканьні Любові
Трымалі шораз на шляху да яе,
Няпэўнасьць жыцьця паглынала паволі
Бясплённыя думкі і дзеі мае...

Ты бачыла твар мой, слоў марных
даволі;
Дарма меў надзею – ня зьняты праклён.
На высьпе Самоты я з боскае волі,
Ды маю што несьці праз плынь шэрых
дзён:

Пагляд твой – сяйва горніх зорак уночы,
Твой голас напеўны, бы птушкі ў гаі.
Крыніцы празрыстай, што бачылі вочы,
Мой Божа, ня дай мне забрудзіць вады.

Алена Шарэпа-Лапіцкая

***

Уначы збудзіліся ад сну
І запяялі ў доме нашым скрыпкі,
І абудзілі яны расахатую сасну
І ў сасоньніку дзьве маладыя ліпкі.

Зьвінелі скрыпкі... Плакалі яны,
Сабе прасілі літасьці у неба,
А зь цемры адгукаліся званчэйшыя
званы,
Казалі скрыпкам: «Паміраць яшчэ ня
трэба».

Дрыжэлі айстры... Ціхія кляны
Рассыпалі наўкол рознагалосьсе,
Бурштынамі лістоў заткалі дываны,
Каб марам поўначы ўрачыста йсьці
прыйшлося.

І мары завіталі чарадой
Над соснамі, царквой – аж да нябёсаў...
Алешнік гаманіў, зацягнуты імглой,
І ночка плакала дажджом бліскучых
сьлёзаў...

Аляксей Шыдлоўскі

СПАТКАНЬНЕ

Трэба хутчэй зьбірацца,
Бо ўжо выклікалі.
Мяне выклікалі на спатканьне.

Апрануў штосьці прыстойнае,
Але хто там глядзіць на вопратку?
Там глядзяць у душу.

Па даўжэзных халодных калідорах.
Ланцужком, адзін за адным.
Рукі трымаем за сьпінаю.

Кожны жадае хутчэй,
Але ніхто хутчэй ня йдзе.
Проста бракуе моцы.

Прыйшлі. «Прывітаньне, мама!»
І ўсё, цішыня бязь сьлёз.
Сьлёзы даўно высахлі.

«Ну, як ты, сыну?» – «Добра.
Трымаюся. Што хакей?»
«Хакей... нават ня ведаю.»

Лезе ўсякае глупства,
Галоўнае ўспомню пасьля.
Час выйшаў. Сыходзім...

Прапаршчык зачыніў дзьверы.
Зноўку ў камэры. Чакаю.
Наступнае спатканьне празь месяц...

Мікола Яўмененка

І БОГ ЗАЎВАЖЫЎ

Чарнобыль больна нас ударыў.
Мы болей стратаў панясьлі
Ад радыяактыўных хмараў,
Што тут саджалі маскалі.

Саджалі, бо хоць і марудна
Тады дзьмуў вецер на Маскву.
Масква ж ня любіць пыл атрутны,
А беларусы зь ім жывуць,

Ядуць сумленна зь ежай стронцый
І п'юць напоі з цэзіем,
Яны ў забруджанай старонцы.
Да Бога ў іх – прэтэнзія.

Каля трох чвэрцяў тут асела
Сьмяротных брудных рэчываў.
Чаму Бог так няроўна дзеле?
Няхай бы – як пры Брэжневе!

І Бог заўважыў беларусам:
«Вы ж на Маскву маліліся
І зараз зь ёю – у хаўрусе.
Няўжо вы памыліліся?

Тады вяртайцеся ў Эўропу!
Там вам змагу дапамагчы,
Там вераць Богу ці Прароку,
Там і прыстойнасьць не маўчыць.

Там Канстытуцыю шануюць,
Бракуе гвалту і ілжы.
Там Дэмакратыя пануе,
А не дыктатарскі рэжым:

Дзяржава друк пэрыядычны
На самастойнасьць аддае,
Не на паперы, а фактычна
Падзел уладаў існуе».

Ź.Jaryła

NIAMA VIARTAŃNIA

Daruj mnie svaju cnotu —
Ja jaje złamlu;
Dastań mnie svajo serca —
Ja jaho zžaru;
Addaj svaju dušu mnie —
Ja ž jaje spalu
Vahniom svajho kachańnia.
Ciabie z usim načyńniem
Ja niekali zhłynu;
Piakielnym dzikim juram
Da spodu skałanu...
Nia ūbačyš bolej śvietu —
Ja ū vir ciabie ściahnu,
Adkul niama viartańnia.

РЭПАРТАЖ ЗЬ НЕДАЭЎРОПЫ ЎЗОРУ 1991 ГОДУ

Anne Appelbaum. Between East and West. Across Borderlands of Europe. — London, 1995.*

Ці сапраўды мы разумеем сытуацыю ў нашым рэгіёне лепш, перабываючы ў ёй тут і цяпер, ня будучы аддаленымі ад яе ў часе й прасторы? Постмадэрністы даюць досыць просты адказ: тое, як мы разумеем ці ўяўляем пэўныя грамадзкія зьявы, вызначаецца культурай грамадзтва, у якім мы жывем; у межах кожнага грамадзтва могуць існаваць свае праўды, якія неабавязкова будуць суадносіцца з праўдамі іншых грамадзтваў. Усе аднолькава маюць рацыю, і ніхто не памыляецца. Калі гэтыя асобныя «праўды» супярэчаць адна адной, дык няхай супярэчаць. А шукаць, чыя праўда больш правільная — гэта грашыць проці правілаў сучаснай інтэлектуальнай моды й палітычнай карэктнасьці.

Бяда ў тым, што гэты «постмадэрны» рай усеагульнага паразуменьня й талеранцыі населены толькі невялічкай групкай інтэлектуалаў, чые працы мала хто чытае, а з тых, хто чытае, мала хто разумее. Па-за раем застаюцца мільёны іхных больш простых суайчыньнікаў, якія мысьляць зусім іншымі катэгорыямі. Гэтыя небаракі вераць, што праўда можа быць толькі адна, працягваюць гаварыць аб прагрэсе і адсталасьці, пра аб'ектыўнасьць падзелу на «дзяржаўныя» й «недзяржаўныя» нацыі — адным словам, паўтараюць увесь той інтэлектуальны мэтлух, які больш пасуе канцу XIX, чым XX ст.

Гэтыя сумныя думкі міжволі лезуць у галаву падчас чытаньня кнігі Анны Эплбаўм «Між Усходам і Захадам: праз памежжа Эўропы». Кніга напісана ў жанры падарожных нататак і перадае ўражаньне ад вандроўкі ўскраінамі Савецкага Саюзу — ад Калінінграду да Адэсы, празь Літву, Беларусь, Украіну й Малдову — у апошнія тыдні яго існаваньня.

Анна Эплбаўм ведае, пра што піша, яна поўная сымпатыі да тых народаў, якія жывуць на заходнім памежжы былога Саюзу, але адначасова складаецца ўражаньне, што яна трохі паддалася спакусам арыенталізму. У яе расповядзе няма ніводнага нармальнага героя — у кожнага ёсьць нейкая сутнасная загана. Сымпатычная бабулька-немка з Калінінграду баіцца ня тое што распавесьці пра савецкія зьверствы над нямецкім насельніцтвам тагачаснага Кенігсбэрга пры канцы вайны, але нават прызнацца, што яна нямецкай крыві. Літоўскі манах сьцьвярджае, што літоўцы разумеюць Хрыста лепш, чым любая іншая нацыя. Польская акторка прыехала з Варшавы ў Наваградак па запрашэньні мясцовых палякаў пачытаць вершы іх вялікага земляка Міцкевіча, і пад канец літаратурнае вечарыны дзякуе ім за тое, што яны бароняць польскія тэрэны ад беларускіх прэтэнзіяў. Малады беларускі інтэлектуал вывучыў ідыш ды іўрыт чыста зь любові да жыдоўскай культуры, але ня можа паразумецца з амэрыканскім хасыдам, якому чытаньне любой кніжкі, апроч Торы, здаецца марным заняткам і для якога не існуе розьніцы паміж Беларусяй і Расеяй. Украінскі прафэсар-паліглёт зь Літвы ведае сьвет анэкдотаў пра іншыя народы й землі, але яму цяжка патлумачыць, што такое Ўкраіна. Кожны зь яе суразмоўцаў трохі дзівак; усе разам яны ствараюць уражаньне пра гэтую частку сьвету як пра гэткае Залюстроўе, дзе ўсё перакуленае і стаіць на галаве.

Тэма амаль усіх размоваў, як і аўтарскага апавяданьня — нацыянальная саматоеснасьць народаў, што жывуць між Балтыйскім і Чорным морамі. Кніжка Анны Эплбаўм каштоўная акурат тым, што перадае настрой лета 1991 году, прычым часта — у непрыхаванай і вельмі цынічнай форме. Яе суразмоўцы адкрыта гавораць пра тое, аб чым часта не наважваюцца заяўляць нацыянальныя лідэры — костка ад косткі свайго народу.

Літоўцы ў Вільні ды палешукі ў Берасьці пераконваюць аўтарку, што варта толькі ім атрымаць палітычную незалежнасьць, яны апярэдзяць у эканамічным разьвіцьці лянівых, непаваротлівых і вечна п'яных украінцаў і беларусаў, ужо не кажучы пра расейцаў. Прыблізна гэтак жа гаворыць пра ўкраінцаў гаспадар львоўскага «Гранд-атэлю Геншафт» — былы савецкі жыд, які ўжо даўно здабыў сабе незалежнасьць, атрымаўшы амэрыканскае грамадзянства на падставе нібыта нацыянальных ганеньняў на сваёй былой радзіме («Калі я гляджу на яго, — піша Анна Эплбаўм, — мне робіцца шкада ўсіх тых людзей, якіх сапраўды перасьледуюць, але якім амэрыканскія візы не па зубах»). Для дробнага гандляра расейца Дзімы, які перапрадае ў Стамбуле купленае ў Адэсе, усе краіны, пабачаныя аўтаркай — Літва, Украіна, Беларусь — несапраўдныя, усе яны проста прыдумка. Рэальныя толькі Расея ды Захад.

У самахвальскім хоры кандыдатаў на «эўрапейскасьць» найслабей чуваць беларусаў ды ўкраінцаў. Іх галасы гучаць глуха або не зусім упэўнена, гэтак жа хісткія і іх ідэнтычнасьць, і іх месца ў Эўропе. Бо Эўропа — гэта не Савецкі Саюз: там нельга паказвацца без уласнай тоеснасьці, традыцыі, культуры.

Аднак гэта не азначае, што яны адракаюцца пошукаў. Як па-мойму, адно з найцікавейшых месцаў у кнізе — размова аўтаркі з маладым беларускім паэтам Ігарам.

«Мы — постмадэрністы», — мякка прамовіў Ігар. Яго чорныя валасы былі сабраныя назад. Яго вочы сьлязіліся ад таго, што ён зашмат чытае. Яго твар быў бледным ад таго, што ён занадта сядзіць у хаце. «Ці ты чула пра Гайдэгера?»

Я сказала, што так.

«Ці ты чула пра Фуко?»

Я сказала, што так.

«Тады ты павінна зразумець, што Беларусь — гэта ідэальная постмадэрнісцкая краіна», — у Ігара быў цалкам сур'ёзны твар, толькі час ад часу ён міргаў.

«Я ня ўпэўненая...»

«Глядзі: постмадэрнізм — гэта пра новае авалодваньне мінулым, пра ператварэньне фальшывай сьвядомасьці ў сапраўдную, пра перацэнку вартасьцяў. Дагэтуль мы жылі тут у фальшываванай культуры, абложаныя масава прадукаваным, — ён паціснуў плячыма, каб знайсьці слушны пераклад, — кітчам. А цяпер прыйшоў час адкінуць гэты кітч і замяніць яго чымсьці сапраўдным».

...«Кітч, — паўтарыў ён. — Яны далі нам сфальшаваную сялянскую культуру: фабрычнай вытворчасьці лялькі для турыстаў, танныя драўляныя лыжкі. І ўвесь гэты час яны руйнавалі сапраўдную сялянскую культуру, зачынялі майстэрні, вымушалі людзей закідаць заняткі скульптурай і ўступаць у камуністычную партыю».

Ігар сказаў, што цяпер адраджэньне беларускай культуры залежыць ад гараджан: *«Мы мусім сьпяваць народныя песьні на інтэлектуальных тусоўках. Мы мусім чытаць народную паэзію. Мы мусім, калі патрэбна, наноў вынайсьці традыцыю там, дзе мы забыліся на яе».*

Жонкі Ігаравых сяброў таксама бралі ўдзел у перацэнцы вартасьцяў, насілі вышытыя свайміі рукамі фартухі й гатавалі традыцыйныя стравы, апраналі дзетак у народныя строі ды вывучалі беларускую мову».

Цяпер, з вышыні сямі пражытых пасьля тых падзеяў гадоў, мы знаем, што большасьць з гэтых намаганьняў пайшлі на марна. Шкада фартушкоў і змарнаванага маленства. Палітычны рэжым Лукашэнкі можна характарызаваць па-рознаму, але нацыянальнай дзяржавай яго нікому ня прыйдзе ў галаву называць. Натомест Беларуская Народная Рэспубліка, зноў актуалізаваная пасьля эміграцыі Зянона Пазьняка, застаецца пакуль яшчэ адной «вынайдзенай», але пустой традыцыяй. Застаецца няясным, аднак, ці беларускія постмадэрновыя будаўнікі нацыі пацярпелі паразу таму, што былі беларусамі, ці таму, што былі постмадэрністамі? Чаму ў адных выпадках і ў адных народаў «вынайдзеныя» традыцыі прышчапляюцца на нацыянальным грунце, а ў іншых застаюцца пустой фантазіяй?

Анна Эплбаўм не дае адказу на гэтае пытаньне. Яна яго нават і ня ставіць, зьберагаючы вернасьць жанру — цікаваму, але інтэлектуальна ня надта патрабавальнаму рэпартажу пра вандроўку Ўсходняй Эўропай.

Яраслаў Грыцак

Пераклад з украінскай паводле месячніка «Крытыка»

Яраслаў Грыцак – прафэсар Львоўскага ўнівэрсытэту, доктар гістарычных навук, аўтар кнігі «Нарыс гісторыі Украіны: фармаваньне мадэрнай украінскай нацыі» (1996).

АПОШНІ ЖАЎНЕР

TU BYŁA POLSKA

Władysław Strumiło, Tu była Polska, Wyd. polskie w Wilnie, Вільня—Варшава, 1999, 140 с.

29 студзеня ў Вільні адбылася прэзэнтацыя кнігі Ўладзіслава Струмілы, былога рэдактара віленскага пэрыёдыку «Nasza Gazeta», былога аўтара «НН», аўтара шматлікіх беларускіх перакладаў зь нямецкае й польскае. Назву кнізе даў рэпартаж, які Струміла зрабіў, шукаючы на абсягах колішняе Віленшчыны сьлядоў вэтэранаў верасьня 1939. Гэтыя людзі, якія сьведама вярнуліся ў Савецкую Беларусь, заставаліся па вайне пазбаўленымі вэтэранскіх пэнсіяў і льготаў таму, што «змагаліся за паноў». А яны былі перакананыя, што змагаюцца за сваю зямлю. Яны вымушаныя былі хаваць баявыя ўзнагароды за Варшаву, Бэрлін, Монтэ-Касіна. Маналёг «апошняга жаўнера», вэтэрана «верасьнёўца» Найдзіча з Солаў, склаў асобную частку рэпартажу. У іншай частцы — караценькае эсэ аўтара пра Астравеччыну, пра сваіх крэўных, якія да скону мроілі тыя гады, калі не было калгаснага бязладзьдзя і савецкага вандалізму. Струміла аб'ехаў родныя мясьціны з кніжкаю земляка, Адама Мальдзіса, у руках. Гэтая кніга, «Астравеччына — край дарагі», выйшла больш за дваццаць гадоў таму, а Астравеччына не зьмянілася. Толькі дзеці цяпер крычаць «пшэкі, пшэкі» усьлед падарожнікам, што гавораць па-польску... Рэпартаж Уладзіслава Струмілы атрымаў галоўную ўзнагароду IV Форуму палянійных мэдыяў. У кнізе таксама сабраныя сямнаццаць апавяданьняў аўтара, якога ў Вільні лічылі за найбольшага за апошнія паўстагодзьдзі польскамоўнага празаіка. Амаль усе героі апавяданьняў так ці так сустракаюцца зь сьмерцю. Хлапец і дзяўчына, прагнучы чысьціні, сягаюць, абняўшыся, з касьцельнае званіцы. Былы карэспандэнт ТАСС на Кубе памірае на пляцоўцы віленскай рэстарацыі «Паланга», адсьпяваўшы песьню Гарсіі Лёркі. Курт аднекуль з Грэйсвальду, сустракае сьмерць, расхінуўшы вакно. Зь віленскага вакна ўзьлятае самотная дзяўчына, гэтак і не пагаварыўшы з хлопцам з вакна насупраць. Кніжка сканчаецца апавяданьнем «Дару табе яшчэ жыцьця...». У цёплую летнюю ноч да дому пад'яжджае машына. Пекная даўганогая дзяўчына, што сядзіць за рулём, забірае героя ў ноч. «Мусіш пагадзіцца цяпер з сваім станам. Мусіш зразумець, што пераходзіш да іншага вымярэньня. Ня вернесься туды, дзе быў. Ніколі!». Але пасьля доўгае язды па віленскіх вуліцах аўтамабіль усё ж вяртаецца назад. «Дару табе яшчэ жыцьця,» - кажа дзяўчына. Гэта апошні твор Уладзіслава Струмілы. Ён памёр за рулём, вяртаючыся зь Беларусі ў Вільню. Яму было 47.

с.х.

ВІЛЕНСКІ ГЛЁБУС



2 лютага ў віленскай галерэі Znad Wilii адбылося ўрачыстае адкрыцьцё супольнай выставы фота Алены Адамчык і графікі Адама Глёбуса. Адкрыцьцё выставы было прымеркаванае да прэзэнтацыі новай кнігі «Дамавікоў» Глёбуса ў перакладзе на польскую мову, што пры канцы мінулага году выйшла ў Беластоку.

Гэта першая выстава, на якой Глёбус выступае разам з жонкаю. Ён чарговы раз нагадвае публіцы, што, апроч усяго, ён яшчэ і мастак зь вялікім даробкам. У экспазыцыю патрапілі ягоныя архітэктанічныя малюнкі пачатку 80-х гадоў і ілюстрацыі да «Дамавікоў», створаныя ў апошні час. Кампазыцыі на матывы маскоўскай архітэктуры падзяляюцца на дзьве часткі — «Масква, узьведзеная беларускімі рукамі» і «Крэмль».

...Стоячы на Краснай плошчы з паперай й алоўкам у руках, студэнт БДТМІ Уладзімер Адамчык прасякнуўся магутнасьцю імпэрыі. Як толькі да яго падбеглі міліцыянты, каб спраўдзіць асобу і сагнаць з зручнага для маляваньня месца, ён выкруціўся першым, што патрапіла ў галаву: а я паляк!.. Міліцыянты зьнякавелі й ледзьве не «ўзялі пад казырок». З таго часу й па сёньня Глёбус у Маскве — замежнік.

У гэтых яшчэ студэнцкіх работах ужо пачаў гартавацца адметны кшталт графікі Глёбуса, які знайшоў сваё ўвасабленьне ў далейшых работах, пасоўваючыся ўвесь час у бок максымальнага прасьвятленьня сюжэту й мінімалізацыі сродкаў. Сёньняшняя ягоная графіка — гэта расфарбаваныя кампутарам кампазыцыі кніжнага фармату, якія ілюструюць «Дамавікоў».

Алена Адамчык выстаўляецца ў Вільні другі месяц запар. Цяпер гэта зусім новыя нізкі фота, сярод якіх глядач не пабачыць краявідаў і нацюрмортаў. Выстаўленыя ёю работы спалучаныя словам «каханьне» ў ягоным канкрэтным і відовішчным урэчаўленьні, у каляровым і ў чорна-белым сьвятле.

с.х.

Генадзь Сагановіч

ГРАМАДЗЯНСТВА

Бо няма ў людзей больш простага спосабу ўдасканальвацца, як празь веданьне дзеяў мінулых.

Палібій

Калі рэжым загаварыў цяпер пра намер «будаваць грамадзянскую супольнасьць», я зноў прыгадаў словы аднаго свайго настаўніка: палітыкі нічога не чытаюць і ня думаюць! Улады, калі ня хлусяць, моцна заблыталіся: грамадзянскасьць прынялі за падданства. Ох, ня ведаюць, з чым гуляюць. Бо грамадзянін паўстаў акурат у змаганьні за свабоду. Грамадзянскасьць — гэта прыманьне абавязку дзеяньняў на карысьць супольнага дабра, перадусім адказнасць за свабоду, за самога сябе. Свабода трактуецца грамадзянамі як супольная вартасьць, як дабро ўсіхнае. У Беларусі ўжо былі калісь праўдзівыя грамадзяне — мяшчане вольных гарадоў і шляхта. Свабодныя, яны мелі ўласнасьць і (адсюль) палітычныя правы, яны пераймалі і палітычную адказнасьць. Сам тэрмін «абывацель» — тагачасны «грамадзянін» (у расейскай мове гэтае слова, як і «мешчанін», набыло адмоўныя канатацыі) — вытварыла шляхта, для якой ён нітаваўся з паняцьцямі свабоды і роўнасьці. Яна ня проста ведала ўласныя правы і абавязкі, мэханізм функцыянаваньня дзяржаўнай улады. Грамадзяне Рэчы Паспалітай мелі высокую палітычную культуру, выяўлялі актыўнасьць у публічным жыцьці (удзел у соймах, зьездах і соймініках), былі пазытыўна заангажаванымі ў палітычную сыстэму сваёй дзяржавы і пераймаліся яе лёсамі. Так часта спатыканая ў Купалы «Айчына-маці» не сыходзіла з вуснаў беларускай шляхты. Шляхецкая адданасьць свабодзе і годнасьці іншы раз здаецца нам проста гіпэртрафаванай: бо выбіралі хутчэй сьмерць, чым ганебнае пакараньне. Пільнуючыся сваіх правоў, шляхта паўтарала, што «вольнасьці продкамі ў барацьбе здабытыя». А трыюмфам грамадзянскіх вартасьцяў беларускага палітычнага народу стаў Статут 1588 году. Гэтаксама беларускі мешчанін часоў Вялікага Княства ведаў свае правы і абавязкі, самакіраваўся і за сябе адказваў. Ён меў сваю зброю, а ягоны горад быў абнесены мурам — свабода мусіць бараніцца. Трываласьць нашай даўняй грамадзянскай супольнасьці засьведчыла пастава мясцовага люду ў гады маскоўскіх войнаў. Агрэсія з усходу заўсёды апраўдвалася лёзунгам «вызваленьня прыгнечанай Русі», праваслаўнай веры. І праваслаўнай частцы беларусаў даводзілася выбіраць паміж аднаверным наезьнікам і сваёй дзяржавай, прадстаўленай перадусім каталікамі. Вось жа ў нашым краі ў драматычных выпрабаваньнях XVI—XVII ст. пераважала адданасьць грамадзкім інтарэсам. Бо грамадзянін гіне там, дзе перамагае прынцып канфэсійнай ці нацыянальнай прыналежнасьці, або партыкулярызм. У нас такога не здарылася. Грамадзянскасьць, тая сапраўдная інтэграцыйная сіла, безь якой ані Вялікае Княства, ані Рэч Паспалітая папросту не змаглі б існаваць, вытрымалі выпрабаваньне самай страшэннай вайной. Калі ж у нядобры час беларускія мяшчане капітулявалі перад шматтысячнай арміяй Масквы, то і ў гэтым выяўляліся як грамадзяне: горад здаваўся на пэўных умовах, падпісваў угоду, уступаў у своеасаблівы кантракт, добра вядомы ў вольным эўрапейскім грамадзтве. Такое маглі рабіць толькі свабодныя людзі. Досьвед «кантрактаваньня» з царскай Расеяй стаў горкай навукай. Свабоду як вартасьць асабліва выразна падкрэсьлілі праваслаўныя магілёўскія шляхцічы Паклонскі і Солтан. Першы нават пасьля прысягі цару Аляксею Міхайлавічу адмаўляўся падпісвацца «халопам яго царскай вялікасьці», а калі перабег назад на бок Рэчы Паспалітай, то гэты пераход вытлумачыў імкненьнем вярнуць сабе свабоду: лепей ужо ў будах маліцца, «чымся ў такой няволі ў іх (у расейцаў - аўт.) заставацца». І прыяцель ягоны ўцякаў ад цара таму, што лічыў сябе «міласьнікам вольнасьцяў». Быхаўскія мяшчане, параіўшыся, на прапанову капітуляваць адказалі: лепей ужо ў дамах уласных памерці, «чым у няволю з волі самых сябе аддаваць». Улічым, што калі гэта адбывалася, то дзяржаўнай улады ВКЛ ці РП практычна не існавала. Польскі кароль уцякаў зь дзяржавы, польская армія здавалася швэдам, а Януш Радзівіл ставіў на швэдзкую пратэкцыю. Але і ў такой прыгодзе беларускія мяшчане й шляхта самі адстойвалі свае інтарэсы, у цяперашняй мове - грамадзянскія каштоўнасьці. Усё было на нашай зямлі, думаю, слухаючы рыторыку палітыкаў. І гэтая пэрліна эўрапейскай цывілізацыі — société civile, civil society, burgerliche Gesellschaft. І людзі, для якіх дабро Рэспублікі станавіла найвышэйшую каштоўнасьць.

Мы сядзелі ў фае вялікага гатэлю, у адным з тых фае, дзе ўсё падобнае да кіно — кіно ўдае тое самае. Было дваццаць пяць хвілінаў на шостую, маім суразмоўцам быў нэўрапатоляг, гадзіны прыёму ў яго скончыліся, і мы пілі слабую гарбату. Яна была такая дарагая, што нават варта было б знайсьці больш шляхетнае слова, чымся «пілі».

«Разумееце, — казаў ён, — рэч адно ў практыцы. Вось яны прыходзяць і сыходзяць — мужчыны, жанчыны, немцы й іншаземцы... і ніхто іх не пазнае. Я пазнаю іх. Па адным толькі поглядзе — файна, калі чалавек трохі знаёмы з псыхалёгіяй. Я гартаю людзей, як адкрытыя кнігі.»

«І што вы чытаеце?» — спытаўся я ў яго.

«Вельмі цікавенькія апавяданьні. — Ён агледзеўся наўкола, прышчурыўшы вочы. — Тут няма ніводнай загадкі — я ведаю іх усіх. Пытайцеся».

«Ну... напрыклад: кім ёсьць во той мужчына?»

«Які?»

«Той стары пан... з бакенбардамі... не, ня той... але, гэты...»

«Гэты?» — ён не разважаў ні сэкунды.

«Гэта... гэты чалавек, як бачыце, мае выяўнае падабенства да старога кайзэра Франца-Ёзэфа. Можна нават сказаць, што ён праўдзівая копія кайзэра — ён выглядае... ён выглядае на старога паштальёна, які разносіць грошы і якога людзі лічаць зычлівым, таму што ён прыносіць ім паштовыя пераводы. Ягоная пастава — ягоныя манеры... я ўважаю гэтага чалавека за былога прыдворнага чыноўніка зь Вены — нават вельмі высокастаўленага. Крушэньне Габзбургаў блізка закранула яго, нават вельмі блізка. Так. Але ж вы толькі паглядзіце, як ён размаўляе з кельнэрам: гэта арыстакрат. Памыліцца немагчыма. Арыстакрат. Паглядзіце — у гэтым чалавеку бальная заля; Вена; суцэльная старая культура Аўстрыі; высокая школа верхавой язды, якую яны там мелі — tu, Felix, Austria... Гэта, безумоўна, ягамосьць — нейкая зусім высокая істота. Вось так».

ПЯСЬНЯР ПАТАЛЯГІЧНАГА

Марыя Роўда

Яна сноўдае пад самымі маімі вокнамі. Яна не зважае на тое, што я жыву на першым паверсе й выдатна бачу яе. Недзе а сёмай, калі я па шматгадовай звычцы сядаю да акна папіць гарбаты, яна выходзіць з тралейбуса й кіруецца ў двары. Папраўляе вялікім пальцам сумачку на левым плячы, а правай рукою закладвае за вуха непаслухмяную пасму. А потым уваходзіць у арку, зьлева ад маіх вокнаў, і я ўжо не магу сачыць за ёю. Гэтак яна знарок мяне дражніць. Не. Яна ня мае намеру нешта зьмяніць альбо пачаць спачатку — яна проста забаўляецца так.

О так! Яна ўсё пралічыла! Арка знаходзіцца за два пад'езды ад майго, і я дакладна памятаю, колькі ёй трэба часу, каб прайсьці паўзь іх, збочыць у мой пад'езд, падняцца па прыступках, пакурчыць люстэрку грымасы, прыпудрыць нос, уздыхнуць і націснуць на званок. — Ну, хіба гэта ня зьдзек? Яна хоча, каб я думаў, што яна зьбіраецца да мяне. Каб спадзяваўся й чакаў, як раней. Альбо яшчэ горш: каб кідаўся перапранацца ці прыбіраць у хаце.

Папраўдзе, я некалькі разоў усё ж такі трапляў на гэты кручок — асабліва ў першыя дні, калі яна толькі пачала блытацца тутака. І калі мінаў час, і была ўжо й дзявятая, і дзясятая, я суцяшаў сябе, што яна, бадай што, не наважылася зайсьці.

Але ў такім разе ўсё гэта цягнецца занадта доўга: яна прыяжджае сюды тыдні з тры, а пры яе характары такая нерашучасьць непраўдападобная. — Нешта яна цямніць. Хаваецца. Задумляе. Хоча зьвесьці мяне з глузду. Мяркуе, што я буду лётаць за ёй, як і раней. Што буду ўсё прабачаць. Што буду завіхацца вакол яе й ня дбаць пра сябе, абы толькі ёй было добра. Што буду даваць грошы, рамантаваць аўто, абслугоўваць кампутар. Што чаравічкі будуць падбітыя, а парваныя пацеркі нанізаныя на новую жылку. Што карніз і дзьверы ў лазьнічку будуць пафарбаваныя, а туалетная папера своечасова купленая. Што ўсё будзе на сваім месцы, і Вераніцы трэба будзе толькі запытацца: «А ці ёсьць у нас булка? А ці будзем мы сёньня вячэраць?» — і ўсё зьяўлялася б само сабою. Калі б так. А яна б толькі даглядала сябе, толькі б сабою была занятая і пра мяне ўзгадвала, калі ў яе бясьпечныя дні былі (хаця я б усё адно гойсаў на ёй з пачкам прэзэрватываў напагатове). Альбо калі б яе кінуў чарговы палюбоўнік.

Так, я й пра гэта ведаў. — Усё разумеў, усё заўважаў, але адмовіцца ад яе ня мог. Яшчэ й вінаватым пачуваўся. Як бачыў яе пакрыўджаны позірк, дык адразу мог на што заўгодна пагадзіцца й заўсёды толькі на сябе наракаў.

Хаця ўвогуле яна й не такою ўжо дрэннаю была — мілаю нават, пяшчотнаю. Па нядзелях пірагі з капустай пякла, вясной перад сьвятамі вокны мыла. Памятаю, стаяла на каленях на падваконьні, церла шкло газэцінай і моцна-моцна сьпявала, каб піску не было чуваць. На яе ўсе людзі з прыпынку заглядаліся. Яна яшчэ й сукенку кароткую ў такіх выпадках апранала. Ну, хіба ня сьцерва? Але я гэта пазьней усьвядоміў. А тады я яе страшэнна раўнаваў і сам сваіх брыдкіх падазрэньняў саромеўся. Асуджаў сябе, нізкім, ня вартым яе чалавекам сябе называў, бо вось жа яна шчыруе, бедная, і ніякіх такіх думак ня мае, а я яе, чыстую й цнатлівую, падазраю. Божа! Малады я тады быў, жанчын ня ведаў. Яе ня ведаў. Нават не ўяўляў, што ў яе на душы. Ідэалізаваў, карацей. А ёй што? «Сэкс, мяса, грошы на цыгарэты й пральная машына» — вось і ўсё, што ёй ад мужчыны трэба. А астатняе —не яе сфэра ўплыву, так бы мовіць. Усё! «Зрабі мне добра й пакармі мяне, калі я з гуляў варочаюся.» — Нічога іншага яна ў цябе ня просіць! «Вы сваю місію выканалі, цяпер можаце адпачываць. Дзякуй». А! Яшчэ — «пагаварыце са мной па-беларуску: гэта для мяне йстотна!» Ну, як? Хіба яе нармальны чалавек вытрывае?

Так што я яе цяпер нават не раўную — я спачуваю таму няшчаснаму (калі ён ёсьць), які зараз зь ёю. Хаця я моцна сумняваюся, што нехта на яе, такую невыносную, паквапіўся. Ну, можа, забулдыга які. Бяздомны. Былы зьняволены. Альбо нехта з пэрыфэрыі. Хто яшчэ на яе можа спакусіцца? Ой, ну, няхай, няхай — але нават калі зь ёю й прыстойны чалавек, так добра, як із мною, ёй ніколі ня будзе. А хіба не? Хто аб ёй будзе клапаціцца гэтак, як я? Хто будзе сачыць за тым, каб у яе тампоны заўсёды загадзя ў шуфлядзе зь бялізнай ляжалі? Хто яе будзе на прыпынку, які за два крокі ад дому, пасьля працы ўвечары сустракаць? Хто ёй будзе банкі ставіць, а потым з ёю, пакрытай гэтымі чорнымі кругамі, 'каханьнем займацца? Хто, акрамя мяне, на ўсё гэта ахвяруецца? Хто? Ды ніхто. Ніхто, калі ён не вар'ят.

Курт Тухольскі

У ФАЕ ГАТЭЛЮ

Сямёх адным паглядам

«Неверагодна. Сапраўды — неверагодна. Як толькі вы пра ўсё гэта даведаліся?»

Ён усьміхнуўся занадта ўсьцешана, каб быць усьцешаным насамрэч; якім жа пыхлівым мусіць быць гэты чалавек! — «Як я вам казаў: гэта практыка. Я навучыўся гэтаму на сваіх прыёмных гадзінах — я ня Шэрлак Голмз, вядома, не. Я нэўрапатоляг, такі ж, як і іншыя — толькі я ўмею глядзець. Глядзець і бачыць».

Ён задаволена зацягнуўся тытунёвым дымам.

«А тая дама ззаду? Якая сядзіць за сталом і, здаецца, чакае кагосьці — бачыце, яна ўвесь час паглядае на дзьверы...»

«Тая? Дарагі сябра, вы памыляецеся. Гэтая дама не чакае. Прынамсі, яна не чакае тут нікога. Яна чакае... так, можна сказаць, яна чакае. Цуд — вось чаго яна чакае. Дазвольце... адзін момант...»

Ён выцягнуў з кішэні камізэлькі манокль, уціснуў яго ў вачніцу, манокль не сядзеў, і ён паправіў яго.

«Гэта... Дык вось, гэта адна зь нешматлікіх вялікіх какотак, якія яшчэ ёсьць на гэтым бедным сьвеце. Вы ж ведаеце, што какоткі вымяраюць, як само гэта слова. Буржуазная канкурэнцыя... Адылі, што я хацеў сказаць: каралева прадажнага юру. Менш патэтычна: дама вялікага, але ж сапраўды вялікага паўсьвету. Чорт... Чорт пабірай... Вы бачылі гэты рух рукі? Яна пажырае мужчынаў. Яна іх пажырае. Яна... І ў яе вачах — вы толькі прыгледзьцеся да яе вачэй... прыгледзьцеся да яе... у яе вачах комплекс смутку, цэлы сад ніцых вербаў. Гэтая жанчына прагне чагосьці; пасьля столькіх зьдзяйсьненьняў жаданьняў, якія не былі жаданымі, яна прагне. Што да гэтага, няма сумневу. Пытаньне ў тым, ці знойдзе яна калі-небудзь тое, чаго шукае. Вельмі цяжка знайсьці тое, чаго яна хоча — вельмі цяжка. Яна мела ўсё, у яе жыцьці было ўсё. А цяпер яна хоча большага. Гэта нялёгка. Якая мінорнасьць пад гэтым вэлюмам! Можа быць, які-небудзь мужчына празь яе скончыў жыцьцё самагубствам — можа быць — гэтага я ўжо не магу сказаць напэўна. Я не ўсяведны, я толькі лекар душы... Я хацеў бы кахацца з гэтай жанчынай. Разумееце мяне — не кахаць. Кахацца. Небясьпечна кахаць гэтую жанчыну. Вельмі небясьпечна. Так».

«Доктар... Вы — Каліёстра... Вашым пацыентам не да сьмеху».

«Мяне нельга ўвесьці ў зман, — сказаў ён. — Толькі не мяне. Што вы яшчэ хочаце ведаць? Калі мы ўжо распачалі...»

«Вось той! Так, таўстун, які зараз уздымаецца сыходзіць — не, вяртаецца. Той мужчына з трохі чырванаватым тварам. Кім ён можа быць?»

«Ну, а вы як лічыце?»

«Так... гм... але ж сёньня людзі так падобныя адно да аднаго... можа...»

«Падобныя адно да аднаго? Вы проста ня ўмееце глядзець — умець глядзець — гэта ўсё. Гэта ж зусім проста».

«Дык хто ён?»

«Гэты мужчына — гандляр віном. Ён альбо сам шэф, альбо пракурыст буйной вінагандлёвай фірмы. Энэргічны, адукаваны мужчына; валявы мужчына — мужчына, які рэдка сьмяецца і, не зважаючы на віно, ня надта цэніць гумар. Сур'ёзны мужчына. З тых, што жывуць справай. Няўмольны. Ненавідзіць вялікія зборы людзей. Гэта чалавек сур'ёзны. Вось хто ён».

«А гэтая? Гэтая маленькая мадам, трохі банальная на выгляд?»

«Пантэр, як вы можаце казаць такое! Гэта — (манокль) гэта прыстойная, сумленная жонка правінцыйнага буржуа... (манокль вяртаецца ў стойла) ...добрапрыстойная жонка, маці прынамсі чатырох дзяцей, узгадаваная ў паняцьцях гонару, уласьцівых дробнабуржуазным сем'ям — штонядзелі ходзіць да царквы — гатуе для свайго мужа, цыруе сваім гарэзам нагавіцы й сукеначкі — тут усё ў парадку. «Вызнае вернасьць і сумленнасьць і не адхіляецца ані на цалю... яна — не».

«Доктар, а вось той?»

«Глядзіце: вось тыповы чалавек грошай нашага часу. У гэтым уся ягоная сутнасьць. Я нават мог бы распавесьці вам гісторыю ягонага жыцьця — так ясна я бачу душу гэтага чалавека. Хапун. Умее трываць удары. Такі ня дасьць сябе ў крыўду. Ён не губляе часу на розную лухту; не чытае кніг; яму пляваць на ўсё, што не датычыць ягонай справы. Перад вамі замэрыканізаваны эўрапеец. Што да кабет, — крыж нябесны! — ужо шостая... Не крыўдуйце — але маю яшчэ неадкладную сустрэчу. Мушу зараз жа ўзяць таксоўку. — Вазьміце грошы! — Рахунак...» — паправіўся ён. Кельнэр падышоў, узяў і пайшоў. Доктар узьняўся.

«Колькі я вам вінен?» — жартам спытаўся я.

«Неаплатна, неаплатна. Усяго добрага! Ну... бывайце!»

Ён пайшоў.

І тады мяне апанавала цікаўнасьць, тады яна мяне апанавала. Усе ахвяры аналізу яшчэ сядзелі на сваіх месцах — усе. Я прабраўся да парцье, якому з-за стойкі добра было відаць усю залю. І я загаварыў зь ім. І нешта з маёй рукі прасьлізнула ў ягоную руку. І я пытаўся. І ён адказваў. І я прыслухоўваўся:

Аўстрыйскі прыдворны аказаўся гандляром швейнымі машынкамі з Гляйвіца. Вялікая прасталытка з комплексам суму — пэўнай місіс Бімштайн з Чыкага, а цяпер да стала падышоў таксама і яе муж, безумоўна, пан Бімштайн. Пракурыст вялікай вінагандлёвай фірмы быў клёўнам Грокам. Пухленькая матуля — гаспадыняй гасьціннага дому ў Марсэлі; нахабны фінансіст — паэтам найноўшае школы; і толькі псыхоляг быў псыхолягам.

Пераклаў зь нямецкай Алесь Пяткевіч

Курт Тухольскі — нямецкі пісьменьнік (Бэрлін, 1890 — Швэцыя, 1935). Крытыкаваў мілітарызм і шавінізм. Пасьля прыходу Гітлера ягоныя кнігі паліліся, а самога яго пазбавілі грамадзянства. Вымушаны эміграваць у Швэцыю, ён там неўзабаве скончыў самагубствам. Друкаваўся пад рознымі псэўданімамі. Гэтае апавяданьне выйшла за подпісам Пэтэр Пантэр (1930). Ягоныя кнігі — «Пад пяцьцю псэўданімамі» (1928), «Нямеччына, Нямеччына па-над усім» (1931) ды іншыя.

КАХАНЬНЯ

Сам дык я цалкам нармальны — проста ў мяне асаблівы выпадак: я яе шчэ іншай памятаю. Мы зь ёю з школы знаёмыя — яна тады такая забаўная была. Сьціплая, уважлівая, ветлівая такая. Бог яго ведае, ці бачыў я яе раней, але ў дзясятай клясе, у калідоры, кажа мне неяк прыяцель: «Глядзі, якая пухленькая. Вось бы з такой ажаніцца». Я тады яе неяк і прыкмеціў. Ззаду. Думаю: «І праўда, нішто сабе дзяўчынка». Так і пачаў заляцацца. Да таго ж я ў яе трэці мужчына. Так, трэці. Але «тры» — лічба не абы якая. Сымбалічная. Да таго ж першы мужчына — гэта так, проба пяра, можна сказаць. Клякса. Другі — дзеля разьмінкі, дзеля досьведу. А трэці — гэта ўжо абдуманае рашэньне, тут ужо адчуваецца стыль, індывідуальнасьць, тэхніка. Так што на мне ляжала падвойная адказнасьць за Веранікін лёс, за яе дабрабыт, шчасьце. Я мусіў быць мужчынам, і я быў ім да самага канца, нават пасьля таго, як яна паказала ўсім свой сапраўдны нораў, сваю сутнасьць, сваю паскудную, здрадлівую натуру.

А адбылося ўсё гэта звычайна. Патэлефанавала, сказала, што затрымаецца на пару гадзінаў, а сама не прыйшла. Як не прыйшла ні назаўтра, ні наступнай ноччу, ні на трэці дзень. І калі праз тыдзень яна прывалаклася, каб забраць свае манаткі і «адкараскацца» ад мяне, я быў ужо ў сваім уяўленьні абшарпаным, сівым і зарослым барадою. Праз страх за яе, а потым праз крыўду й роспач. І я ўжо не баяўся прызнацца сабе, што «так, я паводзіў сябе, як апошні дурань, як тысячы іншых пакінутых мужыкоў». Спачатку мерз на прыпынку, зазіраў, як сабака, у вокны тралейбусаў. Тэлефанаваў у міліцыю, апісваў прыкметы й прыкрываў рукою вочы, калі ўзгадваў тыя рысы, якія, здавалася, былі прызначаныя толькі для мяне. Я шчаміўся ва ўсе куты й шчыліны, каб знайсьці яе пах ці валасы. Я тыкаўся ў сьпінкі фатэляў, канапу, падушкі й ручнікі, твар, цалуючы шорсткую матэрыю, каб затрымаць Вераніку. Я прагульваў працу. Я чакаў званка ці Веранікінага зьяўленьня. Я не прыбіраў у хаце, каб ня сьцерці сьляды яе прысутнасьці. Я хадзіў басанож, каб ступаць па брудзе й пяску, прынесенымі яе нагамі.

І калі яна прыдзяўблася дадому, вы думаеце, яна хаця б крыху ацаніла маю дбайнасьць, думаеце, мае хваляваньні кранулі яе? Не. Я «ўсяга навыдумляў.» Да таго ж я «канешне, добры й спагадлівы, але не ідэал,» і тым больш, ня ейны. І калі яна ўжо не знайшла ўва мне свайго аднаго-адзінага мужчыну, то вымушаная мець некалькіх. І зь цягам часу ўсе разам яны як бы складуць архетып таго мужчыны, які ёй патрэбны. Проста, як Адам Кадман, альбо Рухані, у хазараў. Дзіва што. Магу вас запэўніць: былі ў яе потым і Кадымон, і Адам, і вусаты Рухані — усіх хапала. Усякай масьці сабе кавалераў награбла.

І, пэўна, мне варта было выгнаць яе тады, у той студзеньскі вечар, але я хацеў давесьці ёй і найперш, відаць, самому сабе, што я ўсё ж такі найлепшы мужчына, які толькі можа ёй трапіцца. Я ўзяў яе халодныя рукі й сказаў, што мы проста стаміліся. Што мы павінны тое-сёе зьмяніць. Што мы яшчэ ня зьведалі адзін аднаго да самых глыбіняў, не паказалі адзін аднаму, на што мы здольныя. Што яна мусіць мець камфорт, а не бадзяцца па чужых людзях. Што я пайду на яе ўмовы, што буду служкам, рыцарам, плюшавым мішкам, брам — кім заўгодна, абы яна пагадзілася ня рваць усяго таго, што было паміж намі раней. І што я хачу яе, што я невыносна хачу яе, і што я прымушу яе забыцца на ўсе яе часовыя ідэалы.

І сапраўды, ідэалы аказаліся часовымі, але яны саступілі новым, і жыццё маё пераўтварылася ў суцэльнае пекла. Па пачах, пасьля таго, як я ўжо адкрыта быў прызнаны «толькі адным з», я ляжаў побач зь Веранікай і разважаў пра ўсіх гэных людзей: пра заможнага каўказца-кандыдата навук, пра баяніста, пра француза-студэнціка, пра кіроўцу грузавіка, пра настаўніка роднай мовы і пра ўсіх астатніх, пра каго яна мне распавядала. Я ляжаў побач з усёй гэтай вар'яцкай калодай картаў і, не паверыце, нават ганарыўся, што на сёньняшнюю ноч змог выбіцца на першае месца ў гэтым балагане. І я зноў і зноў пытаўся ў сябе, што адчувала яна ў дачыненьні да кожнага з нас (я ўжо станаўлюся салідарным зь імі — дзіва, што я не надумаў утварыць разам зь імі прафсаюз), ці кахала яна некага з нас напраўдзе. Ці меў для яе хто асаблівае значэньне. І я амаль кожны раз маладушна адказваў сабе, што гэта быў я. І ніякія зьнікненьні, ніякія пагулянкі не змаглі пераканаць мяне ў адваротным.

Але я памыляўся тады не праз дурноту сваю, а праз тое, што ведаў Вераніку настолькі добра, наколькі добра можна ведаць вечна цёмны пакой, у якім заўсёды рухаесься навобмацак. Я ведаў Веранікіна цела, яе звыклыя жэсты, але нават яны мяняліся з кожным новым мужчынам, і я ледзь пасьпяваў высачыць новую рысачку-злодзея. І калі мы запозна вячэралі разам і Вераніка намазвала булку маслам і палівала вішнёвым сочывам, я ўсё гадаў, чаму яе кахаюць усе мае супернікі. Чаму яны жадаюць менавіта яе, і што ім у ёй так падабаецца. Бо сам я ўжо ня бачыў у ёй нічога, апроч чарады адбіткаў чужых мужчынскіх твараў на ейным. Чужых поглядаў, усьмешак, словаў, мімікі, плястыкі, валасоў. Усе гэныя мужчыны былі надзейна засьпіртаваныя ў Вераніцы, і нават зьяўленьне новага кавалера не пагражала б ім нічым. Яны засталіся б некранутымі, і толькі які-небудзь нязвыклы прыжмур вока дадаў бы пакутаў мне. Мне — чалавеку, які столькі часу быў нязьменным назіральнікам яе перажываньняў, тэлефонам даверу, гарантыяй гарбаты па вечарах, калі ў Веранікі нешта абломвалася альбо, наадварот, яшчэ толькі пачыналася. І тады, у першым выпадку, яна сядзела, зморшчыўшы лоб, і цені ўсіх былых перамог і пройгрышаў лёталі па твары. І мне хацелася пахапаць дакучлівых чорных птушак сумненьня, што азмрочвалі яе твар, кінуць іх у кіпень, зварыць неабсмаленымі й паказаць Вераніцы. Паказаць, што гэта ўсяго толькі мяса й пер'е, а ня нешта, што мусіць так мучыць яе й замінаць ёй жыць шчасьліва.

Але бывалі й такія дні, калі Вераніка вярталася дахаты пад раніцу, гарэзьлівая й задаволеная, і была выключна прыязнай да мяне. Тады яна, зь сьмехам, абдымала мяне й супакойвала: «Нічога, не бядуй. Аднойчы ты таксама знойдзеш сваю жанчыну, якая будзе да пары, і мы станем сябраваць сем'ямі». Вераніка не была злой. Так, эгаістычнай, разбэшчанай, жорсткай, але ня злой. І калі ёй сапраўды шанцавала, і яна сустракала некага вартага, Вераніка рабілася ледзь не анёлам. Але іскры агню, якія літаральна пырскалі зь яе тады,

Працяг на старонцы 14

СЛОВЫ

Марк Шагал

ЦЯПЕР

Усе мае дні
я шмат маліцца ня змог.
Дзе ён?
Як ён, мой Бог?
Ты чуеш, бачыш мяне?
Я хацеў цябе клікаць,
налямантавацца ўсмак,
я, проста жабрак.

Цяпер я стары,
час мяне змог.
Ты падымеш мяне да сябе,
мой Бог.

ПРА ГЭТУЮ ЯСНАСЬЦЬ

Бог мой, за гэтую яснасьць,
якой ты душу маю насяліў,
– Дзякуй.

Бог мой, за гэты спакой,
якім ты душу маю насяліў,
– Дзякуй.

Бог мой, ноч настае,
да сьвітаньня зводзіць павекі мае,
і я намалюю нанова
табе, Адзіны,
пра зямлю і нябёсы
карціны.

СЁСТРЫ

Сьмяяцца ці плакаць –
сёстрам усё адно,
ці сьпяваць, пастаўшы ў дзьвярах,
ці траскатаць па-сарочы,
адчыніўшы вакно,
глядзець, хто йдзе,
ці шчасьце, ці страх.

БРАТ

Мне цябе не хапае, Давыд.
Чаму
ты не затрымаўся ў жыцьці?
Быў бы рады, як роднаму,
ценю твайму.
І ад каменя ценю
мне не знайсьці.

САД

Вечар. Сад,
асьветлены поўняй. І ты,
легенда. Лагодны дотык
мілаты.

Ты пацалуеш мяне,
абдымеш мяне, ці,
магчыма, мне загадаеш
адсюль пайсьці.

Лагодны дотык прадоньня.
Закаханы прыходзіць сёньня,
водарам сада напоўнены,
малады.
Як тады...

КАРАБЕЛЬ

Усе дзьве тысячы гадоў
расьсейвалі мяне,
але на ўзрост
мая краіна маладая.
Юнак – мой сын Давыд.
Я кленчу даўніне
і зоры на шчыце Давыдавым шукаю.

Прарокі паўзь мяне
бясшумна праплылі.
Давыд сьвітае –
чую подых і праменьне.
Дзьве тысячы гадоў
на небе, на зямлі
сьлязьмі цябе чакаў,
краіна захапленьня.

Як Якаў, спаў глыбока
і сасьніў я сон:
анёл па лесьвіцы
мяне ўздымае ўгору,
і душы згаслыя наўкол,
зьнябыўшы скон,
узносяць сьпеў
у нечувалую прастору.



Сьпеў пра Ізраіль новы
і пра тыя ўсе
дзьве тысячы гадоў
расьсейваньня бяз жалю.
І пра Давыда –
сына ў сонечнай расе.
Чым Бах і Моцарт,
саладзей яны сьпявалі.

Зь ідыш пераклаў Рыгор Барадулін

Рыгор Барадулін

МАРК ШАГАЛ

Жыцьцё працякала –
І не стараўся
Залапіць гарбаты дах.
Губляў галаву
І не сьпяшаўся
Яе адшукаць.
Ягоны сусед Макар
Пасьвіў цялят
Недзе ў Маркаўшчыне
Ці на Пескаваціку,
А ён пераганяў коз
З Элісейскіх палёў
На Млечны выган.
Козы былі зь Віцебску,
Дзе дагэтуль
На глухаватай вуліцы
Чакае яго мураванка
І на падваконьні
Гараць бальзамінкі
Зоркамі малалецтва
У цёплым космасе
Незабытай бацькаўшчыны.

ПЯСЬНЯР ПАТАЛЯГІЧНАГА КАХАНЬНЯ

Працяг з старонкі 13

дратамі праціналі мяне. І я трываў, трываў, трываў бясконца, бо разумеў, што быць Веранікай — цяжар нашмат большы за мой боль. І я рабіўся саўдзельнікам Веранікінай безразважнасьці, таму што, хоць і не патураў, але ж суперажываў. Тым больш, што заўважыў нейкую незразумелую заканамернасьць: калі Вераніка йшла за сваёй зусім не дабрадзейнай натурай, усё ладзілася і ў яе, і ў мяне. Але як толькі Вераніцы сьніліся яе дзіцячыя сны альбо прыходзілі ў галаву думкі пра нейкі «няспраўджаны доўг перад грамадзтвам» (Бог яе ведае, што яна мела на ўвазе), яна ледзь не хварэла, бо спрабавала быць «прыстойнай». Вераніка даводзіла, што яе існаваньне — заганная паталёгія. І, не паверыце, я сам пераконваў Вераніку, што паводле апошніх тэорыяў палітkарэктнасьці паталёгія ня можа лічыцца заганнай. О так, тут ужо маёй беднай Веранічцы не было як сумаваць, і яна палымяна прамаўляла, што «так, яна мусіла аддаваць сябе, дзяліцца сваёй жыцьцёвай моцай, бо інакш тая душыць і разьдзірае яе знутры.»

Мана. Нічога яна ня мусіла нікому аддаваць. Насамрэч, яна ўжо не магла спыніцца, затрымацца зь нейкім пэўным мужчынам. Бо баялася. Баялася перайсьці тую мяжу, за якой бы ёй прыйшлося ўбачыць ужо не сябе й сваю страсьць, а мужчыну, на якога яна цэбры той страсьці вылівала. Не кажу ўжо пра каханьне. Тым больш узаемнае. Яно б Вераніку проста забіла.

У тым і парадокс: нягледзячы на ўсе яе прыгоды, каханьне — і мужчыны ўвогуле — было для Веранікі самым небяспечным, страшэннай пагрозай. Бо яны, калі сканцэнтравацца на іх у той ступені, у якой яны таго заслугоўваюць, адрывалі б Вераніку ад яе самой. Яны зруйнавалі б яе асобу, зламалі б унутраны стрыжань, зьніштавалі б яе духоўны досьвед. А хіба дзеля гэтага яе Бог стварыў? Зусім не, — лічыла яна. І ніхто, кажу вам, ніхто з тых дурняў зь якімі яна круціла, нічога для яе не азначаў. Вераніка прыслухоўвалася толькі да сваіх пачуцьцяў, толькі да сваіх тактыльных адчуваньняў. І калі я нарэшце наважыўся спытацца ў яе, ці аддавала яна перавагу каму з тых, з кім была разам, Вераніка з усёй сваёй непадробнай шчырасьцю адказала, што «так, два-тры зь іх былі больш тэхнічныя ў гэтым пляне, чым астатнія». Так што відавочна, яна была засяроджаная цалкам на сабе. Яна толькі хацела папеставаць сваю натуру, сябе, такую каштоўную й прыгожую. І калі гэныя добраахвотнікі стараліся на Вераніцы, яны нават не здагадваліся, што проста сьціралі зь яе парцалянавага цела пыл, які назьбіраўся за тыдзень-другі сталай сувязі альбо самоты. Так што, я мяркую, Вераніка рабіла ўсё гэта ў мэтах асабістай гігіены. І ня больш.

А я... Я быў даўно заваяванай крэпасьцю, перамога над якой нікчэмным мэдалём боўталася ў Веранікі на грудзях. Яна кожны раз сыходзіла на мяне, як прасьвяда, але затым уставала й рухалася далей. Варочалася, а потым ізноў зьнікала. А мне заставалася ненавідзець, ірваць фатакарткі й чакаць, чакаць, чакаць... Ажно пакуль Вераніка не прыцягвалася «мірыцца». З валізкай, нашпігаванай рознымі прысмакамі, і пляшачкай белай. Вось такое «каяньне».

Але ўсё ж такі я спрабаваў пазбавіцца той хваравітасьці, якая панавала ў нашых адносінах. Я намагаўся. Я вырашыў, што калі Вераніка ўсё адно заўсёды вяртаецца да мяне, то я мог бы пагрэбаваць прынятымі ўмоўнасьцямі й ажаніцца зь ёю, хоць яна й такая. Хоць увесь наш двор, мае калегі й сябры кпяць зь мяне. (Няхай. Яны проста зайздросьнікі.) А каб Вераніка ведала, што ў яе ёсьць законны муж, яна, можа, часьцей зазірала б да мяне. Але я памыліўся.

І калі я ўжо дакаціўся да гэткіх разважаньняў, сказала мне яна, то мы ўжо ня змоўцы, паміж намі ўжо ня можа быць раўнапраўнай «сацыяльнай угоды». Значыцца, справа — дрэнь, і ёй вельмі шкада, што яна не спынілася раней, бо яна ўжо падазравала мяне ў занадта сэнтымэнтальным стаўленьні да нашага сумеснага пражываньня. Сама ж яна ўважала яго за добрае сяброўства, асабліва пасьля ўсіх яе раманаў. Да таго ж я, відаць, моцна пакутаваў увесь гэты час, а я ня варты такой зьнявагі. І больш яна ня будзе так абыходзіцца з мной. Мы проста палюбоўна расстанемся, пакуль гэта яшчэ безбалесна. І вы думаеце, ёй нешта зашкодзіла менавіта так і зрабіць?..

...Звычайна мужчыны, якіх кінулі, робяцца падобнымі да тых жанчынаў, якія гэта ўчынілі. (І наадварот.) Каб утыркнуць сваю нечуваную крыўду ў некага іншага. Каб адпомсьціць за сябе супрацьлегламу полу. Альбо ў якасьці псыхатэрапіі. Бывае, што пасьля найбольш удалых «сэансаў», на сьвет зьяўляюцца нераўзыйдзеныя сьцервы й донжуаны. Але са мной нічога такога не адбылося.

Усе тыя гады, што Вераніка пазьбягае мяне, яна, насамрэч, бадзяжнай коткай блукае паміж мной і іншымі мужчынамі. І таму я застаюся сам па сабе. Але адзінота зусім не пужае мяне. Ды й як можа палохаць тое, да чаго ты ўжо прызвычаіўся? І даўна ўжо нішто не парушае гэтай самоты. Маё «я» больш не пускае ў сябе нічога звонку. Яно ня хоча далучацца да тых, хто тэлефануе альбо прыходзіць. Маё «я» аддало швартовы й выправілася ў адзіночнае плаваньне. Безь цябе.

А вось зараз ты ходзіш перад маімі вокнамі, а я не магу па начах спаць, бо й коўдра, і прасьціна

Адам Глёбус
КІШЭННАЯ ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ-3

Крамэр

Аўстрыйскі габрэй Тэадор Крамэр усё жыццё пісаў вершы пра тых, хто ня піша й не чытае паэзіі. Ён працаваў на мове народу, які вынішчаў ягоную нацыю. Хто яшчэ так рабіў? Хто здатны напісаць пра фашыста радок: "Мой бедны брат, я плачу па табе"? Хто мог папрасіць у Бога адно "кулёчак бульбы з рыбай"? Толькі ён — Тэадор Крамэр.

Рэмбрант

Жывапісец Рэмбрант ван Рэйн нарадзіўся ў сям'і млынара, але ягоныя палотны асьветленыя агністым сьвятлом зь печы пекара. На Рэмбрантавых палотнах зіхацяць адбіткі полымя, на якім пячэцца хлеб.

Эйзэнштэйн

Буйны плян у кіно прыдумаў Сяргей Эйзэнштэйн. Бязь ценю сумневу яго можна назваць бацькам парнаграфічнага відэа, якое будуецца выключна з буйных плянаў.

Джагер

На канцэрце "Ролінг Стоўнз" жонка спыталася: "Ты цяпер разумееш, што ты й Мік Джагер — блізкія людзі?" "Вядома, блізкія... Мы знаходзімся на адным стадыёне, а сорак тысячаў барсэлёнцаў ня ў лік".

Шардэн

Калі мелькам зірнуць на палатно з нацюрмортам Жана-Батыста Сымона Шардэна, можна ўбачыць замест яго твор Сэзана. А калі доўга-доўга засяроджана глядзець на шэдэўр Поля Сэзана, дык празь яго праступіць Шардэн.

Курасава

Кінарэжысэр Акіра Курасава зьняў фільм "Ёджымбо" ("Целаахоўнік") пра чалавека, які невядома адкуль узяўся й немаведама куды сышоў. Ёджымбо біўся, змагаўся, падманваў, перамагаў, кахаў, але самым істотным для мяне засталося тое, што Целаахоўнік немаведама адкуль прыйшоў і невядома куды зьнік.



Сэзан

Нацюрморты Поля Сэзана вызначаюцца сьвежасьцю. Уяўляю іх у вялікіх парыскіх сталоўках, дзе адбываюцца сямейныя абеды.

XX стагодзьдзе на чале зь Лё Карбюзье сумясьціла сталоўку з кухняй. Там можна павесіць толькі рэпрадукцыю з Сэзанавымі яблыкамі. Палотны ж Сэзана зрабіліся настолькі дарагія, што ніводная сям'я не рызыкне вешаць іх над абедзенным сталом. І можаш уявіць, як сумуюць Сэзанавы рэчы па звоне келіхаў, відэльцаў і нажоў.

Калі я глядзеў на персікі Поля Сэзана ў Эрмітажы, мне падалося, што яны сьпяць.

Джагер

Рок-н-рол — музыка для людзей з слабым слыхам, як кіно — тэатральнае фота для чалавека, што кепска бачыць. А такіх асобаў, на якіх трэба павышаць голас і дзеля якіх мусіш павялічваць карцінкі, значна болей, чым аматараў музычнай адукацыі й знаўцаў мастацтва. Падобнае назіраньне ёсьць у Гёбэльса, які на палях тэксту прамовы пазначыў: "Аргумэнт слабы. Павысіць голас".

Мік Джагер ужо трыццаць гадоў выкарыстоўвае гэтую прапорцыю паміж невукамі й адукаванымі. Ён цудоўна разумее, што Моцарт можа гучаць зусім ціха й заставацца Моцартам, а "Ролінг Стоўнз" — настолькі вялікі гурт, наколькі ён грамчэйшы, шчыльнейшы й дынамічнейшы за астатнія.

Дэга

Эдгар Дэга любіў прастытутак, любіў і маляваў. Ён маляваў і балерын, такіх падобных да прастытутак.

Манэ й Монэ

Імпрэсіяністу Эдуарду Манэ дзеля натхненьня прыродаю патрэбныя былі сябры, выпіўка, закуска й жанчыны лёгкіх паводзінаў — усё гэта ў вялікай колькасьці ёсьць на ягоных палотнах.

Імпрэсіяністу Клёду Монэ дастаткова было сонечнага надвор'я, каб пачаць жывапісаць краявід.

Віян

Узоры інтэлектуальнага кітчу, створаныя французскім авангардыстам Барысам Віянам пад псэўданімам Вэрнан Саліван, мяне, як і мільёны іншых, захапляюць. Адзін толькі пералік назоваў ягоных бульварных раманаў гучыць як верш...

Я прыйду наплявaць на вашыя магілы.
Ва ўсіх мерцьвякоў аднолькавая скура.
Вынішчым усіх выродкаў.
Жанчынам не зразумець.
Сабакі, жарсьць і сьмерць.

І разам з тым, бяз гвалту й прымусу перачытаць другі раз нават гэткія шэдэўры бульварнага чытва немагчыма. Раман рэч аднаразовая, прачытаў, як праглынуў.

Джакамэці

У вялікага швэйцарца Альбэрта Джакамэці ёсьць скульптуры, што нагадваюць пруткі спаленых бэнгальскіх агнёў. Толькі апошняя іскра ўсё яшчэ блукае ў танканогіх постацях, створаных майстрам Джакамэці.

бы аблізваюць мяне шурпатымі языкамі. Маё люстэрка нахабна выдае мне па раніцах твой твар. Мае рукі й сны ня слухаюцца мяне. Я больш ня п'ю гарбаты — ва ўсякім разе а сёмай. І не таму, што я хаджу на шпацыр да найбліжэйшай кавярні — я проста баюся цябе. Я баюся тваёй здані, што перасьледуе мяне паўсюдна ў маёй кватэры. У тралейбусе, дзе столькі жанчынаў раптам пачалі размаўляць тваім голасам. У маёй адзежы й бялізьне, якія я кранаю тваёй рукой. У маёй брытве. У маім гадзіньніку, які сьмяецца альбо крывіць вусны, як ты. У маім страху, які няўхільна цягне мяне а сёмай да вакна.

Чаму? Нашто ты прыйшла? Чаму ты вынырнула акурат тады, калі я ледзь-ледзь навучыўся жыць безь цябе? Нашто ты клічаш мяне? І чаму ня зойдзеш сама? Няўжо ня верыш, што я табе прабачу? А можа, ты саромеесься некалькіх новых гадоў у тваім узросьце? Але ж і я не маладзён. Мне ўжо таксама пад трыццаць. І я не скажэнец, каб скакаць па малалетках. Мы з табой роўныя. Мы пара. У нас ёсьць агульнае мінулае, агульны досьвед, і я яшчэ поўны сіл. Я магу даць табе тое, чаго ты ад мяне чакаеш. Дык чаму ж ты ня зойдзеш? Чаму ты асьцерагаесься мяне?

Цяпер я назіраю за табою па вечарах і раздумляю аб тым, якое гэта дзікунства, што мы з табой ня можам зрабіць хоць крок насустрач. Што ты ня хочаш патэлефанаваць і папляткарыць пра былых сяброў. Альбо сказаць, што табе прапанавалі выгадную працу, а ты ўжо й так добра ўладкаваная, і таму ўзгадала пра мяне. Ці проста схлусіць, што забыла ў мяне якуюсь рэч альбо лёсавызначальную паперу, калі пераяжджала. І тады табе ня трэба было б дзень пры дні сядаць у тралейбус, а потым затойвацца недзе ў нашым альбо суседнім двары, каб нарэшце раздражніць мяне настолькі, што я ня выцерплю й выйду шукаць цябе. Вераніка, я разумею, зараз вясна, і табе бракуе новых уражаньняў. І строі, якія ты зараз носіш, таксама шыкоўна на табе выглядаюць — і табе карціць пафарсіць. Але ж мы цывілізаваныя людзі. Мы маглі б усё вырашыць іншым чынам. Хіба не? Я ўжо амаль гатовы пазбавіць цябе непрыемнай працэдуры прабачэньня й неабходнасьці дзейнічаць першай. Ты маеш рацыю: я ж мужчына — я павінен прымаць удар на сябе. Я дапамагу табе, Вераніка. Сонейка маё, я дапамагу табе...

...Два дні я пальтаў па «Дынама» й крамах, каб адпаведна апрануцца й запэўніць цябе ў сваёй добранадзейнасьці. Два дні я пільна ўзіраўся ў цябе, каб прызвычаіцца да тваёй прыгажосьці й не атрымаць шоку пры непасрэдным кантакце. Я рыхтаваўся. Я сьвяткаваў. Я засьцяліў чыстую бялізну. Я купіў саладкаватага віна. Я вывесіў у лазьнічцы новыя ручнікі. Я ўставіў у кубачак пад люстэркам дзьве новыя зубныя шчоткі. Шалёнік — я нават вытрас пыласос. Я чакаў.

...Безь пятнаццаці сем я падсеў з гадзіньнікам у руцэ да вакна. Потым я падумаў, што гадзіньнік усё ж такі лепш начапіць, бо потым лішнія рухі толькі перашкодзяць. Я прыціснуў далоні да стала — левую наперадзе, каб бачыць час. Я вырашыў падпільнаваць, як ты выйдзеш з тралейбуса, выбегчы (бразнуць дзьвярыма /ключы ў кішэні джынсаў / потым уніз і направа), высачыць, дзе ты хаваесься альбо нагнаць цябе яшчэ раней. Узяць цябе за плячо, сьлізгануць рукою на шыю, абняць ззаду... І ўсё сказаць. Што падкажа сэрца. Выдумаць, зманіць, заінтрыгаваць, зацікавіць, запрасіць. Быць з табой побач. Цалаваць твае валасы. Быць.

Было ўжо шаснаццаць на восьмую, калі яна нарэшце выйшла з тралейбуса. Я кінуўся з кватэры. Нават адпіхнуў стол і перавярнуў зэдлік (непарадак: яна падумае, што я п'яніца і ў мяне тут быў дэбош). Ламануўся да аркі, але рэзка спыніўся, бо падумаў, што ты магла яшчэ затрымацца. Падкраўся да рогу нашага дому і ўбачыў, што цябе ўжо няма на дарожцы. Пабег да дзіцячага садка ў двары. І... Гэта ты. Гэта была ты. Мая Вераніка. Толькі мая. Мая адзіная жанчына. Мая дзяўчынка.

Ты стаяла ля агароджы зь нейкім падшыванцам. Зь нейкім хлопчыкам у акулярах і штроксавай кашулі. Ты трымала яго за руку, а ён адхінаў табе валасы з твару. Вялікім пальцам гэны шчанюк праводзіў па тваёй шчацэ, а ты сьмяялася й цалавала яго. Так, як мусіла цалаваць толькі мяне. Ты — нейкага падлетка. Вераніка!

І тады назад. Праз садок. Да аркі. Два пад'езды. Ручку ад дзьвярэй — зь мясам. Прыступкі. Ключы. Шмат ключоў, і зьвіняць. Адамкнуў. На стол. Да вакна. І кулаком у шкло. Да крыві. Каб ведаў. Як кахаць Вераніку. Такую сьцерву. Здрадніцу. Шлюху. Агідную балёнку.

...А празь дзень я паехаў на лецішча. Выходныя. Прытэпаў з электрычкі да хаткі. Закінуў заплечнік на вэранду. Не пераапранаўся. Узяў асадку й папоўз на грады падпраўляць надпісы на трэсачках. Дзе што пасаджана. Для яе. Усе гэтыя гады дарма. Для яе. Потым дастаў бутэльку гарэлкі, вынес кубак. Паставіў на лаве ля ганку. Хлеба адкроіў, сала, адчыніў слоік з агуркамі. Піў паўдня. Абжыргаў лаву. Затым узяў і намаляваў асадкай на дошцы жаночы абрыс. Выцягнуў з-пад хлеба газэту. Напісаў на чыстым баку: «Вераніка — сука й нікчэмная балёнка». Потым знайшоў цьвічок, малаток, прыстроіў паперку на лобе ў жанчыны, прыладзіў цьвічок і моцна-моцна ўдарыў.

Каб ужо напэўна забіць.

АБВЕСТКІ

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Шаноўныя прыватныя рэкламадаўцы!

Працягваючы друкаваць бясплатныя абвесткі, мы пачынаем таксама друкаваць абвесткі большым шрыфтам і ў афармленым выглядзе, але за невялікую плату:

— да 20 словаў — 40 000 руб., звыш 20 словаў — 60 000 руб.;

— па-мастацку афармленая аб'ява (мінімальны памер рэкламнага модулю 18 кв. см.) — 180 000 руб.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пералічыць грошы праз пошту пераводам на наступны разьліковы рахунак: Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», р/р 3012213050010 Ленінскае аддз. «Белбізнесбанку» г.Менску, код 763.

На зваротным баку блянку паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» залісваецца дакладна і чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і АБАВЯЗКОВА ДАДАЕЦЦА СКАЗ: «ЗА РЭКЛЯМНЫЯ ПАСЛУГІ».

Калі дзейнасьць, якую вы рэклямуеце, падлягае ліцэнзаваньню, у абвестцы неабходна пазначыць нумар, дату выдачы і тэрмін дзеяньня ліцэнзіі, назву органу, які яе выдаў.

Друкуючы на старонках «НН» платныя абвесткі, вы спрыяеце выхаду газэты.

Рэдакцыя

Віншую Мядзьведзя з тым, што малому мядзьведзіку нарэшце споўніўся год! Альця

Шукаю сяброў: Вячаслаў, 25 гадоў. 222125, Менская вобл., Барысаўскі р-н, ст.Навасады, УЖ 15/14, атрад 32, Цімко Вячаславу

Спосабы: нарошчваньня цягліцаў бяз «хіміі» і трэнажораў, павелічэньня росту аж на 8 см, зьніжэньня вагі без галаданьня і дарагіх прэпаратаў, адбельваньня і лячэньня зубоў без плямбаваньня. Капэрта са зв/а + купон б/а. 246012, Гомель-12, а/с 143

Запісы беларускіх выканаўцаў у Менску: Камароўскі рынак адкрыты (стэнд ля пераходу на крыты), галерэя «Мастацтва» (пл. Якуба Коласа), шапік «Карона» (ля крамы «Музыка»)

Siabry vinšujuć Rudnickuju Jasieńku z dniom narodzinaŭ! Zyčym ščaścia, pośpiechaŭ, kachańnia! My ciabie vielmi lubim!

Маю на продаж кнігі: В.Быкаў «Сьцяна», Л.Геніюш «Выбранае» і інш.; больш за 90 найменьняў запісаў, каляндарыкаў, значкаў беларускіх рок-гуртоў. Шукаем распаўсюднікаў з рэгіёнаў Беларусі. 220085, Менск, а/с 5

Наш прыклад хрэстаматыйна сьведчыць: жыцьцеўстойлівасьць нацыянальных інтарэсаў залежыць ад грамадзянскіх учынкаў, а не ад санкцыяў улады. Сяржук Аржанцаў

Немец Грот блага гаварыў па-расейску, тымчасам даў расейцам свой, усім вядомы, правапіс. Я.Лёсік

Калі ты любіш Беларусь і захапляесься беларускім рокам, прыходзь шточацьвер на паседжаньні «Маладога Фронту»: Менск, Варвашэні, 8. Тэл./факс: 284-50-12

Набуду Статут ВКЛ 1588 г., энцыкляпэдычны даведнік «Беларусь» 1995 г. выданьня. Максім. Тэл. у Гомлі: (0232) 54-41-13 (увечары)

Шукаем Статут ВКЛ 1588 г., выданьня 1988 г. Лістуйце: МГАТ «Ліцьвіны», а/с 124, 246012, Гомель

Спадару Віктарасу Пяткусу зь Вільні за кнігу Я.Карскага «Беларусы» кажу: вялікі дзякуй!
Славамір Адамовіч

БЕЛАРУСКІ КАЛЕГІЮМ
запрашае на публічныя лекцыі

9 лютага
Прэзэнтацыя гістарычнага альманаху «Athenaeum» з удзелам рэдактара Алега Дзярновіча і гісторыка Ігара Лялькова

16 лютага
Юрась Барысевіч
Сыліконавы век: новае цела
(а таксама прэзэнтацыя кнігі Ю.Барысевіча «Цела і тэкст»)

23 лютага
Мікола Крывальцэвіч
Археалёгія і палітыка

лекцыі адбудуцца ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы (актавая заля): вул. В.Харужай 16, Менск
Пачатак лекцыяў у 18.30

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэл. 256 -36-13

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ДЛЯ ПРЭСЫ

Беларуская Музычная Альтэрнатыва распачала працу дзеля стварэньня «Беларускага музычнага календара». Мы плянуем правесьці анкетаваньне ў музычных накірунках (беларускія рок-гурты, барды, клясычныя выканаўцы і г.д.). Будзе зьбірацца падрабязная інфармацыя, якая тычыцца як непасрэдна саміх удзельнікаў апытаньня (даты нараджэньня), так і зьвесткі аб дзейнасьці калектываў (выхады альбомаў, канцэрты, інш.). Стварэньне «Беларускага музычнага календара» – гэта адзін з этапаў стварэньня Беларускай музычнай энцыкляпэдыі.

Беларуская Музычная Альтэрнатыва сумесна з гуртом NRM аб'яўляюць конкурс на лепшую байку пра NRM. Усе, хто ўзяў удзел, будуць запрошаныя на сустрэчу з гэтым рок-гуртом. А пераможцы ў якасьці прызу атрымаюць CD, касэты, каляндарыкі. Працы (а гэта могуць быць вершы, апавяданьні, анэкдоты – як сапраўдныя, так і выдуманыя) трэба дасылаць да 15 лютага на адрас: Менск, Варвашэні, 8 (з пометкай «На конкурс NRM»).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ГУМАНІТАРНЫ ЛІЦЭЙ імя ЯКУБА КОЛАСА

Аб'яўляе набор на падрыхтоўчыя курсы для паступленьня ў ліцэй.
Запрашаюцца вучні 7 клясы.
Пачатак заняткаў 10 лютага.

Заявы прымаем па адрасе:
220050 Менск, вул. Кірава 21, 6 пак., тэл: 226 10 73, 227 04 67

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА
576 кгц – новая частата на сярэдніх хвалях!

Новыя хвалі і частоты (ад 25 кастрычніка 1998)

18:00 - 19:30	6000, 6170, 7155, 9615 кгц	(49, 41, 31 м)
22:00 - 23:30	6010, 6025, 6170, 7155 кгц	(49, 41 м)
06:00 - 07:00	5995, 7275, 7295, 9750 кгц	(49, 41, 31 м)

Усе перадачы можна слухаць на сярэдняй хвалі 576 кгц (521 м)

У праграме:
... навіны зь Беларусі і ўсяго сьвету, праявы чалавека, апазыцыя, улада, родная мова, эканоміка, мэдыцына, культура, гісторыя, эміграцыя ...

Спэцыяльныя перадачы:
... Праскі акцэнт, Востран Брама, Чытальная заля, Блізкая Эўропа, Неабжытая спадчына, Сымбаль веры, Беларускія раздарожжы, Адукацыя за мяжою, Новае пякленьне выбірае, Беларускі інтэрнэт ...

ІНТЭРНЭТ: *http://www.rferl.org/bd/be/belarus*

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 • Vinohradska 1, 11000 Praha 1, Чэхія

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА СВАБОДАЙ!

КУПОН БЯСПЛАТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

Новыя кнігі, дасланыя ў рэдакцыю

Андэрсэн Х.К. Сьнежная каралева: Казкі. – Менск: Юнацтва, 1998. – 304 с.: іл. – (Бібліятэка замежнай дзіцячай літаратуры) – Наклад 4000 ас. ISBN 985-05-0213-4

Арабей Л. Перавал: Аповесьці, апавяданьні. – Менск: Мастацкая літаратура, 1998. – 253 с. – Наклад 1300 ас. ISBN 985-02-0334-X

Гарады Беларусі на старых паштоўках: Альбом / Аўтар тэксту і ўкладальнік В.Целеш. – Менск: Беларусь, 1998. – 255 с. – Наклад 3000 ас. ISBN 985-01-0191-1

Гусоўскі М. Песьня пра зубра: Для дзяцей шк. веку / Мастак У.Савіч. – Менск: Юнацтва, 1998. – 102 с.: іл. – Наклад 4000 ас. ISBN 985-05-0311-4

Кантакты і дыялёгі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралягічны бюлетэнь Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. – № 12 (36). Сьнежань 1998. – Менск, 1998 . – 63 с. – Наклад 299 ас.

Крыніца. № 11(48), 1998. – 112 с. – Наклад 1300 ас.

Кисель В. Памятники всемирного наследия: Папулярны энцыкляпэд. даведнік / Мастак І.Круглова. – Менск: БелЭн, 1998. – 288 с.: іл. – Наклад 5000 ас. ISBN 985-11-0127-3

Люкевіч У. Fair Play: тэорыя і практыка. Берасьце: Выдавецтва С.Лаўрова, 1998. – 188 с. ISBN 985-6371-12-0

Марціновіч А. Сьвятло чароўнага ліхтарыка: Выбраныя старонкі гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры: Дапаможнік для пэдагогаў дашкольных установаў: У 2 кн. Кн. II. – Менск: Народная асьвета, 1998. – 256 с. – Наклад 7000 ас. ISBN 985-03-0621-1

Пашкоў Г. Палескія вандроўкі: Лірычна-дакумэнтальны дзёньнік. – Менск: Полымя, 1998. – 208 с.: іл. – Наклад 3000 ас. ISBN 985-07-0248-6

Радзіны: Абрадавыя песьні / Уклад. і сыстэм. тэкстаў Г.Пятроўскай, апісаньне абрадаў Т.Кухаронак; уступны артыкул і камэнтары Г.Пятроўскай, Г.Таўлай, Т.Кухаронак; Рэдкал.: А.Фядосік і інш. – Менск: Беларуская навука, 1998. – 637 с.: нот. іл. – (Беларуская народная творчасьць) – Наклад 800 ас. ISBN 985-08-0137-9

Сержпутоўскі А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / Прадмова У.Касько; Маст. В.Мішчанка. – Менск: Універсытэцкае, 1998. – 301 с. – Наклад 2500 ас. ISBN 985-09-0220-5

Смольскі Р. Тэатар у прасторы часу: Мастацтвазнаўчыя артыкулы, рэцэнзіі, творчыя партрэты. – Менск: Мастацкая літаратура, 1998. – 255 с. – Наклад 1350 ас. ISBN 985-02-0472-9

Эбэргардт, Пётр. Дэмаграфічная сытуацыя на Беларусі: 1898–1989 / Пер. з польск. Ул.Люкевіча. Берасьце: Belfort, Беларускі Фонд Сораса, 1997. – 282 с. (Адкрытае грамадзтва) ISBN 985-6022-17-7

Сьпеўнік беларускае моладзі

Рыхтуецца да выданьня збор найлепшых беларускіх песень. Патрыятычныя, лірычныя, народныя, бардаўскія – залаты фонд беларускай песьні. 50 песень з нотным тэкстам і акордамі. Укладальнік – Аляксей Фралоў.

Шукаем фінансавай падтрымкі.

Кантактны тэлефон – (017) 213 34 52 (22.00–23.00)

Тэатар пластычнага гратэску «Жэст»
запрашае
24 лютага і 5 сакавіка
на спэктакль
«Reversio»,
які адбудзецца на сцэне Тэатру юнага гледача
Рэжысэр Вячаслаў Іназемцаў
пачатак а 19 гадзіне

Паштовая скрынка

А.С. зь Менску: Проста безапэляцыйным «Гэта добрае, а гэта кепскае» не пераканаеце.

Ігару Р. з Рагачова: Навошта французскі легіён, калі ёсьць беларускі легіён? А вершы зусім сырыя.

Алесю Р. з Талачына: Пры гэтым найперш трэба ў дасканаласьці вывучыць белмову.

Кастусю Т. зь Менску: Апавяданьне недагледжанае. Як сюжэт, так і стыль ды нават арфаграфія. На якой мове напісаная назва і чаму? Перагледзьце сьвежым вокам.

Кірылу зь Менску: Пішыце лацінкай не пра лацінку, а пра зямлю й людзей.

НАВІНКІ!

Касэты 1999 году:
1) N.R.M. Pašpart hramadzianina N.R.M. («Беларуская музычная калекцыя»)
2) N.R.M. Akustyčnyja kancerty kanca XX st. Part 1 («Ковчег»)
3) N.R.M. Akustyčnyja kancerty kanca XX st. Part 2 («Ковчег»)
4) Віктар Шалкевіч. Баляды і рамансы

Касэты можна замовіць праз пошту. Каб атрымаць касэту, трэба 220.000 руб. плюс 15.000 руб. за паштовую перасылку пералічыць на наступны рахунак:
БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» Менск, код 987
Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» ўказаць назву касэты і Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсць, тэлефон.
Зьвяртацца праз пошту: а/с 71 Менск 220123



«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050 Менск а/с 537. Tel/fax (017) 227-78-92 E-mail: niva@user.unibel.by http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. Наклад 2785. 8 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 18[00], 7.02.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспект Францішка Скарыны, 79. Замова №583

Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня N 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12